Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

**Ю. А. Пераверзева**

# ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2009

УДК [025.11:338.476.6] (075.8)
ББК 65.497.8я73
П 26

**Рэцэнзенты**

***А.Л.Белая,*** намеснік дырэктара Навукова-педагагічнай бібліятэкі ўстановы адукацыі “Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь”;

***Н.А.Ляйко,*** кандыдат гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

***С.А.Паўлава,*** кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

**Рэкамендаваны да выдання** прэзідыумам навукова-метадычнага савета Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў і навукова-метадычным саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў.

**Пераверзева, Ю.А.**
П 26 Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэб.-метад. дапам. / Ю.А.Пераверзева. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 114 с.

ISBN 985-6798-45-0.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбна-метадычны дапаможнік адпавядае праграме курса “Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк”. Яго мэта – даць цэласнае ўяўленне аб сутнасці фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк і іх функцыянаванні як гаспадарчых суб’ектаў. Разгледжаны структура, змест і сутнасць бібліятэчных мікраэканамічных працэсаў, эканамічная эфектыўнасць вытворчасці інфармацыйных прадуктаў і паслуг, эвалюцыя формаў гаспадарчай дзейнасці. Значная ўвага надаецца асновам фінансавай дзейнасці бібліятэк.

Для студэнтаў дзённай і завочнай формаў навучання, выкладчыкаў, бібліятэкараў-практыкаў.

ББК 65.497.8я73

ISBN 985-6798-45-0
© Ю.А.Пераверзева, 2009 г.

# ЗМЕСТ

**Прадмова** ........................................................................ 4

**Раздзел I. Эканоміка бібліятэчнай дзейнасці**

Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры ........................................................... 6
Эканамічная прастора бібліятэкі ...................................... 12
Бібліятэчная мікраэканоміка ............................................ 21
Гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў .................. 32
Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе ........................................................................ 40
Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк ........................................................... 47
Эканамічныя метады кіравання бібліятэкай ..................... 53

**Раздзел II. Фінансаванне бібліятэчных устаноў**

Асновы фінансавай дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных устаноў ................................................................ 59
Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк ................. 64
Адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі .................... 70
Фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы ......... 78
Платныя паслугі ў сістэме фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк ........................................................... 85

**Літаратура** ........................................................................ 93

**Дадаткі**

Дадатак 1. Планы семінарскіх заняткаў ........................... 98
Дадатак 2. Практычныя заняткі ...................................... 100
Дадатак 3. Самастойная работа студэнтаў ....................... 106
Дадатак 4. Тэставыя пытанні для выбарнага кантролю ведаў ................................................................................ 111

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАДМОВА

Вучэбная дысцыпліна “Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк” забяспечвае прафесійную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у галіне бібліятэчнай эканомікі, фінансавага менеджменту, эканамічнага аналізу, арганізацыі бібліятэчнай вытворчасці.

Мэта курса – даць цэласнае ўяўленне аб сутнасці фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк і іх функцыянаванні як гаспадарчых суб’ектаў.

У вучэбна-метадычным дапаможніку ўлічаны інтэграцыйныя сувязі бібліятэчнай эканамічнай навукі з агульным бібліятэказнаўствам, бібліятэчным менеджментам і маркетынгам, бібліятэчным тэхналагічным менеджментам, абслугоўваннем карыстальнікаў бібліятэк і іншымі дысцыплінамі. Пры падрыхтоўцы вучэбна-метадычнага дапаможніка выкарыстаны навуковыя працы, вучэбныя і практычныя крыніцы, электронныя рэсурсы, артыкулы, апублікаваныя ў прафесійным друку.

Канцэпцыя дапаможніка пабудавана з улікам навуковапрактычных распрацовак айчынных спецыялістаў (В.Сабалеўскай, А.Далгаполавай, С.Паўлавай, Л.Ракавецкай) і замежных бібліятэказнаўцаў (В.Клюева, А.Ястрабавай, Я.Феняловава, В.Качалінай, Л.Кажэўнікавай, Ю.Гаршкова, С.Калегаевай, І.Суславай, М.Мёрфі, Р.Савалайнена), якія працуюць у пэўных кірунках эканомікі бібліятэчнай справы.

У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты набываюць веды па тэрміналогіі бібліятэчнай эканамічнай навукі і практыкі, эканамічнай тэорыі дзяржаўнага кіравання бібліятэчнай справай, структуры эканамічнай прасторы бібліятэкі, асаблівасцях фінансавання бібліятэк. Яны павінны ўмець разлічваць кошт платных бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, фонд працоўнага часу бібліятэкі; выкарыстоўваць мадэлі гаспадарчай дзейнасці і вызначаць паказчыкі эфектыўнасці гаспадарання; прымяняць на практыцы спосабы матывацыі, формы матэрыяльнага і маральнага стымулявання; выкарыстоўваць эканамічныя метады кіравання бібліятэчнай установай.

Вучэбна-метадычны дапаможнік “Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк” разлічаны на выкарыстанне студэнтамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры вывучэнні дысцыпліны на ўсіх этапах яе выкладання. Ён садзейнічае засваенню тэматыкі курса, падрыхтоўцы да семінарскіх і практычных заняткаў, выкананню самастойнай работы. Метадычныя матэрыялы, прадстаўленыя ў выданні, могуць быць карыснымі пры выкананні курсавых і дыпломных работ у межах праблематыкі дысцыпліны. Студэнты маюць магчымасць праверкі ведаў па засваенні курса з дапамогай тэставых пытанняў. Засваенню лекцыйнага матэрыялу спрыяюць і кантрольныя пытанні і заданні, а таксама рэкамендуемая літаратура да кожнай тэмы.

Вучэбна-метадычны дапаможнік утрымлівае метадычныя парады да семінарскіх і практычных заняткаў, якія маюць вялікае значэнне для вывучэння дысцыпліны. Самастойная работа прызначана для замацавання найбольш складаных і працаёмкіх пытанняў курса. Па некаторых тэмах прадугледжана падрыхтоўка інфармацыйных паведамленняў, рэфератаў і слоўнікаў, іншыя тэмы вывучаюцца з выкарыстаннем графічных матэрыялаў і алгарытмаў. Выкананне заданняў, вылучаных для самастойнага вывучэння, садзейнічае засваенню лекцыйнага матэрыялу.

Прапануемы вучэбна-метадычны дапаможнік будзе карысны студэнтам і выкладчыкам не толькі пры засваенні матэрыялу курса “Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк”, але і пры вывучэнні дысцыплін фінансава-эканамічнага профілю. Ён можа быць выкарыстаны бібліятэкарамі-практыкамі ў мэтах знаёмства з праблемамі сацыяльна-эканамічнага развіцця бібліятэчных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел I
# ЭКАНОМІКА БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры

Эканоміка культуры – прыкладная навука, якая тлумачыць прынцыпы і інструменты эканамічных адносін у сферы культурнай дзейнасці [4]. Яна з'яўляецца падгалінай грамадскага сектара эканомікі і садзейнічае вытворчасці культурных прадуктаў і паслуг. Да ліку апошніх адносяцца музычныя інструменты, аўдыё-, відэатэхніка, тэлебачанне, радыё, кіно, выдавецкая справа, прадукты і паслугі бібліятэчнай вытворчасці. Змест і характар культурных прадуктаў і іх уздзеянне на карыстальнікаў залежаць ад прыбытку, які атрымоўваюць вытворцы, і ад канкурэнцыі паміж арганізацыямі-вытворцамі. Развіццё рынку культурных прадуктаў і паслуг у пэўнай ступені закранае сферу сацыяльна-культурнага комплексу, асабліва бібліятэчнай справы, і прадугледжвае актыўны ўдзел у іх вытворчасці дзяржаўных органаў кіравання.

Вытворчасць культурных, у тым ліку бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, рэгулюецца прамымі і апасродкаванымі інструментамі культурнай палітыкі. Прамымі эканамічнымі інструментамі з'яўляюцца субсідыі і датацыі. У выпадку субсідый грашовыя сродкі вытворца культурных прадуктаў і паслуг атрымоўвае напрамую ад уласніка. Датацыі даюць магчымасць памяншэння кошту на культурныя прадукты і паслугі. У гэтым сэнсе кіраўнікам бібліятэчнай справы ўласціва функцыя аналітычнай апрацоўкі і выбару рашэнняў па эканамічных аспектах культурнай палітыкі ў галіне. Асаблівая ўвага надаецца падатковым умовам развіцця галіны. Магчыма даванне арганізацыям культуры льготных крэдытаў ці з нізкай працэнтнай стаўкай. У залежнасці ад развіцця грамадскага сектара эканомікі і сацыяльнай структуры вылучаюцца рынкавы, бюджэтны і змешаны тыпы фінансавання культуры [3].

Рынкавая сістэма фінансавання арыентавана на задавальненне індывідуальных культурных запатрабаванняў. Бюджэтная скіравана на задавальненне сацыяльных культурных патрэб і падтрымкі сацыяльна не абароненых колаў насельніц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тва. Бюджэтнае фінансаванне здзяйсняецца цэнтралізавана і прадугледжвае кантроль за дзейнасцю культурных інстытутаў. Як зазначаюць спецыялісты, бюджэтны тып фінансавання больш прывабны для арганізацый культуры, якія адлюстроўваюць нацыянальны інтарэс. Гэта, напрыклад, нацыянальная бібліятэка, нацыянальны музей. Такі падыход грунтуецца на прыродзе іх функцый, якія вызначаюцца гісторыка-культурнай місіяй гэтых устаноў. Так, Нацыянальная бібліятэка Беларусі на працягу ўсёй гісторыі свайго існавання імкнулася сабраць і захаваць нацыянальную памяць свайго народа, зафіксаваную ў рукапісных і друкаваных помніках кніжнай культуры [6]. Разам з тым некаторыя віды культурнай дзейнасці, напрыклад такія, як выдавецкая справа, кінаіндустрыя, па сваёй прыродзе арыентаваны на рынак і могуць задаволіць разнастайныя культурныя інтарэсы. Таму рынкавы тып фінансавання для іх больш адапціраваны і адпаведны. Ён дэцэнтралізаваны і садзейнічае атрыманню эканамічнага прыбытку ад рэалізацыі культурных прадуктаў і паслуг.

Змешаны тып фінансавання ўтрымлівае рысы бюджэтнага і рынкавага і выяўляецца ў падтрымцы бюджэтных напрамкаў дзейнасці метадамі праграмнага фінансавання, спонсарскай дапамогай і сістэмай грантаў.

У залежнасці ад адносін да рынку даследчыкі вылучаюць даходныя і недаходныя віды культурнай дзейнасці [3]. Першыя адпавядаюць рынкавым умовам і большую частку даходаў атрымоўваюць ад продажу ўласнай прадукцыі. Другія – не маюць рынкавай арыентацыі і прадаюць сваю прадукцыю па цане, як правіла, ніжэй рынкавай.

Спроба вызначэння месца эканомікі культуры ў народнагаспадарчым узнаўленчым працэсе была зроблена ў 1970-я гг. XX ст. супрацоўнікамі кафедры палітэканоміі Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры (МДІК). З цягам часу падыходы да комплекснай эканамічнай ацэнкі сферы культуры сталі вызначацца з пункту гледжання цэнаўтварэння, рынкавага кошту, дынамікі попыту і спажывання, рэгулявання працэсамі вытворчасці культурных прадуктаў і паслуг.

Бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі адносяцца да катэгорыі культурных і прадаюцца таксама як тавар па вызначанай цане. Яны з’яўляюцца прадуктамі інтэлектуальнай вытворчасці і зафіксаваны на матэрыяльным носьбіце. Ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласцівы якасці навізны, унікальнасці і магчымасць тыражавання. Дыяпазон бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг шырокі – ад адпачынкавых і сервісных да методыка-кансультацыйных. Для іх вытворчасці вельмі важныя творчыя здольнасці, прафесійныя веды, уменні і навыкі бібліятэчных спецыялістаў. Яны аказваюць непасрэдны ўплыў на карыстальніка і могуць назапашвацца ў розных формах духоўнага багацця. Эканамічны эфект ад вытворчасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг адлюстроўваецца ў атрыманні пазабюджэтных фінансавых сродкаў, грашовых надбаўках выканаўцам, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы, папаўненні ў бібліятэках фондаў сацыяльнага і творчага развіцця і г.д.

У бібліятэчнай справе ацэнка эканамічнай дзейнасці бібліятэк здзяйсняецца па канчатковых выніках, але такі падыход на сучасным этапе з’яўляецца дыскусійным. Напрыклад, Ю.Гаршкоў прапануе ў якасці вымяральніка эканамічнай дзейнасці бібліятэк выкарыстоўваць колькасць чытачоў, кнігавыдач, аб’ём фонду. Замежныя даследчыкі называюць забеспячэнне карыстальнікаў інфармацыяй. У абодвух выпадках ідзе размова аб выніках інфармацыйна-вытворчай дзейнасці, выкарыстанні гаспадарчых механізмаў функцыянавання бібліятэчных устаноў. Гэта акцэнтуе ўвагу на эканамічных аспектах арганізацыі бібліятэчнага вытворчага працэсу і кіравання бібліятэкамі.

Эканоміка бібліятэчнай справы – галіна дзейнасці, прадметам яе з’яўляюцца вытворчыя адносіны ў сферы бібліятэчнай справы, што ўзнікаюць у працэсе вытворчасці, размеркавання, абмену і выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў, якія выступаюць у форме прадуктаў і паслуг. Першым у 1920-я гг. XX ст. пытанні эканомікі бібліятэчнай справы пачаў распрацоўваць выкладчык кафедры бібліятэказнаўства Берлінскага універсітэта Адольф фон Хармак. У Расіі вынікі падобнага даследавання прагучалі ў дакладзе М.Здобнава “Эканоміка кнігі як адна з дысцыплін кнігазнаўства”, прачытаным у 1923 г. на пасяджэнні Рускага бібліяграфічнага таварыства. У 1970–80-я гг. пытанні палітэканоміі бібліятэчнай справы распрацоўваліся ў МДІК пад кіраўніцтвам І.Пунанава. На сучасным этапе Н.Магілевер, Л.Кулікова вывучаюць агульныя пытанні эканомікі бібліятэчнай справы. С.Новікаў даследуе адносіны паміж работнікамі бібліятэкі і дзяржавай, паміж бібліятэч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным калектывам і асобным супрацоўнікам. Я.Фенялонавым распрацаваны метадалагічныя асновы эканомікі бібліятэчнай справы. Бібліятэчная мікраэканоміка, фінансаванне і юрыдычная база эканамічнай дзейнасці бібліятэк вывучаюцца В.Клюевым. Л.Кажэўнікава, Н.Несцяровіч, С.Калегаева распрацоўваюць асновы бібліятэчнага вытворчага працэсу, рэгіянальныя аспекты фінансава-эканамічнага функцыянавання бібліятэк, рэсурсны патэнцыял універсальных навуковых і публічных бібліятэк. Сучасныя праблемы бібліятэчнай статыстыкі вывучаюцца Р.Матульскім, І.Суславай, А.Віслым.

Адсутнічае адзіны пункт гледжання на прадмет бібліятэчнай эканомікі. Бібліятэказнаўцы ў якасці прадмета разглядаюць эканамічныя адносіны, бібліятэчныя прадукты і паслугі, попыт на прадукцыю бібліятэчнай вытворчасці, інфармацыйныя рэсурсы, вынікі бібліятэчнай дзейнасці. Аб’ектам вывучэння бібліятэчнай эканомікі з’яўляюцца не толькі яе рэсурсная складаючая (фінансы, матэрыяльная база, фонд дакументаў, кадры), але і прадукцыя, якая выпрацоўваецца на яе аснове, а таксама функцыянальныя і іншыя арганізацыйныя структуры, тэхналогія вытворчасці, механізмы гаспадарання, нарматыўная база [2; 8; 11]. Такім чынам, аб’ект бібліятэчнай эканомікі можна тлумачыць як поўную сістэму элементаў, што ўплываюць на эканамічныя адносіны і канчатковыя вынікі дзейнасці ці эканоміку бібліятэкі.

Эканоміка бібліятэкі – сістэма эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы, якія ўзнікаюць па прычыне вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання бібліятэчнай прадукцыі і паслуг, а таксама сукупнасць сродкаў, аб’ектаў і працэсаў, што выкарыстоўваюцца ў бібліятэцы з мэтай забеспячэння матэрыяльных умоў стварэння бібліятэчных прадуктаў і паслуг.

Бібліятэчная эканамічная навука дазваляе выбіраць эфектыўныя сродкі працы, тэхналогіі, матэрыялы і арганізоўваць іх аптымальнае выкарыстанне. Таму мэтамі бібліятэчнай эканомікі з’яўляюцца фіксацыя і выяўленне заканамернасцей развіцця эканамічных адносін у бібліятэчнай справе; мадэляванне стану бібліятэчных сістэм і забеспячэнне інструментарыем кіравання эканамічнымі працэсамі; вызначэнне мінімальнага аб’ёму і складу рэсурсаў, іх рацыянальнага выкарыстання для развіцця зоны бібліятэчнага абслугоўвання [8; 10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эканамічныя адносіны ў бібліятэчнай сферы развіваюцца на мікра- і макраўзроўнях. Фінансава-эканамічная дзейнасць рэгулюецца адпаведнымі агульнадзяржаўнымі, галіновымі і лакальнымі нарматыўнымі актамі, якія вызначаюць парадак фінансавання бібліятэчных устаноў, іх утрыманне, умовы сацыяльна-эканамічнай падтрымкі бібліятэчнага персаналу і іншыя профільныя пытанні. Гэтыя кірункі разам з практычнай накіраванасцю гаспадарчай дзейнасці бібліятэк па фарміраванні інфармацыйнага рынку маюць канцэптуальнае адлюстраванне. У канцэпцыі эканомікі бібліятэчнай справы паказаны суб'ектыўныя эканамічныя адносіны, спецыфіка праяўлення агульнаэканамічных законаў, сістэма размяркоўваемых адносін [7].

Зместам эканамічнай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца стварэнне сацыяльна-эканамічных умоў для выяўлення, рэалізацыі і спалучэння інтарэсаў як бібліятэчнай грамадскасці, так і розных катэгорый рэальных і патэнцыяльных спажыўцоў бібліятэчных паслуг. Сродкамі рэалізацыі асноўных напрамкаў бібліятэчнай эканамічнай дзейнасці, на думку Л.Кажэўнікавай, з'яўляюцца яе арганізацыйныя формы, якія аб'яднаны макраструктурай бібліятэкі на аснове тэхналагічнага базісу.

Метадалогія эканамічнай дзейнасці бібліятэк грунтуецца на інструментарыі эканамічнай тэорыі, што ўключае эканамічныя законы, катэгорыі і метады вывучэння эканамічнай дзейнасці, і на палажэннях практычнай эканомікі, якія ўключаюць методыкі цэнаўтварэння, эканамічнага аналізу, коштавых разлікаў, мадэлявання арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці бібліятэк.

Важкая роля адводзіцца фарміраванню тэрмінасістэмы ў галіне бібліятэчнай эканомікі. Базавым паняццем з'яўляецца "эканамічная эфектыўнасць", якую разумеюць "як суадносіны затрат і атрыманых вынікаў, здольнасць задаволіць патрэбы з найменшымі затратамі сіл і сродкаў грамадства" [10, с. 225]. Тэрмін "эканамічны аналіз" адлюстроўвае комплекс сродкаў, якія выкарыстоўваюцца эканамічнай навукай для вывучэння пэўнага аб'екта. Але ён таксама выкарыстоўваецца ў вузкім, прыкладным значэнні – як адна з функцый кіравання, што забяспечвае маніторынг эканамічных працэсаў і прыняцце рашэнняў аб далейшым сацыяльна-эканамічным функцыянаванні аб'екта вывучэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У тэрміналагічную сістэму бібліятэчнай эканомікі ўваходзяць шэраг паняццяў. Сярод іх “эканамічны паказчык”, “бібліятэчны эканамічны патэнцыял”, “вынік бібліятэчнай працы”, “бібліятэчная вытворчасць”, “кошт асноўных фондаў”, “сабекошт”, “рэнтабельнасць” і шмат інш. Змест гэтых катэгорый пададзены ў прафесійным друку ў работах Я.Феняловава, Н.Магілевер, Л.Качалінай, Н.Бубекінай [2; 6; 7], а таксама ў галіновых даведачных выданнях [1; 9].

Такім чынам, найбольш даследаванымі напрамкамі бібліятэчнай эканамічнай дзейнасці з’яўляюцца агульныя праблемы фарміравання сукупных бібліятэчных рэсурсаў, іх роля ў структуры грамадскай вытворчасці пэўных тэрыторый, стварэнне і спажыванне бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў. Разам з тым існуюць розныя пункты гледжання на аб’ект і прадмет бібліятэчнай эканомікі, яе мэты і змест. Недакладна вылучана месца бібліятэчнай эканомікі ў структуры эканомікі культуры. У стане фарміравання знаходзіцца тэрмінасістэма галіны, удакладняюцца палажэнні канцэпцыі эканомікі бібліятэчнай справы. Эканамічнае развіццё бібліятэчных устаноў знаходзіцца пад уплывам фактараў дзяржаўнай культурнай палітыкі і ўнутраных арганізацыйных структур бібліятэчнай вытворчасці.

### *Пытанні і заданні*

1. Назавіце базавыя паняцці бібліятэчнай эканомікі. У чым іх сутнасць?
2. Складзіце структурна-лагічную схему кампанентаў эканомікі бібліятэчнай справы як навуковай дысцыпліны.
3. Вызначце праблемы галіновай эканамічнай навукі, карыстаючыся літаратурай [5; 11].
4. Дайце азначэнне комплексу паняццяў матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк [1; 8].

### *Літаратура*

*1. Библиотечное* дело: терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – 168 с.

*2. Бубекина, Н.В.* Экономические аспекты деятельности библиотек на современном этапе: метод. пособие / Н.В.Бубекина. – М.: Либерея, 1999. – С. 33 – 37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Горшков, Ю.А.* Экономика культуры и библиотечно-информационной деятельности / Ю.А.Горшков // Библиотека в эпоху перемен: филос.-культуролог. и инф. Аспекты: информ. сб. (Дайджест). – Вып. 4 (20). – М.: Рос. гос. б-ка, 2004. – С. 72 – 105.

*4. Драгичевич-Шешич, М.* Экономика культуры / М.Драгичевич-Шешич // Art менеджер. – 2002. – № 1. – С. 3 – 6.

*5. Качалина, В.В.* Экономические проблемы деятельности библиотек России и других стран СНГ / В.В.Качалина // Библиотечное дело – XXI век. – 2005. – № 2 (10). – С. 41 – 63.

*6. Кірухіна, Л.Г.* Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л.Г.Кірухіна; Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2005. – С. 4 – 35.

*7. Кожевникова, Л.А.* Экономика библиотечной деятельности: проблемы организации и методика изучения / Л.А.Кожевникова // Библиотечное дело – XXI век. – 2004. – № 1 (17). – С. 15 – 20.

*8. Куштанина, Л.И.* Экономические проблемы деятельности библиотек: терминосистема, показатели, эффективность / Л.И.Куштанина // Библиотечное дело – XXI век. – 2005. – № 2 (10). – С. 67 – 84.

*9. Терминологический* словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знаний / РАН. Библиотека по естественным наукам. – М., 1997. – 268 с.

*10. Фенелонов, Е.А.* К вопросу о методологических основах экономики библиотечного дела как научной дисциплины / Е.А.Фенелонов // Проблемы библиотечного строительства: сб. избр. работ. – М.: Пашков дом, 2005. – С. 219 – 228.

*11. Фенелонов, Е.А.* Методологические основы экономики библиотечного дела как научной дисциплины / Е.А.Фенелонов // Библиотечное дело – XXI век. – 2004. – № 1 (17). – С. 6 – 15.

## Эканамічная прастора бібліятэкі

Эканамічная прастора ўяўляе сабой інфармацыйна – рэсурсны патэнцыял пэўных бібліятэк і бібліятэчных сетак як цэласнай сістэмы вытворчых і сацыяльна-культурных відаў дзейнасці. Бібліятэкам належыць вядучая роля ў фарміраван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ні каштоўнасных арыентацый, задавальненні шырокага кола інфармацыйных патрэб карыстальнікаў, абумоўленых іх прафесійнай і культурнай дзейнасцю.

Даследаванне эканамічнай прасторы бібліятэкі здзяйсняецца ў сацыяльна-эканамічным, культурным, геаграфічным, статыстычным аспектах. Навукоўцамі вылучана залежнасць дынамікі асноўных паказчыкаў бібліятэчнай работы, якія характарызуюць эканамічны патэнцыял бібліятэк, ад паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага стану тэрыторыі. Гэта рэйтынг эканамічнага развіцця, колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва, узровень беспрацоўя, дэмаграфічнае становішча і інш. [1; 4].

Фарміраванне знешняй і ўнутранай прасторы бібліятэкі адбываецца пад уздзеяннем эканамічных і сацыякультурных пераўтварэнняў у краіне і ў пэўным рэгіёне. Працэс развіцця эканамічнай прасторы таксама вызначаецца рэсурсамі бібліятэкі, аб’ёмам рэалізуемых прадуктаў і паслуг бібліятэчнай вытворчасці, развіццём камунікацыйных сетак, узроўнем аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў і аперацый, укараненнем новых інфармацыйных тэхналогій, мадэрнізацыяй і ўмацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы, менталітэтам і прафесійнай кампетэнтнасцю бібліятэчных спецыялістаў, функцыянаваннем сістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, арганізацыяй абслугоўвання ў адпаведнасці з функцыямі бібліятэкі і патрэбамі карыстальнікаў, магчымасцю фарміравання фонду дакументаў на розных носьбітах і давання інфармацыі аб яго складзе.

Знешняя эканамічная прастора дзейнасці бібліятэк разглядаецца ў кантэксце дзяржаўнага развіцця бібліятэчнай справы рэспублікі. Так, бібліятэчная сістэма Рэспублікі Беларусь уключае каля 10 тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк з сукупным аб’ёмам фонду каля 250 млн. экзэмпляраў. Самай буйной з’яўляецца бібліятэчная сетка сістэмы Міністэрства культуры – 4215 бібліятэк. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк налічвае 469, Міністэрства аховы здароўя – 180, прафсаюзных – 240, школьных – 3840, воінскіх часцей – 98, аграпрамысловага комплексу – 80, вышэйшых навучальных устаноў – 57, царкоўных – 342 бібліятэкі. У сельскай мясцовасці працуюць 226 бібліятэк-клубаў, 117 клубаў-бібліятэк, 4 бібліятэкі-музеі. Практыкуецца аб’яднанне сельскіх бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

са школьнымі [7]. Такім чынам, бібліятэчная сістэма краіны з'яўляецца даволі буйной падгалінай грамадскага сектара эканомікі і забяспечвае свабодны доступ да інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку ўласнай вытворчасці. Разам з тым нельга не адзначыць штогадовае скарачэнне колькасці дзяржаўных публічных бібліятэк, іх чытачоў і аб'ёмаў кніжных фондаў. Напрыклад, колькасць чытачоў публічных бібліятэк Мінскай вобласці ў 2001 г. складала 662 тысячы чалавек, у 2004 г. гэты паказчык скараціўся да 616 тысяч, а ў 2005 г. ён склаў 606 тысяч чалавек. Прыкладна такая ж сітуацыя назіраецца па ўсіх рэгіёнах Беларусі [6].

Адзначаныя ўмовы функцыянавання бібліятэк уплываюць на развіццё эканамічнага патэнцыялу бібліятэчнай вытворчасці. На ўзроўні эканомікі бібліятэчнай справы павінны вывучацца пытанні дынамікі сацыяльных і эканамічных рэформаў пэўных тэрытарыяльных адзінак, велічыні выдаткаў тэрытарыяльных бюджэтаў на ўтрыманне бібліятэк, развіцця грамадскага сектара эканомікі, прыцягнення інвестыцый, вядзення кансалідаванага бюджэту на культуру, аналізу статыстычных паказчыкаў па галіне, спецыфікі фінансавання бібліятэк розных тыпаў, вызначэння месца і ролі бібліятэк у адраджэнні вёскі і малых населеных пунктаў, фарміраванні інфраструктуры аграгарадкоў.

Знешняя эканамічная прастора бібліятэчнай дзейнасці набывае рэгіянальныя рысы, бо менавіта рэгіянальнае звяно бібліятэчна-інфармацыйнай інфраструктуры забяспечвае фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёну для ўсіх яго жыхароў незалежна ад нацыянальнасці і прыналежнасці да пэўнай этнічнай групы і арганізуе доступ да нацыянальных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў. Развіццю эканамічнага і сацыякультурнага патэнцыялу тэрыторый садзейнічае Канцэпцыя рэгіянальнага інфармацыйнага цэнтра на базе абласных бібліятэк, важнейшай задачай якой з'яўляецца вызначэнне фінансава-эканамічных асноў дзейнасці абласных бібліятэк і іх кадравага забеспячэння.

Ва ўмовах спецыфікі сацыякультурнага асяроддзя, якое айчыннымі даследчыкамі характарызуецца з пункту гледжання змяншэння колькасці насельніцтва, высокай жыццядзейнасці малых гарадоў, высокага ўзроўню адукаванасці грамадства і г.д. [1], вядучым кампанентам развіцця знешняй экана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мічнай прасторы бібліятэкі з’яўляецца бібліятэчная сітуацыя. Яна ўяўляе сабой сацыякультурную прастору, якая мае складаную ўнутраную структуру і ўзаемадзейнічае з характарыстыкамі эканамічнай прасторы тэрыторыі [4]. Вылучаюцца вертыкальныя і гарызантальныя сувязі бібліятэчных сітуацый. Па вертыкалі яе ўзаемадзеянне з інстытутамі грамадства абумоўліваецца эканамічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі, палітычнымі, культурнымі фактарамі. Гарызантальныя сувязі бібліятэчнай сітуацыі ўстанаўліваюцца паміж роўнымі па статусе кампанентамі бібліятэчнага асяроддзя (прафсаюзнымі і грамадскімі аб’яднаннямі, структурнымі адзінкамі, якія ўдзельнічаюць у вытворчым бібліятэчным працэсе). У якасці аб’ектаў таварна-грашовых адносін разглядаюцца інфармацыйныя рэсурсы і патрэбы, метаінфармацыйны прадукт, інфармацыйна-аналітычная дзейнасць.

На думку Л.Кажэўнікавай, бібліятэчная сітуацыя вызначаецца асаблівасцямі і структурай інфармацыйна-бібліятэчнага асяроддзя. Апошняе ўтрымлівае:

– арганізацыі, якія ствараюць сумесныя прадукты і паслугі;

– бібліятэкі, органы навукова-тэхнічнай інфармацыі, кнігагандлёвыя прадпрыемствы;

– сукупныя бібліятэчна-інфармацыйныя рэсурсы, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні контураў развіцця тэрытарыяльных эканамічных сістэм;

– адзіны размеркаваны даведачна-пошукавы апарат к фондам бібліятэк тэрыторыі, створаны на аснове карпаратыўнай каталагізацыі;

– сістэму тэлекамунікацыйнага доступу да аддаленых бібліятэчных рэсурсаў;

– звесткі аб развіцці рынку бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг [4].

Такім чынам, характарыстыкі знешняй эканамічнай прасторы дзейнасці бібліятэк абумоўлены рэструктурызацыяй эканомікі пэўнага рэгіёну, спецыфікай сацыякультурных працэсаў. Гэтыя асаблівасці ўплываюць на спажыванне прадуктаў і паслуг бібліятэчнай вытворчасці, структуру інфармацыйна-бібліятэчнага асяроддзя і параметры бібліятэчнай сітуацыі, узаемадзеянне і адаптыўнасць бібліятэк да дынамікі знешнеэканамічных тэрытарыяльных пераўтварэнняў. Тым больш, што дзейнасць бібліятэчных сістэм у межах пэўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрытарыяльных адзінак адрозніваецца па культурных, інфармацыйных, эканамічных кампанентах. Вытворчы працэс пэўнай тэрыторыі таксама вызначае прапорцыі размеркавання рэсурсаў, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні эканамічнага патэнцыялу бібліятэчнай дзейнасці.

Эканамічны патэнцыял бібліятэкі вызначае асноўныя функцыі ўнутранага эканамічнага асяроддзя – функцыянальную, тэхналагічную, кіраўнічую [4]. Гэтыя функцыі абумоўліваюць унутраную бібліятэчную прастору, пабудаваную па прынцыпе сегментавання. Гэта значыць, што амаль кожны функцыянальны кірунак дзейнасці, структурная адзінка маюць уласную ўнутраную эканамічную прастору і эканамічны патэнцыял. Відавочна і ўзаемазалежнасць унутранай эканамічнай прасторы ад фактараў знешняга асяроддзя. Так, напрыклад, сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў сельскай мясцовасці паўплывалі на працэсы адаптацыі бібліятэк да новых умоў, але і з’явіліся якасна новыя патрабаванні да арганізацыі інфармацыйнай, культурна-забаўляльнай дзейнасці насельніцтва сродкамі бібліятэчнай работы. На рэспубліканскім узроўні рэалізуецца Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг., якой прадугледжаны крокі па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк аграгарадкоў (камп’ютэрызацыя, набыццё бібліёбусаў) [7]. Вынікі рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання “Інфармацыйныя патрэбы насельніцтва аграгарадкоў” сведчаць аб неабходнасці стварэння мадэлі бібліятэкі аграгарадка і навуковага абгрунтавання выдаткоўвання дзяржаўных сродкаў на ўтрыманне і развіццё бібліятэк гэтага віду [5].

Структуру ўнутранай эканамічнай прасторы ствараюць фінансавыя сродкі бібліятэк, матэрыяльна-тэхнічная база, дакументныя і электронныя рэсурсы. У бібліятэках характэрна асваенне бюджэтных і пазабюджэтных фінансавых сродкаў. Бюджэтныя сродкі бібліятэк з’яўляюцца стабільным фінансавым рэсурсам (прыкладна 0,5% валавага ўнутранага прадукту) і выдаткоўваюцца згодна дзеючаму заканадаўству. Рэалізацыя звышнарматыўных бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг і іншыя нерэалізацыйныя паступленні фарміруюць пэўную частку пазабюджэтных сродкаў. Іх эфектыўнасць як крыніц фінансавання і магчымасць атрымання прыбытку залежаць ад прыярытэтаў карыстальнікаў у выбары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных рэсурсаў, перападрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў для іх вытворчасці і працы ў рынкавых умовах, мэтавага характару прыцягнення фінансавай дапамогі, структуры расходаў і даходаў.

Фінансавая складаючая ўнутранай эканамічнай прасторы бібліятэкі залежыць не толькі ад аб'ёму фінансавых рэсурсаў, але і ад магчымасці іх камбінавання ў залежнасці ад сітуацыі. Інфармацыя аб усіх відах рэсурсаў прысутнічае ў нарматыўнай, фінансавай і тэхналагічнай дакументацыі бібліятэк. Сукупнасць гэтых дакументаў складае стандарт дзейнасці бібліятэкі. Не парушаючы гэтага стандарта, на думку Л.Кажэўнікавай, і магчыма камбінаванне асобных кампанентаў бібліятэчнай вытворчасці [4]. У выніку дасягаецца баланс паміж рэсурсамі, расходамі і даходамі пры стварэнні і рэалізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага прадукту.

Рэсурсамі для ўмацавання і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы таксама з'яўляюцца бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі, якія размяркоўваюцца згодна каштарысу. Асноўны аб'ём выдаткаў прыпадае на капітальны рамонт, рэстаўрацыю бібліятэчных будынкаў, падтрыманне ў належным стане камунальных сістэм.

Спецыфіку ўнутранай бібліятэчнай сітуацыі фарміруюць фактары, якія аказваюць уплыў на забеспячэнне бібліятэчных устаноў дакументнымі і электроннымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Іх збалансаванасць па аб'ёме і асартыменце дазваляе прывесці ў адпаведнасць тэхналогію і мэты бібліятэчнай вытворчасці з якасцю і памерамі бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

Працэсы камплектавання фондаў бібліятэк залежаць ад аб'ёму фінансавання, структуры і зместу сукупных інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў, доступу чытачоў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк іншых сістэм і ведамстваў. Разам з тым дакументныя рэсурсы павінны фарміравацца зыходзячы з бібліятэчнай сітуацыі пэўнага рэгіёну пры ўліку мясцовых галіновых інтарэсаў грамадскай вытворчасці. Так, Л.Кажэўнікава прапануе ў дзейнасці універсальных навуковых бібліятэк абапірацца на асноўныя грамадскія патрэбы і фарміраваць для іх задавальнення неабходныя рэсурсы [4].

Устанаўленне прыярытэтных напрамкаў фінансавай падтрымкі тых ці іншых відаў бібліятэчных рэсурсаў патрабуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вылучэння іх з сукупнасці дакументных рэсурсаў. Інфармацыйныя рэсурсы (электронныя каталогі, тэматычныя, фактаграфічныя, бібліяграфічныя базы даных, інфармацыйныя прадукты і паслугі, сістэма камунікацый) вызначаюцца тэхналагічным і коштавым укладам у іх вытворчасць. Доля электронных носьбітаў інфармацыі ў структуры фондаў публічных бібліятэк складае 0,5%. У аўтаматызаваным рэжыме працуюць усе буйныя бібліятэкі рэспублікі, а таксама 98% цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк, 76,8% з іх маюць доступ да сеткі Інтэрнет. Сукупны аб’ём электронных каталогаў складае 5,5 млн. запісаў [7].

Эфектыўнасць выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў вызначаецца эканамічнымі і сацыяльнымі крытэрыямі. Першыя выкарыстоўваюцца для ацэнкі ўзроўню вытворчасці пры параўнанні аб’ёмаў працы ў традыцыйным і аўтаматызаваным рэжымах. Разлічваюцца каэфіцыенты выкарыстання і замены бібліятэчнага абсталявання, камп’ютэрнай тэхнікі, а таксама паказчык насычанасці спецыялістамі асобных вытворчых участкаў [3]. Сацыяльныя крытэрыі дазваляюць выявіць занятасць кадраў на традыцыйных і аўтаматызаваных участках вытворчасці, якая ўплывае на атрыманне ў карыстанне і спажыванне інфармацыйных рэсурсаў.

Перспектывы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і выкарыстання матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў эканамісты звязваюць з неабходнасцю пастаяннага павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў і падрыхтоўкай спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Па існуючых звестках у бібліятэках Беларусі працуюць каля 17 тыс. спецыялістаў, у тым ліку звыш 9,5 тысячы ў бібліятэках сістэмы Міністэрства культуры. 72,5% спецыялістаў маюць вышэйшую адукацыю [7]. Сёння навучанне і перападрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў ажыццяўляюцца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў, у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава, Гродзенскім каледжы мастацтваў, Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме імя А.С.Пушкіна.

На інтэнсіўнасць фарміравання і руху працоўных рэсурсаў бібліятэк аказваюць уплыў некаторыя ўмовы, у прыватнасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– дынаміка колькаснага складу персаналу бібліятэк у кантэксце перамены колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва і ўзроўню беспрацоўя ў рэгіёне;

– памеры бібліятэчных сетак розных сістэм і ведамстваў, іх структура і штатная колькасць, расстаноўка працоўных рэсурсаў;

– наяўнасць стабільнага рабочага месца і аплата працы згодна пасадзе і кваліфікацыі;

– магчымасць прыцягнення дадатковых фінансавых рэсурсаў для аплаты працы бібліятэчнага персаналу, у тым ліку за кошт уласнага прыбытку бібліятэк ад камерцыйнай дзейнасці;

– маральнае стымуляванне як аснова развіцця бібліятэчнай вытворчасці і яе эканамічнага росту;

– магчымасць сумяшчэння дзейнасці бібліятэкараў на розных участках бібліятэчнай вытворчасці;

– даступнасць павышэння прафесійнай кваліфікацыі і фарміравання эканамічнай культуры бібліятэчных спецыялістаў.

Дасягненне бібліятэкай высокіх сацыяльна-эканамічных паказчыкаў дзейнасці патрабуе ад бібліятэчнага персаналу валодання масівам эканамічнай інфармацыі і ўменнямі яе аналізаваць. Ад бібліятэкараў патрабуецца:

– ведаць спецыфіку праяўлення асноўных эканамічных законаў у сферы бібліятэчнай дзейнасці, залежнасці тэхналагічнага і сацыяльнага развіцця бібліятэкі ад фактараў знешняга і ўнутранага асяроддзя;

– умець самастойна прымаць рашэнні, размяркоўваць рэсурсы, патрэбныя для вытворчасці бібліятэчна-інфармацыйных паслуг пэўнага віду;

– мець навыкі рашэння прафесійных задач, у тым ліку звязаных з кіраваннем эканамічнымі рэсурсамі бібліятэкі [3].

Бібліятэчны спецыяліст, які выконвае вытворчыя функцыі на пэўным прадметна-спецыялізаваным участку, павінен валодаць эканоміка-прававымі ведамі, ведаць асаблівасці эканамічных метадаў рэгулявання бібліятэчнымі тэхналагічнымі цыкламі і аперацыямі, умець рацыянальна размяшчаць сродкі працы паміж вытворчымі аб’ектамі. У кампетэнцыю кіраўніка ўваходзяць пытанні размеркавання вытворчых функцый, паслядоўнасці і часу іх выканання, кошту матэрыяльна-тэх-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нічнай базы і абсталявання, колькасці працоўных месцаў у падраздзяленнях бібліятэкі.

Такім чынам, знешнія і ўнутраныя эканамічныя рэсурсы бібліятэк маюць грамадскі характар. Іх развіццё залежыць ад сістэмы размеркавання даходаў, якія паступаюць ад матэрыяльнай вытворчасці. Аб'ёмы эканамічнага патэнцыялу фарміруюцца ў залежнасці ад колькасці насельніцтва ў зоне бібліятэчнага абслугоўвання, стабільнасці прамысловай вытворчасці ў рэгіёне, міграцыі працоўных рэсурсаў. Галіновая накіраванасць эканомікі тэрыторыі складае сітуацыю ў бібліятэчным абслугоўванні і патэнцыял бібліятэчнай вытворчасці. Эфектыўнасць знешніх і ўнутраных кампанентаў эканамічнай прасторы бібліятэкі вызначаецца яе эканамічнай структурай, тэхналогіямі, сістэмай кіравання.

### *Пытанні і заданні*

1. Карыстаючыся літаратурай [6; 7], вызначце прыярытэтныя кірункі дзейнасці бібліятэк Беларусі па развіцці іх сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу.
2. Прааналізуйце стан матэрыяльных рэсурсаў бібліятэк Расіі. Вызначце асноўныя знешнеэканамічныя фактары, якія ўплываюць на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк гэтай краіны [2, с. 77–87].
3. Назавіце складаючыя элементы ўнутранай эканамічнай прасторы бібліятэкі.
4. З якімі фактарамі, на ваш погляд, звязаны перспектывы развіцця рынку працы бібліятэчных спецыялістаў?

### *Літаратура*

1. *Аксюцік, М.І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць: вучэб.-метад. дапам. / М.І.Аксюцік. – Мн.: ІСВ, 2003. – С. 35 – 50.
2. *Басамыгина, И.Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И.Н.Басамыгина. – М.: Либерея – Бибинформ, 2006. – С.42 – 54; 77 – 87.
3. *Кожевникова, Л.А.* Экономика библиотечной деятельности: учебник / Л.А.Кожевникова. – Новосибирск, 2001. – С. 18 – 101.
4. *Кожевникова, Л.А.* Экономические ресурсы научных библиотек: монография / Л.А.Кожевникова. – М.: Либерея – Бибинформ, 2006. – С. 19 – 112.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Липень, С.В.* Библиотека в информационной инфраструктуре агрогородка: по результатам социологического исследования / С.В.Липень // Библиотеки в информационном пространстве: синтез традиций и инноваций: сб. науч. статей. – Мн.: Красико-Принт, 2007. – С. 92 – 95.
6. *Пераверзева, Ю.А.* Роля сацыяльна-культурнага асяроддзя ў праектнай дзейнасці бібліятэк / Ю.А.Пераверзева // Научные труды Республиканского института высшей школы. Философско-гуманиратные науки: сб. науч. ст. – Вып. 3 (8) / под ред. В.Ф.Беркова. – Мн.: РИВШ, 2007. – С. 38 – 43.
7. *Шышкін, У.А.* Бібліятэкі Беларусі / У.А.Шышкін // Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2006 / уклад. і навук. рэд. І.Б.Багачова. – Мн.: Бел. дзярж. ін-т праблем культуры, 2007. – С. 58 – 67.

## Бібліятэчная мікраэканоміка

Мікраэканоміка як састаўная частка эканамічнай навукі даследуе эканамічныя адносіны, якія ўзнікаюць ў сувязі з рацыянальным выкарыстаннем абмежаваных рэсурсаў. У дачыненні да бібліятэчнай справы гэта азначае аналіз эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы на ўзроўні канкрэтных суб'ектаў грамадскага сектара рынкавай эканомікі, у прыватнасці асобных бібліятэк [2].

Вызначэнне паняцця "бібліятэчная мікраэканоміка" прапанаваў і метадычна абгрунтаваў расійскі бібліятэказнаўца В.Клюеў. Паводле В.Клюева бібліятэчная мікраэканоміка – гэта "тэарэтыка-прыкладная навуковая дысцыпліна, якая вывучае бібліятэку як спецыфічную эканамічную адзінку і гаспадарчы суб'ект" [4, с. 29]. Асноўную задачу бібліятэчнай мікраэканомікі В.Клюеў бачыць у дыягностыцы і збалансаванні чатырохбаковых інтарэсаў: бібліятэкі, карыстальнікаў, дзяржавы, грамадскасці. На думку І.Басамыгінай, прадметам бібліятэчнай мікраэканомікі павінен стаць "аналіз эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы на ўзроўні канкрэтных суб'ектаў грамадскага сектара: цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм і асобных бібліятэк, а таксама ўсёй бібліятэчнай падгаліны і дзяржавы ў мэтах рацыянальнага выкарыстання абмежаваных рэсурсаў, якія маюць альтэрнатыўнае прымяненне" [1, с. 21].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэчная мікраэканоміка можа разглядацца як сукупнасць сродкаў і метадаў, з дапамогай якіх выпрацоўваюцца шляхі аптымальнага выкарыстання рэсурснага патэнцыялу бібліятэкі. У адпаведнасці з апошнім у бібліятэцы ствараюцца ўмовы для максімальнага задавальнення карыстальнікаў бібліятэчна-інфармацыйнымі прадуктамі і паслугамі і забяспечваецца эканамічны баланс паміж відамі паслуг, рэсурснымі выдаткамі і канчатковым вынікам.

У межах бібліятэчнай мікраэканомікі суадносяцца аб’ёмы фінансавых, інтэлектуальных, матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў з відамі бібліятэчнай дзейнасці, у якой яны выкарыстоўваюцца. Гэта з’яўляецца падставай для развіцця механізмаў гаспадарчай дзейнасці, забеспячэння рацыянальнага і мэтанакіраванага выкарыстання наяўных рэсурсаў, павышэння прадукцыйнасці бібліятэчнай работы. У гэтым кантэксце вывучаюцца пытанні цэнаўтварэння на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі (В.Клюеў, А.Ястрабава, М.Ты励кевіч), распрацоўкі функцыянальных паказчыкаў дакладнай і якаснай характарыстыкі бібліятэчнай работы ў адпаведнасці са зменлівай эканоміка-арганізацыйнай сітуацыяй (А.Шубін), абмежаванага выкарыстання платных формаў абслугоўвання (В.Байкова, С.Калегаева), сучаснага фінансавага забеспячэння бібліятэк (Л.Кулікова, Н.Магілевер), фарміравання і ўдасканальвання прававой базы мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк (В.Байкова, В.Клюеў, А.Арлоў).

Агульнатэарэтычны характар бібліятэчнай мікраэканомікі паказаны ў даследаваннях І.Басамыгінай. Яна лічыць, што мэта бібліятэчнай мікраэканомікі – у паглыбленым тэарэтычным адлюстраванні асноўных паняццяў і палажэнняў мікраэканомікі ў дачыненні бібліятэчнай справы, якія раскрываюць у абагульненым выглядзе асобныя, найбольш важныя аспекты гаспадарчай дзейнасці бібліятэк ва ўсіх узаемасувязях. Даследчык абгрунтоўвае тэарэтычны падыход да бібліятэчнай мікраэканомікі з пункту гледжання яе месца і ролі ў грамадскім сектары эканомікі, эканамічных паводзін людзей і прыняцця адпаведных рашэнняў, рэсурсаабмежаванасці бібліятэчнай галіны, развіцця вытворчай і гаспадарчай дзейнасці ў бібліятэчных установах, перамен сацыяльных умоў [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі напрамкамі мікраэканамічных даследаванняў у бібліятэчнай справе з'яўляюцца:

– ініцыяванне мэтавых інвестыцый, акумуляванне і пераразмеркаванне грашовых сродкаў, кіраванне фінансавымі рэсурсамі;

– матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і камплектаванне бібліятэчных фондаў;

– кадравая палітыка (падбор і расстаноўка, навучанне, перападрыхтоўка кадраў);

– вытворчасць на базе бібліятэкі і рэалізацыя бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг;

– выкарыстанне метадаў маркетынгу пры вызначэнні балансу інтарэсаў карыстальнікаў і рэсурсных магчымасцей бібліятэкі;

– самазабеспячэнне пэўных напрамкаў бібліятэчнай работы;

– вывучэнне інфармацыйных запытаў рэальных і патэнцыяльных карыстальнікаў і іх ролі ў фарміраванні цанавой і сервіснай складаючых бібліятэчнага абслугоўвання;

– суадносіны сацыяльнай накіраванасці бібліятэчнай работы з плануемымі паказчыкамі эканамічнай эфектыўнасці, выкарыстанне эканамічных крытэрыяў эфектыўнасці ў дзейнасці бібліятэк.

Сярод кампанентаў бібліятэчнай мікраэканомікі вылучаюцца тэорыя попыту і прапаноў (паводзіны вытворцаў і спажыўцоў бібліятэчна-інфармацыйных паслуг); канцэпцыя карыснасці (уплыў інтэлектуальных бібліятэчных прадуктаў і паслуг на развіццё прафесійнага, адукацыйнага, навуковага патэнцыялу карыстальнікаў); эфект нявызначанасці выбару карыстальніка; ідэя канкурэнтных рынкаў, палітыка цанавой дыверсіфікацыі на платныя формы абслугоўвання; тэорыя эканамічнай эфектыўнасці [6].

Бібліятэцы як гаспадарчаму суб'екту ўласціва спецыфічнае сацыяльна-эканамічнае мікраасяроддзе, дзе значная роля належыць асобасным і грамадскім патрэбам у бібліятэчных паслугах. Іх рынкавы кошт кампенсуецца сродкамі мэтавых бюджэтных паступленняў, дапамогай спонсараў, аплатай звышнарматыўных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і прадуктаў карыстальнікамі. Існуе таксама неабходнасць вызначэння аптымальных варыянтаў спалучэння бюджэтных асігнаван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў і пазабюджэтных сродкаў, іх дапушчальных аб'ёмаў, формаў і відаў ініцыятыўнай гаспадарчай дзейнасці і метадаў яе здзяйснення.

Сярод метадаў бібліятэчнай мікраэканомікі можна вылучыць аналіз (мікраэканамічны, функцыянальны); прагназіраванне (сярэдне- і доўгатэрміновае); планаванне (бягучае, стратэгічнае); кантроль (выбарчы, прамежкавы, выніковы); метады фінансавага менеджменту. Азначаныя катэгорыі грунтуюцца на звестках аб фінансавых, вытворчых, сацыяльных аспектах бібліятэчнай дзейнасці, перспектывах яе развіцця, інавацыйных эканамічных падыходах да арганізацыі работы, якасных і колькасных паказчыках уласнай бібліятэчнай дзейнасці, сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках зоны бібліятэчнага абслугоўвання.

Аптымальным варыянтам мадэліравання мікраэканамічнай дзейнасці з'яўляецца яе пабудова згодна этапам:

1. Зыходны маркетынгавы ўзровень (збор і апрацоўка шматаспектных звестак).

2. Рэалізацыя рынкавай канцэпцыі бібліятэкі (фарміраванне напрамкаў работы, распрацоўка прафіляваных нарматыўных дакументаў, вызначэнне ўмоў абслугоўвання і інш.).

3. Рэсурснае (фінансавае, матэрыяльна-тэхнічнае, кадравае) аснашчэнне прыярытэтных напрамкаў функцыянавання, размеркавання рэсурснага патэнцыялу бібліятэкі.

4. Тэхналагічная падрыхтоўка вытворчасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг высокай якасці пры аптымальных выдатках.

5. Вытворчасць паслуг і адпаведнасць інтэлектуальнай прадукцыі.

6. Выбарчы кантроль якасных параметраў асобных відаў паслуг.

7. Назапашванне і захоўванне ў бібліятэцы банка існуючых паслуг (прадукцыі) і зыходных матэрыялаў для аказання рэкламных паслуг.

8. Рэалізацыя паслуг.

9. Навучанне карыстальнікаў бібліятэкі навыкам выкарыстання бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў і тэхнічнага абсталявання.

10. Выбар альтэрнатыўных варыянтаў дзейнасці, увядзенне пры неабходнасці новых этапаў мадэліравання [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэчная мікраэканоміка арыентавана на распрацоўку бібліятэчнымі ўстановамі сістэмы дадатковых шматканальных рэсурсных паступленняў. Гэту сістэму ўтвараюць рэалізацыйныя і нерэалізацыйныя кампаненты. Іх сутнасць заключаецца ў аб'яднанні тых кірункаў бібліятэчнай работы, якія садзейнічаюць акумуліраванню дадатковых фінансавых сродкаў. Упершыню тэрмін "рэалізацыйныя і нерэалізацыйныя кампаненты" выкарыстаў В.Клюеў у пачатку 1990-х гг. [6]. Ён абгрунтаваў увядзенне гэтага паняцця з улікам мікраэканамічнага падыходу. Гэтую ж дзейнасць І.Басамыгіна разглядае як бібліятэчнае прадпрымальніцтва, у якім вылучае ўнутраны і знешні кірункі [1]. Пры ўнутраным бібліятэчным прадпрымальніцтве адбываецца абслугоўванне мэтавых груп карыстальнікаў на дагаворнай аснове. Такая практыка характэрна для Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры імя М.І.Рудаміно, Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, нацыянальных і абласных бібліятэк суб'ектаў Расіі, а таксама бібліятэк Беларусі. У якасці мэтавых карыстальнікаў выступаюць прадпрымальніцкія структуры, прыватны сектар, супрацоўнікі ВНУ, прафтэхвучылішчаў, нацыянальныя меншасці. Знешняе прадпрымальніцтва развіваецца пры бібліятэках, дзе ствараюцца бібліятэчныя кааператывы (напрыклад, "Рудаміно").

У межах бібліятэчнай мікраэканомікі сфарміравалася пэўная сістэматызацыя розных крыніц паступлення сродкаў, якія групуюцца па рэалізацыйных і нерэалізацыйных напрамках.

Асноўнымі рэалізацыйнымі кампанентамі ініцыятыўнай дзейнасці бібліятэк з'яўляюцца:

– даванне платных дадатковых паслуг і інтэлектуальнай прадукцыі,

– здзяйсненне гаспадарча-дагаворнай дзейнасці,

– выкананне мэтавых сацыяльна-творчых заказаў,

– продаж частак бібліятэчнага фонду, якія не выкарыстоўваюцца,

– аплата карыстальнікамі кошту ўлікова-рэгістрацыйных формаў.

Аказанне платных паслуг карыстальнікам – адна з самых распаўсюджаных формаў ініцыятыўнай фінансава-эканамічнай дзейнасці. Дыскусіі сярод замежных бібліятэказнаўцаў аб магчымасці і неабходнасці распаўсюджвання платных бібліятэчных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэчных паслуг прыпадаюць на 60–70 гг. XX ст. У той час сфарміраваўся погляд на недапушчальнасць стварэння эканамічнага бар'еру паміж карыстальнікамі і інфармацыяй. Сёння інфармацыя разглядаецца як тавар, які мае пэўны кошт, а значыць, можа прыносіць фінансавы прыбытак. На думку Р.Савалайнена, платнасць бібліятэчных паслуг садзейнічае павышэнню іх якасці і пашырэнню наменклатуры [9]. У некаторых краінах платнасць бібліятэчных паслуг прызнана на дзяржаўным узроўні. У Беларусі дакументам, рэгулюючым дзейнасць бібліятэк адносна аплаты бібліятэчна-інфармацыйных паслуг, з'яўляецца "Палажэнне аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь". Гэты тыпавы дакумент мае рэкамендацыйны характар для бібліятэк усіх тыпаў. У ім сфармуляваны асноўныя падыходы да арганізацыі працы бібліятэк па аказанні платных паслуг і прапанавана універсальная методыка разліку адпускных цэн. Згодна з Палажэннем пры фарміраванні цаны бібліятэкі павінны ўключаць у яе склад усе цэнаўтваральныя элементы: матэрыяльныя выдаткі, рэнтабельнасць, падаткі і адлічэнні згодна з дзеючым заканадаўствам. Цэны на сацыяльна эфектыўныя паслугі могуць устанаўлівацца на ўзроўні сабекошту.

Платнымі з'яўляюцца звышнарматыўныя паслугі. Пры гэтым недапушчальнай лічыцца трансфармацыя асобных бясплатных паслуг у платныя. Гэта можа прывесці да парушэння сацыяльнага балансу бясплатнага і платнага абслугоўвання ў пэўнай бібліятэцы. Бібліятэкам рэкамендуецца будаваць асартыментную і цанавую палітыку па прынцыпе альтэрнатыўнасці паслуг [3]. Дыферэнцыраванасць аплаты паслуг бібліятэчнага абслугоўвання залежыць ад базавых крыніц фінансавання, рэсурснага патэнцыялу бібліятэкі, матэрыяльных магчымасцей і спажывецкай культуры карыстальнікаў. Таксама неабходна замацаванне правоў і адказнасці бібліятэк як гаспадарчых суб'ектаў за рэгуляванне дадатковай платнай дзейнасці. Тым больш, што наменклатура платных прадуктаў і паслуг, тэхналогія іх вытворчасці, узровень выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў для іх распрацоўкі адрозніваюцца ў бібліятэках пэўных сістэм і ведамстваў. У сувязі з гэтым на ўзроўні гаспадарчага суб'екта неабходна размежаванне правоў і абавязкаў заснавальнікаў, адміністрацыі бібліятэк, вытворцаў і спажыўцоў бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод мноства відаў класіфікацыі бібліятэчных прадуктаў і паслуг можна выдзеліць найбольш агульныя прыметы: катэгорыі карыстальнікаў, доступ карыстальнікаў да бібліятэчных паслуг, доступ да інфармацыі, узровень масавай работы бібліятэкі і наяўнасць сацыякультурных напрамкаў у абслугоўванні, даванне аналітычных другасных дакументаў, стварэнне асартыментных груп паслуг, сервіснасць і комплекснасць паслуг і інш.

Прыкладамі перспектыўных формаў бібліятэчнага абслугоўвання на платнай аснове могуць быць бягучае інфармаванне з выкарыстаннем ксеракопій першасных крыніц, падрыхтоўка і папаўненне тэматычных папак-дасье, складанне дайджэстаў і аглядаў, рэферыраванне тэкстаў, алічбоўка дакументаў, паліграфічныя паслугі.

Здзяйсненне гаспадарча-дагаворнай дзейнасці атрымліваецца праз сістэму дагавораў: куплі-продажу, падраду, комплексных і дагавораў аб сумеснай дзейнасці [7]. Дагаворная практыка бібліятэк абумоўлена арганізацыйна-эканамічнымі і функцыянальнымі асаблівасцямі іх дзейнасці і грунтуецца на нарматыўна-прававых адносінах у бібліятэчнай і іншых сферах жыццядзейнасці грамадства.

Дагаворы куплі-продажу распаўсюджваюцца на бібліятэчныя паслугі і прадукты, правы. Стварэнне і перадача інтэлектуальнага прадукту, створанага ў бібліятэцы, карыстальніку абумоўліваецца дагаворам падраду. Адносна розных відаў бібліятэчнага абслугоўвання, напрыклад інфармацыйна-кансультацыйнага, ці паслуг рэкламнага характару дзейнічаюць комплексныя дагаворы і дагаворы аб сумеснай дзейнасці.

Найбольш распаўсюджаным у бібліятэчнай галіне відам дагавораў з’яўляецца дагавор куплі-продажу. Ён рэгулюе ў асноўным аказваемыя бібліятэкай бягучыя паслугі. Дагавор вызначае пакупнікоў бібліятэчнай прадукцыі, канкрэтныя віды паслуг, аб’ём і колькасць тых ці іншых паслуг, іх кошт.

Дагаворы падраду афармляюцца на плануемыя віды работ. У змесце дагавора адлюстроўваюцца характэрныя асаблівасці дзейнасці: аб’ём, колькасныя параметры, патрабаванні да выканання, чакаемыя вынікі, тэрміны выканання, неабходнасць кансультацый, кошт. У час рэалізацыі дагавора падраду бібліятэка можа выкарыстоўваць дапамогу іншых арганізацый і прадпрыемстваў, якія разглядаюцца як субпадрадчыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкананне бібліятэкай мэтавых сацыяльна-творчых заказаў дае магчымасць развіваць пэўныя кірункі работы пры дапамозе бюджэтаў усіх узроўняў (тэрытарыяльных, бюджэтаў арганізацый і прадпрыемстваў) і відаў (дзяржаўных, камерцыйных). Фінансаванне мэтавых сацыяльна-творчых заказаў адносіцца да катэгорыі бягучых выдаткаў. Яно заключаецца ў выдзяленні бюджэтных сродкаў не па нарматывах, а згодна са спецыяльнымі праграмамі і праектамі сацыяльнай накіраванасці. Фінансаванне сацыяльна-творчых заказаў здзяйсняецца на аснове спецыяльных дагавораў паміж заказчыкамі (бібліятэкамі, заснавальнікамі бібліятэк) і выканаўцамі (арганізацыямі сацыякультурнай сферы). У бібліятэчнай сферы сацыяльныя заказы могуць датычыцца рэалізацыі дзяржаўных, рэгіянальных, мясцовых комплексных праграм.

Продаж часткі бібліятэчнага фонду, якая не выкарыстоўваецца, і аплата карыстальнікамі кошту ўліковых і рэгістрацыйных бланкаў з’яўляюцца тэхнічнымі аперацыямі, што рэгламентуюцца тэхналагічнай дакументацыяй і маюць пэўную методыку выканання.

Для паспяховай працы з рэалізацыйнымі крыніцамі фінансавання бібліятэкам трэба прадугледзець распрацоўку падыходаў да фарміравання цэн. Гэта паспрыяе ўстанаўленню збалансаванага кошту звышнарматыўных бібліятэчных паслуг.

Рэалізацыйны кірунак прадугледжвае пэўны ўзровень рэнтабельнасці (прыбытку) пры захаванні сацыяльных мэт дзейнасці бібліятэк. Апошнія скіраваны на пашырэнне формаў і відаў бібліятэчнага абслугоўвання, аказанне прафесійнай дапамогі карыстальнікам у атрыманні інфармацыі і паслуг, развіцці творчых здольнасцей і навуковага патэнцыялу.

Крыніцы паступлення прыбытку ад нерэалізацыйнай дзейнасці дзеляцца на ўнутраныя і знешнія пазабюджэтныя рэсурсныя сродкі (класіфікацыя прапанавана В.Клюевым) [5]. Унутраныя пазабюджэтныя крыніцы бібліятэк фарміруюцца за кошт выкарыстання ўласных магчымасцей: эканамічнай абароны бібліятэчных фондаў, арэндных і субарэндных адносін. Да знешніх каналаў прыцягнення пазабюджэтных сродкаў адносяцца атрыманне грантаў, дабрачынная і спонсарская дапамога, ахвяраванні фізічных асоб, удзел у конкурсах і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аглядах, атрыманне крэдытаў, пазык, удзел у тэндэрах, заключэнне кантрактаў.

Эканамічная абарона бібліятэчнага фонду дае магчымасць прадугледзець і пры неабходнасці кампенсаваць страту, пашкоджанне, затрымку дакументаў. Эканамічныя меры могуць быць:

– папераджальнымі (залогі, залогавыя абанементы);

– санкцыянаванымі (штрафы, пені);

– кампенсацыйнымі (аддаванне раўназначнай замены носьбіта інфармацыі, аплата рынкавай цаны ці кошту аднаўлення дакумента).

Арэндныя і субарэндныя адносіны замацоўваюцца на аснове трохбаковых дагавораў паміж заснавальнікам, уласнікам і балансатрымальнікам бібліятэкі. Яны датычацца афармлення арэнды памяшканняў бібліятэк і часовай арэнды бібліятэчнымі ўстановамі плошчаў іншых арганізацый. Арганізацыйна-эканамічныя абмежаванні арэнднай/субарэнднай дзейнасці бібліятэк замацоўваюцца на заканадаўчым узроўні. У выпадку арэнды памяшканняў бібліятэчныя ўстановы Беларусі вызваляюцца ад уплаты падаткаў у бюджэты ўсіх узроўняў.

Банкаўскія крэдыты і пазыкі таксама лічацца знешнім пазабюджэтным рэсурсам, але амаль не выкарыстоўваюцца ў бібліятэчнай практыцы. Прычына таму – высокія працэнтныя стаўкі. Больш разгалінаванай з'яўляецца лізінг – форма крэдытавання, якая дае магчымасць арэнды абсталявання з паэтапным унясеннем платы за яго. Лізінг абумоўліваецца спецыяльным дагаворам аб аплаце і прадугледжвае магчымасць выкупу абсталявання па астаткавым кошце.

Рацыянальнаму выкарыстанню фінансавых сродкаў садзейнічае арганізацыя ці ўдзел бібліятэк у тэндэрах на пастаўку паслуг або абсталявання. Тэндэр арганізуецца на падставе заявак, якія разглядаюцца конкурснай камісіяй. У выніку заключаецца кантракт і арганізатар тэндэра выдаткоўвае сродкі на рэалізацыю праекта. Кантрактам замацоўваюцца тэрмін выканання, спосабы аплаты, якасць работ. Ён гарантуе эфектыўнасць выкарыстання сродкаў і рэсурсаў, абгрунтоўвае патрабаванні да якасці, вызначае фактары і ўмовы дасягнення канчатковых вынікаў.

Прыцягненню пазабюджэтных сродкаў для рэалізацыі функцый абслугоўвання ў бібліятэках спрыяюць конкурсы і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агляды дзейнасці бібліятэк. Вызначаюць тры тыпы конкурсаў: бібліятэчныя, чытацкія, партнёрскія [8]. Сярод падтыпаў бібліятэчных конкурсаў вылучаюцца навукова-праектныя, конкурсы прафесійнага майстэрства, конкурсы бібліятэк ці структурных падраздзяленняў. Найбольш вядомы ў Беларусі рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. На абласным узроўні паказальнай з’яўляецца тэматычная конкурсна-аглядная дзейнасць Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С.Пушкіна. У якасці прызоў пераможцам прапануюцца грашовыя прэміі, абсталяванне, аргтэхніка, творы выяўленчага мастацтва і інш.

Шэраг нерэалізацыйных крыніц, такіх як конкурсы грантаў, дапамога спонсараў і дабрачынцаў, прыватных ахвяравальнікаў, аб’ядноўваюцца ў тэхналогію фандрэйзінгу. Адметнасцю бібліятэчнага фандрэйзінгу з’яўляецца прыцягненне сродкаў у бібліятэкі для рэалізацыі сацыяльна значных і грамадска карысных праектаў у інфармацыйнай, адукацыйнай, культурна-забаўляльнай сферах.

Нерэалізацыйныя крыніцы фінансава-эканамічнай дзейнасці ў большасці накіраваны на выкарыстанне знешняй рэсурснай базы. Яны ўяўляюць сабой даволі шырокі дыяпазон супрацоўніцтва і эфектыўнага размеркавання сродкаў. Пры рабоце з гэтым відам крыніц бібліятэкі атрымоўваюць магчымасць усталявання аптымальнага функцыянавання і якаснага задавальнення запытаў карыстальнікаў.

Мікраэканоміка бібліятэчнай дзейнасці мае тэарэтычнае і прыкладное значэнне для развіцця галіны. Сутнасныя характарыстыкі бібліятэчнай мікраэканомікі адлюстроўваюць яе як сродак аптымальнага фарміравання і выкарыстання рэсурснай і матэрыяльна-тэхнічнай базы, эфектыўнай арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання, мадэрнізацыі працэсаў бібліятэчнай вытворчасці, развіцця эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы з улікам сучасных тэндэнцый менеджменту і маркетынгу. Мікраэканамічны падыход стымулюе да развіцця самастойных гаспадарчых кірункаў бібліятэчнай работы. Пры рэалізацыі апошніх неабходны наяўнасць прафесійных і творчых якасцей, развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу супрацоўнікаў, выкарыстанне розных метадаў заахвочвання. Разам з тым дакладна не распрацаванымі застаюцца пытанні прававога рэгулявання ініцыятыўнага напрамку фінансава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічнай дзейнасці, матывацыі патэнцыяльных спонсараў, PR забеспячэння названай дзейнасці, актывізацыі чытацкай аўдыторыі.

### *Пытанні і заданні*

1. Дайце азначэнне паняцця “бібліятэчная мікраэканоміка”.
2. Якія напрамкі мікраэканамічных даследаванняў вам вядомы?
3. Назавіце асноўныя кампаненты бібліятэчнай мікраэканомікі. Вашы меркаванні наконт іх развіцця ў бібліятэчных установах Беларусі?
4. У чым сутнасць мікраэканамічнага падыходу да кіравання бібліятэкай?
5. Дайце агульную характарыстыку рэалізацыйнага і нерэалізацыйнага кірункаў мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк. Прывядзіце вядомыя вам прыклады іх выкарыстання ў рабоце бібліятэк.

### *Літаратура*

1. *Басамыгина, И.Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И.Н.Басамыгина. – М.: Либерея-Бибинформ, 2006. – С. 6 – 42; 116 – 140.

2. *Басамыгина, И.Н.* Предмет и проблемы библиотечной микроэкономики / И.Н.Басамыгина // Парадигмы XXI века: информационное общество, информационное мировоззрение, информационная культура: материалы междунар. науч. конф., Краснодар, 16–18 сентября 2002 г. – Краснодар, 2002. – С. 293 – 296.

3. *Качалина, В.В.* Экономические проблемы деятельности библиотек России и других стран СНГ / В.В.Качалина // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2005. – № 2 (10). – С. 51 – 56.

4. *Клюев, В.К.* Библиотечная микроэкономика (методология, менеджмент, маркетинг, дидактика) / В.К.Клюев // Библиотековедение. – 2000. – № 1. – С. 28 – 35.

5. *Клюев, В.К.* Инициативная хозяйственная деятельность современной библиотеки / В.К.Клюев // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2004. – № 1 (7). – С. 20 – 30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Клюев, В.К.* Маркетинговый подход к библиотечной микроэкономике / В.К.Клюев // Науч. и техн. б-ки. – 1993. – № 9. – С. 10 – 22.

7. *Клюев, В.К.* Хозяйственная практика библиотеки: комплексный подход / В.К.Клюев // Библиография. – 2003. – № 2. – С. 17 – 23.

8. *Осипова, И.П.* Публикации о библиотечных конкурсах федерального и регионального уровней / И.П.Осипова // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2006. – № 1 (11). – С. 238 – 252.

9. *Sovolainen, R.* The socio-economic dimensions of the charging dilemma / R.Sovolainen // Encyclopedia of library and information sciense. – Vol. 52, Suppl. 15. – New York, 1993. – P. 322 – 350.

## Гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў

Змест і арганізацыя гаспадарчай дзейнасці бібліятэк разглядаліся на розных этапах развіцця бібліятэчнай эканамічнай навукі. Найбольшы ўклад у распрацоўку пытанняў пабудовы гаспадарчага механізму бібліятэкі і бібліятэчнай справы ўвогуле ўнеслі С.Калегаева, К.Ратнікава, І.Суслава, А.Чукаеў, В.Клюеў, І.Басамыгіна, Н.Магілевер. Гэтымі даследчыкамі абгрунтаваны формы, метады і правілы функцыянавання бібліятэкі як гаспадарчага суб’екта; выяўлены асаблівасці гаспадарчага механізму бібліятэк; азначаны мадэлі і спосабы гаспадарання, іх структурныя элементы; сфармуляваны прынцыпы гаспадарчага разліку ў бібліятэчнай справе; вылучаны суб’екты гаспадарчай дзейнасці бібліятэчных устаноў.

Гаспадарчая дзейнасць бібліятэк – гэта сродак рэалізацыі эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы з дапамогай сукупнасці працэсаў, якія забяспечваюць рух і пераўтварэнне рэсурсаў у прадукты і паслугі бібліятэчнай вытворчасці. Гаспадарчая дзейнасць накіравана на забеспячэнне зыходных умоў дзейнасці бібліятэк, арганізацыю работы бібліятэчных спецыялістаў, рэалізацыю бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг [5].

Асноўнымі аб’ектамі гаспадарчай дзейнасці бібліятэк з’яўляюцца маёмасць, фінансавыя сродкі, інтэлектуальныя прадукты і працоўныя рэсурсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест гаспадарчай дзейнасці бібліятэчных устаноў вызначаецца арганізацыяй фінансавання, аператыўным кіраваннем бібліятэчнай маёмасцю, кадравай палітыкай, узаемадзеяннем з іншымі суб’ектамі гаспадарання з мэтай вырашэння статутных задач бібліятэк.

У сістэме гаспадарання бібліятэк існуюць фінансавыя, працоўныя і камерцыйныя адносіны. Узнікненне фінансавых адносін магчыма паміж:

– бібліятэкай і фінансавай сістэмай пры атрыманні бюджэтных сродкаў і пры выплаце ўстаноўленых заканадаўствам падаткаў;

– бібліятэкай і крэдытнай сістэмай пры атрыманні і выплаце банкаўскіх пазык і працэнтаў за крэдыт;

– бібліятэкай, арганізацыямі розных формаў уласнасці і фізічнымі асобамі пры аплаце кошту матэрыяльных каштоўнасцей і рэалізацыі бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг;

– бібліятэкай і яе калектывам пры разліках, звязаных з аплатай працы і іншымі грашовымі выплатамі.

Працоўныя адносіны ў бібліятэцы характарызуюцца сувяззю адміністрацыі і супрацоўнікаў пры вызначэнні ўзроўню аплаты працы і атрыманні сацыяльна-эканамічных ільгот. Гэтыя адносіны рэгулююцца на дзяржаўным узроўні і на ўзроўні пэўнай бібліятэкі. Так, заканадаўчыя і ўрадавыя нарматыўныя акты вызначаюць мінімальны ўзровень заработнай платы, тарыфныя стаўкі, працягласць працоўнага тыдня, адпачынку, магчымасць арганізацыі камерцыйнай дзейнасці і іншыя пытанні. На ўзроўні бібліятэкі рэгулююцца сістэма заработнай платы, стымуляванне за працоўныя і творчыя дасягненні. Прымяняецца практыка калектыўных дагавораў і кантрактаў.

Камерцыйныя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці ўзнікаюць паміж:

– бібліятэкамі і пастаўшчыкамі матэрыяльных рэсурсаў, звязаных з камплектаваннем фондаў, набыццём бібліятэчнага абсталявання, тэхнікі, канцылярскіх прылад і інш.;

– бібліятэкамі і камунальнымі службамі, якія ажыццяўляюць абслугоўванне будынкаў і памяшканняў, аказваюць камунальныя паслугі, і арганізацыямі, якія здзяйсняюць ахову бібліятэчнай маёмасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– бібліятэкамі і партнёрамі пры арганізацыі сумесных выдавецкіх, рэкламных, культурна-масавых праектаў і мерапрыемстваў;

– бібліятэкамі і карыстальнікамі пры атрыманні апошнімі платных бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, дадатковага сервіснага абслугоўвання.

Гаспадарчая дзейнасць бібліятэк суадносіцца з функцыянаваннем грамадскага сектара, а менавіта мясцовымі органамі ўлады і грамадскімі аб’яднаннямі (прафсаюзамі, асацыяцыямі, суполкамі). Гэтыя структуры прымаюць непасрэдны ўдзел у фінансаванні бібліятэкі, абароне інтарэсаў яе супрацоўнікаў і карыстальнікаў, арганізацыі ўзаемадзеяння на міжнародным, міжрэгіянальным узроўнях. Узаемаадносіны бібліятэчных устаноў з камерцыйнай сферай праяўляюцца ў выглядзе індывідуальнага ці калектыўнага спажывання платных паслуг (інфармацыйных, сервісных, спадарожных), набыцця маёмасці бібліятэкі, дабрачынных ахвяраванняў, спонсарскай дапамогі.

Арганізацыя вытворча-гаспадарчай дзейнасці здзяйсняецца з дапамогай гаспадарчага механізма. У “Даведніку бібліятэкара” ён вызначаецца як “комплекс арганізацыйных, эканамічных, прававых формаў, метадаў і інструментаў кіравання вытворча-гаспадарчай дзейнасцю бібліятэк, для якіх уласцівы пэўныя метады ўздзеяння, структура кіравання і ўмовы прыцягнення людзей да працы” [5, с. 202]. Гаспадарчы механізм бібліятэк грунтуецца на шэрагу прынцыпаў. Гэта фарміраванне шматканальнай сістэмы паступлення эканамічных рэсурсаў бібліятэк; адмова ад планавання выдаткаў бібліятэкі ад дасягнутага ўзроўню і пераход на нарматыўны метад фарміравання і выкарыстання рэсурсаў; пашырэнне правоў і самастойнасці працоўных калектываў у вырашэнні пытанняў размеркавання сродкаў бібліятэкі; увядзенне гнуткіх метадаў стымулявання працы; выкарыстанне розных формаў гаспадарання; развіццё дагаворных адносін і гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэчных устаноў.

Гаспадарчы механізм стварае аснову мадэляў гаспадарання ў выглядзе:

– нарматыўна рэгулюемага камерцыйнага гаспадарання,
– нарматыўна рэгулюемага некамерцыйнага гаспадарання,
– гаспадарання на аснове фінансавання згодна каштарысу [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасць першай мадэлі гаспадарання заключаецца ў тым, што бібліятэцы як гаспадарчай адзінцы даецца магчымасць займацца камерцыйнай дзейнасцю ў межах сацыякультурнай сферы. Гэта мадэль гаспадарання можа быць выкарыстана ў буйных бібліятэчна-інфармацыйных цэнтрах, якія могуць займацца платнымі відамі бібліятэчнага і інфармацыйнага абслугоўвання і маюць даволі разгалінаваную арганізацыйную структуру. Маюцца на ўвазе бізнес-бібліятэкі, бібліятэкі-музеі, бібліятэкі, у складзе якіх існуюць кніжныя магазіны, выставачныя залы, цэнтры дзелавой інфармацыі, функцыянуюць іншыя сацыякультурныя аб'екты.

Другая мадэль ініцыятыўнай фінансава-эканамічнай дзейнасці – нарматыўна рэгулюемае некамерцыйнае гаспадаранне – абапіраецца на нарматыўны прынцып размеркавання сродкаў. У выпадку арганізацыі ініцыятыўнай дзейнасці згодна гэтай мадэлі бібліятэчным спецыялістам трэба вызначыцца па наступных пытаннях: місіі бібліятэкі, выдаткаў і вынікаў дзейнасці, нарміравання працэсаў і аперацый, размеркавання фінансавых рэсурсаў, аптымізацыі структуры, эфектыўнасці і кантролю. Такі спосаб гаспадарання можа быць выкарыстаны дзяржаўнымі бібліятэчнымі ўстановамі, якія з'яўляюцца самастойнымі юрыдычнымі асобамі і маюць разліковы рахунак. Гэта бібліятэкі тыпу нацыянальных, паранацыянальных, абласных, а таксама цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы.

Фінансаванне бібліятэк згодна каштарысу прадугледжвае кантроль за ініцыятыўнай гаспадарчай дзейнасцю і яе рэгуляванне з боку заснавальнікаў. Апошнія зацвярджаюць артыкулы каштарысу адносна выдаткаў, удзельнічаюць у размеркаванні сродкаў і прымаюць рашэнне аб мэтазгоднасці выкарыстання пазабюджэтных крыніц фінансавання. Бібліятэка валодае мінімальнымі правамі самастойнага прыняцця гаспадарчых рашэнняў, а размеркаванне сродкаў ажыццяўляецца мэтавым спосабам па пэўных артыкулах каштарысу. У падобных умовах функцыянуюць бібліятэкі, якія не маюць магчымасцей для вядзення гаспадарчай дзейнасці і атрымання ўласнага прыбытку. Пры гэтай мадэлі гаспадарання фінансаванне вызначаецца не вынікамі працы, а аб'ёмам і структурай выкананых работ.

Веданне магчымых мадэляў паводзін у гаспадарчай сферы дае магчымасць бібліятэкам выкарыстоўваць ініцыятыўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы дзейнасці, у тым ліку сістэму дадатковых шматканальных рэсурсных паступленняў.

Выкарыстанне той ці іншай мадэлі садзейнічае вырашэнню задач гаспадарчага механізма ў бібліятэчнай дзейнасці: арганізацыі паступлення і выкарыстання фінансавых сродкаў; уздзеяння на выканаўцаў на розных узроўнях прыняцця рашэнняў; падтрымкі канкурэнтаздольнасці бібліятэчна-інфармацыйных паслуг; стварэння спецыяльнай нарматыўнай базы, якая б рэгулявала ўмовы гаспадарчай дзейнасці і механізмы фарміравання і выкарыстання рэсурсаў. Акрамя таго, гаспадарчы механізм і мадэлі гаспадарання ўстанаўліваюцца адміністрацыяй бібліятэкі ў адпаведнасці з яе статутам, прававымі, эканамічнымі і арганізацыйна-тэхналагічнымі ўмовамі. Яны ўтрымліваюць у якасці элементаў арганізацыю сістэмы заработнай платы і стымулявання працы. Дарэчы, арганізацыя аплаты працы супрацоўнікаў бібліятэкі ўключае форму аплаты, сістэму службовых акладаў, крытэрыі і памеры даплат за дасягненні ў рабоце, сістэму паказчыкаў прэміравання спецыялістаў.

Вельмі важным інструментам гаспадарання з’яўляецца гаспадарчы разлік. Ён вызначаецца “як сукупнасць вытворчых адносін і адначасова метад планавага вядзення гаспадаркі” [4, с. 27]. Яму ўласцівы таксама такія катэгорыі, як вымярэнне ў грашовай форме выдаткаў і вынікаў гаспадарчай дзейнасці, рэнтабельнасць, самафінансаванне і матэрыяльнае заахвочванне.

У агульным разуменні сутнасць гаспадарчага разліку ў тым, што ўсе выдаткі, звязаныя з вытворчай дзейнасцю, пакрываюцца прадпрыемствам за кошт атрыманага грашовага прыбытку ад выробленай і рэалізаванай прадукцыі.

Асноўнымі прынцыпамі гаспадарчага разліку з’яўляюцца самаакупнасць, планаванне і гаспадарчая самастойнасць, матэрыяльная адказнасць калектыву, распрацоўка наменклатуры паслуг у залежнасці ад бібліятэчнай тэхналогіі, грашовы кантроль за гаспадарчай дзейнасцю [7]. На думку Л.Кажэўнікавай, выкарыстанне прынцыпу самаакупнасці ў бібліятэчнай справе не магчыма таму, што бібліятэчныя ўстановы не маюць завершанага гаспадарчага абароту. Астатнія прынцыпы садзейнічаюць частковыму гаспадарчаму разліку і могуць выкарыстоўвацца ў бібліятэчнай практыцы [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існуюць прыбытковая і нарматыўная мадэлі гаспадарчага разліку, якія могуць выкарыстоўвацца ў дзейнасці бібліятэчных устаноў. Яны скіраваны на забеспячэнне:

– прапорцыі паміж вытворчасцю бібліятэчных паслуг і відамі бібліятэчнага абслугоўвання,

– якасці задавальнення інфармацыйных запытаў абанентаў і рэсурснай базы бібліятэкі,

– разліку памераў бюджэтнага фінансавання,

– кантролю за гаспадарчай дзейнасцю.

Сутнасць прыбытковай мадэлі гаспадарання ў наяўнасці валавога прыбытку, які ствараецца ў выніку рэалізацыі тавараў і паслуг. З гэтага прыбытку выключаюцца выдаткі абарачэння, у склад якіх уваходзіць заработная плата. Астатні агульны прыбытак размяркоўваецца згодна ўстаноўленым нарматывам на разлік з бюджэтам (рэспубліканскім, мясцовым), заснавальнікамі, крэдыторамі. Далей прыбытак размяркоўваецца на стварэнне фондаў развіцця вытворчасці, сацыяльнага развіцця і матэрыяльнага заахвочвання.

Пры нарматыўнай мадэлі гаспадарання з валавога прыбытку вылічваюцца выдаткі, прыраўненыя да матэрыяльных (акрамя расходаў на заработную плату). Затым ажыццяўляюцца выплаты па ўстаноўленых нарматывах. Згодна гэтай мадэлі гаспадарання сродкі таксама накіроўваюцца на падтрымку фондаў вытворчага і сацыяльнага развіцця, аплаты працы [7].

Асобай увагі патрабуе пытанне аб вызначэнні месца ўнутрыбібліятэчнага гаспадарчага разліку ў эканоміцы бібліятэчнай дзейнасці. Замежныя спецыялісты разглядаюць гэты від гаспадарчага разліку як частку кіраўнічага кодэкса бібліятэкі. На гэту акалічнасць звярнула ўвагу Л.Кажэўнікава, якая адзначыла таксама нарматыўна кантралюючую функцыю ўнутрыбібліятэчнага гаспадарчага разліку [4].

Даследаванні замежных навукоўцаў паказалі, што сістэма гаспадарчага разліку ў бібліятэцы ўяўляе цэласнасць у тым выпадку, калі яна дазваляе выявіць доўгатэрміновыя падыходы да ажыццяўлення расходаў і кантраляваць якасць бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг. У гэтым кантэксце ўнутрыбібліятэчны гаспадарчы разлік характарызуецца па наступных параметрах: коштавы аналіз бібліятэчных працэсаў і аперацый; аналіз ускосных выдаткаў, якія вылучаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на вытворчасць бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг; стварэнне інфармацыйнага забеспячэння кіраўнікоў бібліятэкі; справаздачнасць.

Сярод паказчыкаў гаспадарчай эфектыўнасці вылучаюцца прыбытак і сабекошт бібліятэчна-інфармацыйнай прадукцыі. Яны залежаць ад умоў гаспадарання, стану асяроддзя, стратэгіі бібліятэчнага маркетынгу, методыкі цэнаўтварэння на бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі.

Цэнаўтварэнне з’яўляецца асноўным кампанентам гаспадарчага механізма. Яно разглядаецца як “працэс фарміравання ўзроўню цэн на бібліятэчныя прадукты і паслугі і вызначэння магчымых варыянтаў іх змянення ў залежнасці ад пастаўленых мэт і здзяйсняемых выдаткаў на сучасны момант і на перспектыву” [5, с. 290]. Абагульняючы вядомы вопыт цэнаўтварэння [2; 3; 5; 6], можна вылучыць наступныя яго віды:

– з улікам выдаткаў, калі ў кошце адлюстроўваюцца сабекошт і доля прыбытку;

– з улікам характару і наяўнасці попыту на пэўны від бібліятэчна-інфармацыйнай прадукцыі ці паслуг, магчымых выдаткаў на яго вытворчасць;

– з улікам канкурэнцыі, калі кошт вызначаецца зыходзячы з прапаноў арганізацый-канкурэнтаў пры ўмове пакрыцця выдаткаў.

Цэнаўтварэнне на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі, як і ўся гаспадарчая дзейнасць, рэгулюецца заканадаўчымі актамі розных узроўняў. Вылучаюцца тры групы гаспадарчых адносін, якія патрабуюць прававога забеспячэння: паміж заснавальнікамі і бібліятэкай, паміж бібліятэкай і іншымі суб’ектамі гаспадарання, паміж бібліятэкай і карыстальнікамі.

Сістэму нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць гаспадарчую дзейнасць бібліятэк, утвараюць нормы агульнага, галіновага і лакальнага характару. У дачыненні бібліятэк дзейнічаюць Грамадзянскі кодэкс, законы Рэспублікі Беларусь “Аб культуры”, “Аб бібліятэчнай справе”, “Аб інфарматызацыі”, “Аб абароне правоў спажыўцоў”, “Аб рэкламе”, указы і распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета міністраў Рэспублікі Беларусь, галіновых міністэрстваў і ведамстваў. Сярод лакальных нарматыўных актаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вылучаюцца статут бібліятэкі, палажэнне аб платных паслугах, палажэнне аб структурных падраздзяленнях, калектыўны дагавор. Трэба адзначыць, што гаспадарчая дзейнасць бібліятэк рэгулюецца нарматыўнымі актамі іншых галін права: заканадаўствам аб фінансах і крэдытнай сістэме, аб адукацыі, аб навуковай дзейнасці, аб адміністрацыйных правапарушэннях, аб працы і інш.

Аналіз тэарэтыка-арганізацыйных пытанняў гаспадарчай дзейнасці бібліятэк сведчыць аб тым, што бібліятэчныя ўстановы з'яўляюцца раўнапраўнымі суб'ектамі эканамічных адносін. Аб гэтым сведчаць разгалінаваная сістэма фінансавых, камерцыйных, працоўных адносін, а таксама выкарыстанне сучасных мадэляў гаспадарання. Гаспадарчы механізм бібліятэчнай дзейнасці спрыяе пашырэнню наменклатуры бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, стварае ўмовы для больш гнуткага цэнаўтварэння на пэўныя віды паслуг бібліятэчнага сервісу, рэгламентуе паступленне фінансавых сродкаў, выкарыстанне ініцыятыўных напрамкаў гаспадарання і прынцыпаў гаспадарчага разліку, арганізацыю аплаты працы бібліятэчных супрацоўнікаў. Унутрыбібліятэчны гаспадарчы разлік дазваляе ажыццяўляць паступовы коштавы аналіз бібліятэчных працэсаў, аперацый і выдаткаў, будаваць аптымальную структуру кіравання бібліятэкай, весці абгрунтаваную кадравую палітыку.

### *Пытанні і заданні*

1. У чым сутнасць прыбытковай і нарматыўнай мадэляў гаспадарчага разліку ў бібліятэчнай дзейнасці?
2. Укажыце ўмовы і асаблівасці выкарыстання гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэк.
3. Назавіце асноўныя кампаненты гаспадарчага механізма бібліятэкі.
4. Ахарактарызуйце асноўныя аб'екты гаспадарчай дзейнасці бібліятэк.
5. Якія віды цэнаўтварэння вам вядомы? Хто з айчынных і замежных бібліятэчных спецыялістаў займаецца адзначанай праблематыкай?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура*

1. *Басамыгина, И.* Модели хозяйственной деятельности / И.Басамыгина // Библиотека. – 2006. – № 4. – С. 47 – 50.

2. *Далгаполава, А.Е.* Аб новых падыходах да фарміравання цэн на платныя паслугі бібліятэк / А.Е.Далгаполава // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выданне / НББ; адказ. за вып. Л.Г.Кірухіна. – Мн., 2004. – С. 82 – 85.

3. *Клюев, В.К.* Ценообразование и ценовой маркетинг в библиотеке: науч.-метод. пособие / В.К.Клюев, Н.П.Аббакумова. – М., 1997. – С. 52 – 56.

4. *Кожевникова, Л.А.* Библиотека в структуре базовых социально-экономических процессов территорий: монография / Л.А.Кожевникова; ГПНТБ СО РАН. – Новосибирск, 2004. – С. 27 – 28.

5. *Справочник* библиотекаря / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2004. – С. 200 – 206, 212, 290 – 297.

6. *Суслова, И.М.* Практический маркетинг в библиотеках: учеб.-метод. пособие / И.М.Суслова. – М., 2004. – С. 62–64.

7. *Экономико-правовые* аспекты функционирования библиотеки: науч.-практ. пособие / Рос. гос. б-ка. – М., 1994. – С. 14 – 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе

У аснове дзейнасці бібліятэкі як сацыяльна-эканамічнай сістэмы знаходзіцца сукупнасць грамадскіх, калектыўных і асобасных інтарэсаў. Таму пры арганізацыі работы бібліятэкі асаблівае значэнне надаецца праблеме ўпарадкавання службовых узаемаадносін супрацоўнікаў.

Бібліятэцы як сацыяльна-эканамічнай сістэме ўласцівы функцыі самакіравання і самарганізацыі. У яе межах існуюць пэўныя падсістэмы, якія ўтвараюць цэласны механізм гаспадарчай дзейнасці і бібліятэчнага абслугоўвання. У той жа час бібліятэка можа з’яўляцца элементам ці структурнай адзінкай больш значнай, разгалінаванай сістэмы, напрыклад вышэйшай навучальнай установы, цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. На сучасным этапе бібліятэкі разглядаюцца як аўта-

номныя сацыяльна-эканамічныя сістэмы. На думку навукоўцаў, аўтаномным бібліятэчным сістэмам уласцівы пэўныя якасці, якія вызначаюць іх месца ва ўнутранай пабудове ўстановы і якія садзейнічаюць вырашэнню агульных мэт і задач сістэмы [2]. У гэтым кантэксце праца бібліятэчных спецыялістаў разглядаецца як асноўны рэсурс сістэмнага развіцця, а ўстанаўленне меры працы і праектаванне рацыянальнай працоўнай дзейнасці – сродкі эфектыўнай арганізацыі і кіравання работай бібліятэчнай установы.

У мэтах аптымізацыі бібліятэчных працэсаў, павышэння эфектыўнасці бібліятэчнай працы, забеспячэння сацыяльнай абароны супрацоўнікаў і выкарыстоўваюцца нормы, адэкватныя затратам бібліятэчнай вытворчасці. Асновы нарміравання бібліятэчных працэсаў і аперацый былі закладзены ў пачатку 1920-х гг. XX ст. У той перыяд пытаннямі нарміравання працы бібліятэкараў займаўся А.Пакроўскі. Ён прапанаваў “Палажэнне аб нарміраванні працы бібліятэкараў” (1924), якое было падрыхтавана на аснове ўліку рабочага часу і нормаў выпрацоўкі.

У 1930-я гг. распрацаваны нормы для некалькіх навуковых бібліятэк. Гэта былі Дзяржаўная бібліятэка СССР імя У.І.Леніна, Дзяржаўная політэхнічная бібліятэка, бібліятэка Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В. Ламаносава і інш.

Работа па нарміраванні аднавілася ў бібліятэках пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Пачалася распрацоўка нормаў для абласных бібліятэк пад кіраўніцтвам М.Рабей. Упершыню былі выкарыстаны асновы тэхнічнага нарміравання, табліцы па зборы зыходных звестак.

У перыяд 1960–70-х гг. пачалася актыўная работа па стварэнні нарматываў на бібліятэчныя працэсы. Было прынята рашэнне аб распрацоўцы тыпавых нормаў часу для усіх бібліятэк СССР. У рабоце прынялі ўдзел 60 бібліятэк. Міжведамасную камісію па навуковай арганізацыі працы ўзначаліў І.Фрумін. Вынікам яе работы стала выданне ў 1982 г. “Тыпавых нормаў на работы, якія выконваюцца ў бібліятэках”.

Увядзенне ў практыку работы бібліятэк аўтаматызаваных тэхналогій абумовіла неабходнасць перагляду існуючых нормаў. Пачалася праца па вывучэнні змен у тэхналагічных працэсах і аперацыях ва ўмовах механізацыі і аўтаматызацыі. Былі падрыхтаваны “Нарматывы часу на работы па навукова-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічнай інфармацыі” (1989). У 1991 г. былі зацверджаны новыя “Тыпавыя нормы часу на работы, якія выконваюцца ў бібліятэках”, а ў 1997 г. з’явіліся “Міжгаліновыя нормы часу на работы, якія выконваюцца ў бібліятэках”. Найноўшым нарматыўным актам стаў праект “Нарматываў на работы, якія выконваюцца з прымяненнем ПЭВМ” (2002), “Адзіныя нормы часу і выпрацоўкі на работы, якія выконваюцца на перфарацыйных і клавішных машынах і ўстройствах падрыхтоўкі даных на машынных носьбітах” (1990). Значны ўклад у распрацоўку гэтых нарматыўных актаў унесла супрацоўніца Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі Н.Смірнова.

У Беларусі праблемамі нарміравання займаюцца спецыялісты аддзела бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Нарміраванне аўтаматызаваных бібліятэчных працэсаў даследуе Л.Ракавецкая [5]. У 2000 г. у бібліятэкі Беларусі для апрабацыі паступілі “Зводныя нормы часу, якія выконваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы і бібліятэках Расіі”.

У бібліятэках выкарыстоўваюцца наступныя віды нормаў: часу, выпрацоўкі, абслугоўвання, колькасці, сецявыя, рэсурсныя, эфектыўнасці, мінімальныя, аптымальныя, максімальна дазволеныя [9].

Па сферах і масштабах дзеяння нормы могуць быць:

– міжгаліновыя, якія дзейнічаюць у межах бібліятэчных сетак некалькіх галін;

– галіновыя, што выкарыстоўваюцца ў бібліятэчных установах пэўнай галіны;

– мясцовыя (вопытныя), якія распаўсюджваюцца на пэўную бібліятэку і ствараюцца пры ўмове адсутнасці міжгаліновых (галіновых) нарматыўных матэрыялаў;

– асабістыя, прынятыя ў бібліятэцы для атрымання дадатковых сродкаў з мясцовых бюджэтаў і па лініі праграмнага фінансавання.

– агульныя, прызначаныя для бібліятэк аднаго віду (для дарослых, дзяцей);

– дыферэнцыраваныя, якія ўстанаўліваюцца для асобных бібліятэк аднаго віду, але якія маюць розныя па велічыні раёны абслугоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па часе дзеяння нормы класіфікуюцца на:

– пастаянныя, якія ўстанаўліваюцца для стабільных відаў работ;

– часовыя, якія распрацоўваюцца на тэрмін асваення пэўных відаў работ ці пры адсутнасці ўвогуле нарматыўных матэрыялаў на іх;

– разавыя, устанаўліваюцца на асобныя віды работ, як правіла, адзінкавага характару і дзейнічаюць да часу іх завяршэння.

Нарміраванне працы бібліятэчных работнікаў здзяйсняецца з мэтай павышэння прадукцыйнасці працы і аптымізацыі кіравання працоўнымі рэсурсамі шляхам эфектыўнай пабудовы вытворчага працэсу. Даследчыкамі вылучаны асноўныя задачы нарміравання працы. Гэта абгрунтаванне неабходнай і дастатковай велічыні затрат рабочага часу на адзінку прадукцыі ў канкрэтных умовах яе вытворчасці; праектаванне рацыянальных метадаў працы; сістэматычны аналіз выканання нормаў і вывучэнне рэзерву вытворчасці; абагульненне і распаўсюджанне вопыту арганізацыі вытворчасці [1; 3]. Разам з тым нарміраванне садзейнічае ўкараненню навуковых дасягненняў у вытворчасць; паляпшэнню ўнутрывытворчага планавання, уліку і справаздачнасці; аптымізацыі штатнай колькасці; пераразмеркаванню штата супрацоўнікаў унутры бібліятэкі; забеспячэнню інтэнсіўнасці працы; прадухіленню сацыяльных канфліктаў у сферы працоўных адносін, замацаванню дысцыпліны; падтрымцы эканамічна абгрунтаваных напрамкаў гаспадарчай дзейнасці; матэрыяльнаму стымуляванню бібліятэкараў; павышэнню канкурэнтаздольнасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг; пашырэнню зоны бібліятэчнага абслугоўвання і г.д.

Абгрунтаванне працоўных нормаў адбываецца шляхам вывучэння тэхнічных, эканамічных, арганізацыйных, псіхафізіялагічных і сацыяльных аспектаў бібліятэчнай вытворчасці [6]. Абавязковаму ўліку падлягаюць аналіз фактараў, якія залежаць ад бібліятэчнай тэхналогіі; метады арганізацыі вытворчасці; якасць і сабекошт бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг; умовы працы і адпачынку супрацоўнікаў.

Увядзенне ці перагляд нормаў працы замацоўваецца лакальнымі нарматыўнымі актамі (загадам дырэктара бібліятэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кі, палажэннем па нарміраванні) і ўзгадняецца з прафкамам ці саветам працоўнага калектыву.

Якасць нормаў працы вызначаецца методыкай нарміравання. Н.Смірнова вылучае наступныя найбольш дзейсныя метады нарміравання: аналітычны метад, хранаметраж, фатаграфія працоўнага дня, метад экспертных ацэнак, метад маментальных назіранняў [7]. В.Дрыгайла прапануе наступныя метады нарміравання: аналітычны і сумарны. Першы ўтрымлівае аналітычна-даследчы, ці аналітычна-разліковы, спосаб ўстанаўлення нормаў, якія, у сваю чаргу, прадугледжваюць разлік затрат рабочага часу на выкананне пэўнай аперацыі і вылучэнне велічыні выдаткаў бібліятэчнай вытворчасці. Сумарны метад фіксуе толькі фактычныя затраты працы [1]. Існуюць меркаванні бібліятэкараў-практыкаў аб выкарыстанні эмпірычнага метаду, метаду навуковага мадэліравання, метаду запазычання.

У кантэксце фінансава-эканамічнай дзейнасці ўвагу набывае парадак распрацоўкі нормаў працы. На ўзроўні мікраэканомікі вызначаюцца кірункі бібліятэчнай вытворчасці, якія маюць рацыянальную арганізацыйна-тэхнічную структуру і могуць быць выкарыстаны для фарміравання нормаў затрат працы. Увага павінна надавацца таксама складанасці і працаёмкасці бібліятэчных вытворчых працэсаў, кваліфікацыйным характарыстыкам выканаўцаў, вопыту і стажу іх работы, сацыяльна-бытавым умовам адпачынку. Разлік гадавога бюджэту працоўнага часу бібліятэчных спецыялістаў павінен утрымліваць звесткі па наступных асноўных паказчыках: колькасць працоўных, выхадных і святочных дзён, асноўны і дадатковы адпачынак, часовая непрацаздольнасць спецыяліста.

З боку кіраўніцтва бібліятэкі ў перыяд ажыццяўлення нарміравання павінны быць створаны пэўныя ўмовы: належны стан памяшканняў і тэхналагічнага абсталявання; своечасовая выдача работніку расходных матэрыялаў; арганізацыя аховы і бяспекі вытворчасці. Абгрунтаваныя нормы часу даюць магчымасць кіраўніцтву бібліятэкі фарміраваць яе штатную колькасць, планаваць нагрузку, уводзіць дадатковыя пасады; разлічваць выдаткі працоўных рэсурсаў на вытворчасць пэўнага віду бібліятэчна-інфармацыйных паслуг; устанаўліваць кошт работ, якія ажыццяўляюцца на дагавор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най аснове; гарантаваць супрацоўнікам дадатковую аплату працы і прэміраванне; вырашаць вытворчыя канфліктныя сітуацыі.

Пры разліку нагрузкі спецыялісты рэкамендуюць улічваць традыцыйныя, творчыя працэсы (гутаркі, анатаванне і інш.) паралельна з камп’ютэрызаванымі. Гэта дазваляе больш якасна і аб’ектыўна рабіць разлік. Разлік штатнай колькасці супрацоўнікаў бібліятэк ажыццяўляецца зыходзячы з агульнай працаёмкасці работы за год, фонду працоўнага часу на аднаго работніка і каэфіцыента, які адлюстроўвае нявыхад спецыяліста на работу ў сувязі з хваробай ці адпачынкам [4].

Выкарыстанню сацыяльна-эканамічных нормаў і нарматываў у дзейнасці бібліятэчных устаноў спрыяе бібліятэчная эканаметрыя – навуковая дысцыпліна, прадметам якой з’яўляецца вывучэнне колькасных характарыстык эканамічных з’яў і працэсаў сродкамі матэматычнага і статыстычнага аналізу. Яна вывучае бібліятэку як эканамічны аб’ект у цэлым, так і па сістэмаствaральных элементах (фонд, МТБ, персанал, кантынгент абанентаў). Распрацоўку эканаметрычных мадэляў работы бібліятэк ажыццяўляюць Н.Магілевер, У.Шылаў, Н.Ціханава [3; 8]. Яны вылучылі ўзроўні пабудовы названых мадэляў, якія прадугледжваюць фіксацыю стану сацыяльна-эканамічных адносін па асобных паказчыках, стварэнне іх сістэмы і прагназіраванне тэндэнцый развіцця, выбар розных велічынь іх вымярэння ці сацыяльна-эканамічных нарматываў. Гэтыя даследчыкі выявілі пяць блокаў удасканалення бібліятэчнай вытворчасці з улікам сацыяльна-эканамічных нарматываў: аргструктуры кіравання бібліятэчнай справай, сістэмы планавання дзейнасці бібліятэк, сістэмы нарміравання бібліятэчнай працы, фінансавання дзейнасці бібліятэк, сістэмы аплаты бібліятэчнай працы.

Выкарыстанне сацыяльна-эканамічных нормаў і нарматываў у бібліятэчнай дзейнасці выклікана сацыяльна-эканамічнымі зменамі ў развіцці грамадства і вытворчасці. Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў і аперацый, пашырэнне формаў абслугоўвання карыстальнікаў, увядзенне новых пасад вызначаюць неабходнасць перагляду нарматываў бібліятэчнай працы. Нарміраванне садзейнічае аптымізацыі і рацыяналізацыі бібліятэчнай працы, эфектыўнаму выкарыстанню бібліятэчнай тэхнікі і тэхналогій, развіццю бібліятэчнай вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці, замацаванню працоўнага рэгламенту, стварэнню ўмоў для павышэння асобаснай і прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў.

### *Пытанні і заданні*

1. Якія віды нормаў вам вядомы? Якім чынам яны ўплываюць на арганізацыю фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк?

2. Пералічыце асаблівасці выкарыстання нормаў пры планаванні бюджэту рабочага часу [1, с. 203 – 212].

3. Азнаёмцеся з памяткай загадчыку аддзелам і адказнаму за навуковую арганізацыю працы па ўкараненні вопытных нормаў у аддзеле, карыстаючыся літаратурай [1, с. 196 – 197].

4. У чым сэнс сістэмы ўдасканалення фінансавай дзейнасці бібліятэк ва ўмовах выкарыстання сацыяльна-эканамічных нормаў і нарматываў [8, с. 47 – 55].

### *Літаратура*

1. *Дригайло, В.Г.* Основы научной организации труда в библиотеках: науч.-метод. пособие / В.Г.Дригайло. – М.: Либерея, 2005. – С. 186 – 219.

2. *Дригайло, В.Г.* Основы управления библиотекой высшего учебного заведения: науч.-практ. пособие / В.Г.Дригайло, Е.В.Башун, В.Н.Волынец. – М.: Либерея, 2004. – С. 29 – 32.

3. *Могилевер, Н.В.* Эконометрические модели как средство построения нормативов в библиотечном деле / Н.В.Могилевер, В.В.Шилов // Эконометрические исследования в библиотечном деле: сб. науч. тр. – СПб.: Российская науч. б-ка, 1993. – Вып. 1. – С. 11 – 25.

4. *Нормирование* труда в библиотеках: метод. рек. / Рос. гос. б-ка; сост. Н.А.Смирнова. – М., 1993. – 39 с.

5. *Ракавецкая, Л.І.* Праблемы нарміравання аўтаматызаваных бібліятэчных працэсаў / Л.І.Ракавецкая // Веснік Бел дзярж. ін-та праблем культуры. – 2003. – № 1. – С. 98 – 104.

6. *Смирнова, Н.А.* Как улучшить нормирование библиотечных процессов / Н.А.Смирнова // Библиотековедение. – 1993. – № 1. – С. 85 – 91.

7. *Смирнова, Н.А.* Трудовые нормы времени в библиотечных процессах / Н.А.Смирнова // Библиотековедение. – 2002. – № 6. – С. 40 – 44.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Тихонова, Н.О.* Экономические “терзания” отечественного библиотековедения (1979–1991 гг.) / Н.О.Тихонова, В.В.Шилов // Эконометрические исследования в библиотечном деле: сб. науч. тр.– СПб.: Российская науч. б-ка, 1993. – Вып. 1. – С. 27 – 69.

9. *Фенелонов, Е.А.* Социально-экономические нормы в библиотечном деле: к постановке проблемы / Е.А.Фенелонов // Проблемы библиотечного строительства: сб. избран. работ. – М.: Пашков дом, 2005. – С. 246 – 253.

## Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк

У распрацоўцы праблем эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк можна вылучыць некалькі перыядаў. Першы, пачатак 1920-х гг. XX ст., характэрны вывучэннем эканамічнай эфектыўнасці ад утрымання грамадскіх, школьных, прыватных бібліятэк; вызначэннем нормаў колькасці бібліятэк для пэўных тэрыторый, велічыні іх кніжных фондаў, колькасці бібліятэкараў, памераў памяшканняў. Гэтымі пытаннямі займаліся Я.Медынскі, С.Хлябцэвіч, Б.Весялоўскі, П.Кудраўцаў, А.Пакроўскі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі з’явіліся дзяржаўныя органы кіравання бібліятэчнай справай. Кіраўніцтва патрабавала эфектыўнага выкарыстання друкаваных выданняў у мэтах прыцягнення насельніцтва да чытання. Распрацоўваліся пытанні выкарыстання рэсурсаў існуючых бібліятэк і дадатковага фінансавання іх дзейнасці, увядзення ў практыку эканамічных паказчыкаў, разліку сярэдняга кошту адной кнігавыдачы, апрацоўкі аднаго дакумента. А.Пакроўскім былі прапанаваны зводныя паказчыкі ацэнкі, пры фарміраванні якіх выкарыстоўваліся паказчык “умоўнай прадукцыі”, каэфіцыенты для пераводу паказчыкаў работы з чытачамі ва ўмоўную кнігавыдачу.

У 1930-я гг. вырашаліся пытанні эканамічнага абгрунтавання стварэння і размяшчэння бібліятэчных сетак, планавання ўзроўню забяспечанасці бібліятэкамі розных тэрытарыяльных адзінак, размеркавання паміж імі бібліятэчных рэсурсаў. Да 1941 г. склалася агульная мадэль гаспадарання ў бібліятэчнай галіне, якая абапіралася на эканамічныя паказчыкі бі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бліятэчнай дзейнасці, веды па арганізацыі бібліятэчных сістэм і асобных бібліятэк. У пачатку 1950-х гг. з’явіліся рэкамендацыі па рацыянальным камплектаванні штату бібліятэк розных відаў, праектаванні бібліятэчных будынкаў у залежнасці ад велічыні фонду і колькасці патэнцыяльных чытачоў. Для гэтага перыяду характэрна прыцягненне калгасных, прафсаюзных сродкаў, сродкаў спажыўкааперацыі для развіцця бібліятэчнай вытворчасці. Рацыянальнаму выкарыстанню рэсурсаў спрыяла тэрытарыяльнае размеркаванне бібліятэк і бібліятэчных пунктаў пры ўліку мясцовых умоў.

У 1960–70-я гг. пачынае ўваходзіць у прафесійную лексіку тэрмін “эфектыўнасць”. Яго выкарыстаў І.Фрумін у сэнсе суадносін вынікаў і выдаткаў. Эфектыўнасць ён прапанаваў вымяраць нагрузкай (прадукцыйнасцю працы) бібліятэчных работнікаў і абарачальнасцю фондаў [6]. У гэты час Міністэрствам культуры краіны была пастаўлена задача павышэння эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк. Пачаўся пераход на масавае тыпавое праектаванне бібліятэчных будынкаў; распрацоўваліся методыкі вылічэння кошту бібліятэчнага абслугоўвання і асобных відаў работ; устанаўліваліся нормы працазатрат, абарачальнасці, ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем. М.Карташоў выказаў думку аб магчымасці вымярэння эфектыўнасці ў грашовым эквіваленце [1]. Ю.Сталяроў прапанаваў крытэрый эфектыўнасці разглядаць з пункту гледжання паўнаты задавальнення запытаў на літаратуру і бібліяграфічную інфармацыю, узроўню культуры абслугоўвання [3].

Такім чынам, для разглядаемых перыядаў характэрна фарміраванне сістэмы крытэрыяў і паказчыкаў эканамічнай эфектыўнасці работы бібліятэк. Паняцце “эфектыўнасць” набыло рысы эканамічнай катэгорыі, але яго сэнс трактуецца бібліятэказнаўцамі па-рознаму. Няма адзінага пункту гледжання і на выкарыстанне эканамічнай эфектыўнасці пры разліку якасці работы бібліятэк.

Наступны перыяд вывучэння і прымянення крытэрыяў і паказчыкаў эканамічнай эфектыўнасці ў бібліятэчнай справе (1980–1990-я гг.) вызначаецца даследаваннем сацыяльнага эфекту як выніку функцыянавання бібліятэкі і затрат, якія маюць колькасныя і коштавыя ацэнкі; вывучэннем ролі эканамічнага аналізу і бібліятэчнай статыстыкі ў вызначэнні экана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мічнай эфектыўнасці; абгрунтаваннем паняцця “эканамічны крытэрый”, які арыентаваны не толькі на зніжэнне кошту бібліятэчных працэсаў і аперацый, але і на пашырэнне бібліятэчных паслуг, пераглад кошту выдаткаў у бок кваліфікаванай бібліятэчнай працы; увядзеннем ва ўжытак тэрмінаў “сацыяльная эфектыўнасць” і “функцыянальная (тэхнічная) эфектыўнасць”.

У 1980-я гг. эканамічную эфектыўнасць вызначалі шляхам супастаўлення атрыманых вынікаў і сумай затрат, неабходных для іх ажыццяўлення. У разліках улічваліся адначасовыя і бягучыя выдаткі: капітальныя ўкладанні, заработная плата персаналу, асвятленне, ацяпленне, добраўпарадкаванне, рост ведаў і культурнага ўзроўню насельніцтва, задавальненне інтэлектуальных запатрабаванняў, якасць выкарыстання вольнага часу карыстальнікаў [5].

Даследаванні 1990-х гг. паставілі пытанне аб разглядзе эканамічнай эфектыўнасці як складаючай больш агульных паняццяў “якасць” і “выніковасць”. Эканамічная эфектыўнасць разглядалася Л.Камушкінай у сэнсе выкарыстання цэнасных паказчыкаў; С.Юрковым і М.Дворкінай у кірунку выяўлення выніковасці бібліятэчнага абслугоўвання; Ю.Гаршковым з пункту гледжання эфектыўнасці як суадносін мэт і вынікаў функцыянавання бібліятэчных сістэм; Я.Фенялонавым у кантэксце аптымізацыі развіцця бібліятэчных сетак у сельскай мясцовасці. Найбольш распаўсюджаным стаў падыход да разліку эканамічнай эфектыўнасці як выніку работы бібліятэкі па колькасці чытачоў, наведванняў, кнігавыдач, прапанаваны С.Новікавым.

Сучасныя ўяўленні аб сутнасці і метадах вымярэння эканамічнай эфектыўнасці цесна звязаны з выкарыстаннем у рабоце бібліятэк гаспадарчых адносін, развіцця кірунку абслугоўвання карыстальнікаў на платнай аснове. Навукоўцамі закранаюцца пытанні самаакупнасці і прыбытковасці бібліятэчнай сферы, разліку планавага кошту паслуг, амартызацыйных расходаў, выкарыстання эканамічнага аналізу як асновы вымярэння эканамічнай эфектыўнасці. Вядомы распрацоўкі В.Клюева, А.Чукаева, Н.Магілевер, Л.Кажэўнікавай. Але, на думку Я.Фенялонава, у публікацыях азначаных аўтараў “праблемы эканамічнай эфектыўнасці не набылі далейшага развіцця і асэнсавання” [4, с. 35]. Ён лічыць, што “існуючых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковых ведаў па тэме недастаткова, каб вырашаць усю сукупнасць эканамічных праблем, праблем аптымізацыі, фарміравання і выкарыстання рэсурсаў, што накіроўваюцца бібліятэкам" [4, с. 36].

Увогуле ў эканоміцы эфектыўнасць разумеецца як спецыфічная эканамічная катэгорыя і называецца эканамічнай эфектыўнасцю. Крытэрыем для вызначэння эканамічнай эфектыўнасці з'яўляюцца суадносіны вынікаў і затрат. У адпаведнасці з гэтым крытэрыем фарміруецца спецыфічная сістэма паказчыкаў, якія дазваляюць колькасна выразіць зыходныя якасці і вытворчую ад іх велічыню, якая сама становіцца паказчыкам. Такім чынам, эканамічная эфектыўнасць вызначаецца паводле крытэрыю і выражаецца ў пэўным паказчыку.

Эканамічная эфектыўнасць дазваляе вымяраць дзейнасць пэўнага работніка, падраздзялення, бібліятэкі ў цэлым, а таксама розных сукупнасцей бібліятэк, якія вылучаюцца па відавой прымеце, рэгіянальнай прыналежнасці і інш.

Я.Фенялонаў звяртае ўвагу на дзве ключавыя катэгорыі тэмы – "вынік" і "затраты". Пад вынікам ён разумее "разнастайныя прадукты працы, створаныя для ўнутранага і знешняга спажывання", а пад затратамі "ўсе матэрыяльныя, інтэлектуальныя і іншыя рэсурсы, якія выкарыстоўваюцца для атрымання вынікаў" [4, с. 39]. Вынікі навуковец раздзяляе на канчатковыя (выдадзеная кніга, задаволены запыт, масавае мерапрыемства) і прамежкавыя (камплектаванне, арганізацыя фонду, стварэнне даведачна-пошукавага апарату).

У структуры эканамічнай эфектыўнасці вылучаюцца:

– унутрыгаліновая эфектыўнасць, калі вынік адлюстроўваецца ў пэўных паслугах, якія аказваюцца карыстальніку;

– міжгаліновая, калі вызначаецца ўклад бібліятэкі ў агульныя вынікі дзейнасці ўстаноў культуры;

– народнагаспадарчая, калі вынік выражаецца ў прыбытку да сукупнага даходу ад гаспадарчай дзейнасці рэгіёну, горада.

Бібліятэчныя рэсурсы маюць эканамічнае выражэнне ў пэўных крытэрыях і паказчыках. Так, фонд вымяраецца ў стандартных адзінках уліку: размеркаванні па галінах ведаў, колькасці назваў, экзэмплярнасці, структуры. Велічыня працоўных рэсурсаў вызначаецца штатнай колькасцю і колькас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цю гадзін рабочага часу персаналу. Іх яшчэ можна вымяраць па аб’ёму заработнай платы; узроўню інтэнсіўнасці працы, прафесійнай падрыхтоўкі, фізічнага здароўя, развіцця сацыяльна-бытавых умоў і эканамічных стымулаў вытворчасці. Н.Магілевер звяртае ўвагу на неабходнасць вызначэння паказчыкаў прафесійна-кваліфікацыйнай структуры бібліятэчнага персаналу. Яна вылучае паказчыкі колькасці: бібліятэкараў пэўных спецыялізацый у агульным аб’ёме супрацоўнікаў; супрацоўнікаў з розным узроўнем адукацыі і профільнай падрыхтоўкі; размеркаванага персаналу па асобных відах бібліятэчных работ, стварэнні паслуг. Памяшканні бібліятэкі вывучаюцца па іх фізічным стане, расходах на ўтрыманне. Гэтыя і іншыя аспекты эканамічнай эфектыўнасці даследуюцца з дапамогай эканамічнага аналізу, які вызначаецца як сукупнасць метадаў фарміравання і апрацоўкі эканамічных паказчыкаў работы бібліятэкі. Яго аб’ектам могуць быць паказчыкі работы пэўнай бібліятэкі ці яе структурнай адзінкі, тэхналагічныя працэсы, прадукты і паслугі. Эканамічны аналіз дазваляе здзяйсняць аналіз фінансавага стану бібліятэкі, даследаванне структуры затрат, ацэнку эканамічнай эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў, ацэнку выніковасці дзейнасці бібліятэкі ў цэлым [2].

Эканамічныя паказчыкі бібліятэчнай дзейнасці адлюстроўваюць стан гаспадарання. Яны могуць быць уліковымі, пазаўліковымі, разліковымі, аналітычнымі. Да ўліковых спецыялісты адносяць паказчыкі бухгалтарскага ўліку, статыстычнага і аператыўнага ўліку. Гэта аб’ём фінансавых сродкаў, якія паступаюць у бібліятэку, даходы ад усіх відаў статутнай і камерцыйнай дзейнасці, кошт асноўных фондаў, расходы на аплату працы бібліятэчнага персаналу, сабекошт бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

Ключавымі паказчыкамі эканамічнай эфектыўнасці лічацца:

– кошт асноўных фондаў – грашовая ацэнка доўгатэрміновых цыклаў бібліятэчнай вытворчасці (амартызацыя будынкаў, абсталявання, тэхнікі);

– выдаткі – грашовае выражэнне матэрыяльных і працоўных расходаў, неабходных для вытворчасці і рэалізацыі пэўнага аб’ёму бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сабекошт – велічыня расходаў усіх відаў рэсурсаў на вытворчасць адзінкі бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

Пазаўліковыя эканамічныя паказчыкі атрымоўваюць шляхам праверак падатковых органаў і кантрольна-рэвізійных упраўленняў.

Разліковыя эканамічныя паказчыкі адлюстроўваюць удзельную вагу пэўнага віду выдаткаў у агульным аб’ёме расходаў бібліятэкі: долю расходаў на аплату працы ў агульным бюджэце бібліятэкі, структуру размеркавання затрат па відах бібліятэчнай дзейнасці і інш.

Да аналітычных паказчыкаў адносяцца:

– фондааддача (выпуск бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг на пэўную суму вытворчых фондаў);

– фондаёмістасць (аб’ём асноўных фондаў, неабходных для выпуску адзінкі прадукцыі);

– фондаўзброенасць (кошт асноўных фондаў з улікам аднаго бібліятэчнага спецыяліста).

Такім чынам, можна зазначыць, што развіццё сістэмы вывучэння эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк з цягам часу атрымлівае паступовае развіццё. Удакладняецца базіс гэтай праблемы, ствараецца тэрміналагічны апарат, распрацоўваюцца новыя паказчыкі і крытэрыі ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці. Перспектыўнымі бачацца эканамічныя даследаванні эфектыўнасці аўтаматызаваных тэхналагічных працэсаў і аперацый, формаў масавага і індывідуальнага абслугоўвання, выкарыстання электронных крыніц інфармацыі, дыстанцыйнага карыстання бібліятэчнымі рэсурсамі.

### *Пытанні і заданні*

1. Ахарактарызуйце сучасныя тэндэнцыі ў ацэнцы эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк.

2. Дайце азначэнне паняццяў “сацыяльная эфектыўнасць” і “функцыянальная (тэхнічная) эфектыўнасць”, карыстаючыся літаратурай [4, с. 22–23]. Хто з навукоўцаў прапанаваў выкарыстоўваць гэтыя тэрміны ў бібліятэчнай справе?

3. Што такое кошт асноўных фондаў бібліятэкі? Якімі эканамічнымі паказчыкамі ён вымяраецца?

4. Дайце азначэнне тэрмінаў “вынік” і “затраты” ў дачыненні эканамічнай эфектыўнасці бібліятэчнай вытворчасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Літаратура*

1. *Карташов, Н.С.* Критерий и показатели эффективности работы с читателями / Н.С.Карташов // Сов. библиотековедение. – 1975. – № 5. – С. 45 – 61.

2. *Справочник* библиотекаря / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2004. – С. 206 – 211.

3. *Столяров, Ю.Н.* Полнота обслуживания читателей – общий критерий эффективности работы научных библиотек / Ю.Н.Столяров // Науч. и техн. б-ки СССР. – 1973. – Вып.1. – С. 3 – 8.

4. *Фенелонов, Е.А.* Критерий и показатели экономической эффективности и методика их применения в библиотечном деле: науч.-практ. пособие / Е.А.Фенелонов. – М.: Пашков дом, 2002. – С. 18 – 32; 37 – 81.

5. *Фенелонов, Е.А.* Об измерении эффективности библиотечной работы / Е.А.Фенелонов // Проблемы библиотечного строительства: сб. избран. работ. – М.: Пашков дом, 2005. – С. 228 – 238.

6.*Фрумин, И.М.* Беречь народную копейку / И.М.Фрумин // Библиотекарь. – 1963. – № 3. – С. 38 – 41.

## Эканамічныя метады кіравання бібліятэкай

Кіраванне бібліятэкамі ў сучасных умовах гаспадарання патрабуе фарміравання асобых крытэрыяў і падыходаў да ажыццяўлення фінансава-эканамічнай дзейнасці і арганізацыі работы бібліятэчных калектываў. Інавацыйныя метады кіравання бібліятэкай, у тым ліку эканамічнымі і фінансавымі працэсамі, патрабуюць прыняцця адпаведных метадычных рашэнняў, заснаваных на палажэннях канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту. Названыя акалічнасці абумоўліваюць спосабы ўздзеяння суб’екта кіравання на аб’екты кіравання, у якасці якіх можна разглядаць бібліятэчных спецыялістаў, тэхналагічныя працэсы, эканамічныя рэсурсы (фінансавыя, матэрыяльна-тэхнічныя). Спосабы мэтанакіраванага ўздзеяння органаў кіравання бібліятэкай на аб’екты кіравання вызначаюцца як метады кіравання.

Існуе пэўная класіфікацыя метадаў кіравання. Згодна ёй вылучаюць метады прамога і ўскоснага ўздзеяння, якія накіраваны на дасягненне высокай эфектыўнасці працы; метады



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармальнага і нефармальнага ўздзеяння, якія ствараюць спрыяльную псіхалагічную атмасферу, маюць выхаваўчы і адукацыйны патэнцыял. Вылучаюцца таксама арганізацыйныя і метады прававога рэгулявання [4]. У комплексе з азначанымі метадамі выкарыстоўваюцца эканамічныя метады, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца ўсталяванне рацыянальнага ўзаемадзеяння эканамічных, арганізацыйных і сацыяльна-псіхалагічных фактараў развіцця бібліятэчнай вытворчасці.

Эканамічныя метады кіравання – гэта прагрэсіўныя спосабы і прыёмы арганізацыі і стымулявання працы, накіраваныя на фарміраванне і замацаванне эканамічнай матывацыі дзейнасці супрацоўнікаў, памяншэнне цякучасці кадраў, развіццё іх прафесійнай ініцыятывы, асабістай зацікаўленасці ў станоўчым выніку сваёй працы і дасягненняў бібліятэкі ў цэлым [1]. Гэтыя метады спрыяюць умацаванню ўнутраных рэзерваў спецыялістаў, самаразвіццю; выкарыстанню эканамічных законаў і заканамернасцей у вытворчасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг; вызначэнню эфектыўнасці вынікаў бібліятэчнага абслугоўвання і затрачаных асігнаванняў на яго арганізацыю; аптымальнаму выкарыстанню грашовых выдаткаў і іншых матэрыяльных рэсурсаў.

Развіццю эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай садзейнічаюць:

– шматканальнае фінансаванне вытворчай і гаспадарчай дзейнасці, самафінансаванне;

– планаванне і аналіз фінансава-эканамічнай дзейнасці;

– выкарыстанне планава-эканамічных паказчыкаў і іх улік пры распрацоўцы кірункаў эканамічнай дзейнасці і складанні каштарысу бібліятэкі;

– замацаванне планавых паказчыкаў і заданняў сацыяльна-эканамічнай дзейнасці за кожным структурным падраздзяленнем бібліятэчнай установы ці бібліятэчнай сеткі;

– укараненне праграмна-мэтавых нормаў працы;

– развіццё сістэмы адказнасці за якасць аказваемых бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг;

– увядзенне стымулюючых мераў за працоўныя дасягненні;

– выкарыстанне канцэпцыі бібліятэчнага маркетынгу;

– прыцягненне пазабюджэтнага фінансавання, арганізацыя ўласнай прадпрымальніцкай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навуковая арганізацыя бібліятэчнай працы, выкананне тэхналагічных цыклаў і метадычных рашэнняў;

– валоданне гаспадарчымі механізмамі і эканамічнымі нарматывамі бібліятэчнага вытворчага працэсу;

– фактары мікра- і макраэканамічнага асяроддзя, сацыякультурная сітуацыя ў зоне бібліятэчнага абслугоўвання.

Эканамічныя метады ўкараняюцца ў практыку работы бібліятэк праз пэўныя формы гаспадарчай дзейнасці, рэалізацыю бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і сэрвіснага абслугоўвання, сістэму матэрыяльнага і маральнага стымулявання. У гэтым кантэксце асобая роля належыць гаспадарчаму разліку і прынятай сістэме фінансавання. Яны дазваляюць рацыянальна выкарыстоўваць матэрыяльныя каштоўнасці і фінансавыя сродкі, з'яўляюцца важным фактарам матывацыі працы, забяспечваюць аптымізацыю бібліятэчнай вытворчасці і пашыраюць яе сацыяльна-эканамічны патэнцыял, стымулююць да вывучэння сучасных тэндэнцый эканамічнай навукі і практыкі, фінансавага менеджменту, грамадскага сектара эканомікі і распрацоўкі стратэгічнага кіравання працоўнымі рэсурсамі ў бібліятэцы.

Выкарыстанне эканамічных метадаў кіравання ў бібліятэках мае арганізацыйна-адміністрацыйную складаючую. Гэта абумоўлена тым, што ў межах бібліятэчнай вытворчасці развіваюцца працоўныя і асобасныя адносіны паміж выканаўцамі і кіраўнікамі. Гэтыя адносіны могуць быць рэгламентаванымі, вольнымі, калегіяльнымі. Яны будуюцца ва ўмовах розных тыпаў арганізацыі бібліятэчных працэсаў і аперацый, розных кваліфікацыйных і службовых ступеняў выканаўцаў.

Пры пэўных умовах выкарыстоўваюцца наступныя віды ўздзеяння: рэгламентаванне, нарміраванне, інструктаванне, арганізацыйна-распарадчы ўплыў. Гэтыя віды ўздзеяння арыентаваны на рэгуляванне суб'ектна-аб'ектных адносін юрыдычнымі сродкамі, а менавіта законамі, пастановамі, загадамі, распараджэннямі, інструкцыямі і інш. Яны фіксуюць абавязкі, правы, адказнасць, у тым ліку матэрыяльную, выканаўцаў і кіраўнікоў.

У аснову эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай пакладзены эканамічныя адносіны супрацоўнікаў і іх эканамічныя інтарэсы. Прыярытэтным становяцца ўсталяванне балансу паміж фондамі размеркавання і спажывання, заработнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

платы і заахвочвання, матэрыяльнага стымулявання; абгрунтаванне вынікаў бібліятэчнай работы з пункту гледжання выдаткаў і эканоміі фінансавых сродкаў; выкарыстанне сістэмы дадатковых грашовых выплат у выглядзе здзельнага ўзнагароджвання, брыгадных формаў аплаты працы, надбавак, прэмій, матэрыяльнай дапамогі, датацый, кампенсацый; распаўсюджванне нематэрыяльных формаў эканамічнага стымулявання (гнуткі графік, скарачэнне працоўнага дня, дадатковы выхадны дзень, вольны рэжым працы).

Да ліку эканамічных метадаў кіравання адносяцца эканамічны разлік, эканамічны аналіз і эканамічнае стымуляванне. Яны звязваюць эканамічныя інтарэсы грамадства, бібліятэкі і асобы і рэалізуюцца ў адпаведнасці з сістэмай планаў (перспектыўных, бягучых, аператыўных). Метад эканамічнага разліку з'яўляецца асноўным пры распрацоўцы асартыменту новых, у тым ліку звышнарматыўных, бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, а таксама пры вызначэнні парадку аплаты працы за іх выкананне, часу непасрэднай вытворчасці. Эканамічны разлік у бібліятэчнай дзейнасці неабходны для пакрыцця выдаткаў ад гаспадарчай дзейнасці, фінансава-эканамічнага аналізу сітуацыі на рынку бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, вызначэння кошту асноўных фондаў і іх амартызацыі, разліку затрат на расходныя матэрыялы; разліку колькаснага складу супрацоўнікаў па катэгорыях і фонду заработнай платы; калькуляцыі сабекошту бібліятэчных працэсаў і аперацый; разліку тэхніка-эканамічных паказчыкаў бібліятэчнай вытворчасці.

Метад эканамічнага аналізу разглядаецца як спосаб выяўлення шляхоў павышэння эфектыўнасці бібліятэчнай работы. Ён адносіцца да катэгорыі актыўных метадаў кіравання гаспадарчай дзейнасцю бібліятэкі і выкарыстоўваецца на этапах падрыхтоўкі, прыняцця і рэалізацыі кіраўніцкіх рашэнняў. Таксама эканамічны аналіз неабходны для фарміравання і размеркавання даходаў бібліятэкі, вызначэння цаны платных паслуг, ажыццяўлення прадпрымальніцкіх праектаў. Галоўная задача эканамічнага аналізу бібліятэчнай работы – атрыманне параўнальных звестак аб эфектыўнасці выкарыстання фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных і працоўных рэсурсаў бібліятэкі, а таксама ацэнка выніковасці бібліятэчнага абслу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гоўвання. Сярод напрамкаў эканамічнага аналізу бібліятэчнай вытворчасці даследчыкі вылучаюць:

– аналіз працоўных рэсурсаў (у тым ліку тэхналогій, арганізацыю працоўных месцаў і іх тэхнічнай аснашчанасці);

– аналіз выканання планавых заданняў;

– аналіз фінансавай дзейнасці бібліятэк (у тым ліку бягучых выдаткаў на ўтрыманне персаналу, арэнду, паслугі і інш.);

– даследаванне структуры выдаткаў бібліятэкі;

– аналіз выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы (у тым ліку бібліятэчных фондаў);

– ацэнка эканамічнай эфектыўнасці работы бібліятэк і кіравання імі;

– матывацыя дзейнасці і маніторынг умоў аплаты працы [3; 4].

Да формаў эканамічнага стымулявання персаналу бібліятэкі адносяцца рэгуляванне заработнай платы, выкарыстанне сістэматычных, перыядычных і аднаразовых грашовых выплат.

Развіццю эканамічных метадаў кіравання ў бібліятэках спрыяюць эканамічныя выгады. Яны разглядаюцца ў грамадскім і асобасным кантэкстах [2]. У гэтым сэнсе развіццё пэўнага кірунку бібліятэчнай вытворчасці павінна арыентавацца на мэты і прызначэнне бібліятэчных вытворчых працэсаў, спосабы дасягнення выгады, іх выкарыстанне ў якасці матывацыйных фактараў, наяўнасць попыту на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі. Пры рэалізацыі эканамічных метадаў кіравання неабходна ўлічваць стан сучаснага гаспадарчага механізма і сутнасць канцэпцый менеджменту ў бібліятэчнай сферы, шматварыянтнасць ініцыятыўнай фінансава-эканамічнай дзейнасці, маркетынгавыя падыходы да вытворчасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг і кіравання бібліятэкай.

Існуе ўзаемазалежнасць эканамічных і сацыяльна-псіхалагічных метадаў кіравання. Кіраўнік адказвае за павышэнне ўзроўню работы з кадрамі, іх прафесійную актыўнасць і кампетэнцыю, набыццё псіхолага-педагагічных ведаў, якія садзейнічаюць усталяванню добразычлівых адносін паміж калегамі, выпрацоўцы ўласнага стылю работы бібліятэчнай установы. Кіраўнік бібліятэкі павінен валодаць ведамі аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуры асобы, метадамі актывізацыі дзейнасці і сацыяльнай пераемнасці, развіцця ініцыятывы; умець ажыццяўляць аналіз псіхалагічнай структуры працоўнай дзейнасці на розных этапах бібліятэчнай вытворчасці, выкарыстоўваць нефармальныя стасункі для аб'яднання калектыву і стымулявання яго да дзейнасці.

Сувязь эканамічных і сацыяльна-псіхалагічных метадаў кіравання вызначаецца задавальненнем культурных і сацыяльна-бытавых запатрабаванняў бібліятэчных спецыялістаў, развіццём сацыяльна-эканамічных нормаў паводзін і вытворчасці, выкарыстаннем нематэрыяльных формаў стымулявання і грашовага заахвочвання, выкананнем кантрактных абавязкаў і патрабаванняў.

Ва ўмовах рынкавых адносін эканамічныя метады кіравання бібліятэкай набываюць інавацыйна-прыкладны характар. Неабходнымі становяцца ўкараненне ў бібліятэчную вытворчасць арганізацыйна-кіраўніцкіх рашэнняў, скіраваных на дасягненне эфектыўнага выніку бібліятэчнай работы; выкарыстанне альтэрнатыўных крыніц фінансавага і рэсурснага забеспячэння бібліятэкі; вызначэнне канкурэнтаздольнасці бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг і месца бібліятэкі на інфармацыйным рынку; маніторынг зоны бібліятэчнага абслугоўвання з мэтай выяўлення патэнцыяльных карыстальнікаў і вывучэння попыту на паслугі бібліятэчнай вытворчасці; планаванне работы бібліятэкі ва ўмовах абмежаваных матэрыяльных магчымасцей і інш.

Эфектыўнасць эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай вызначаецца павышэннем культуры кіравання, своечасовай падрыхтоўкай арганізацыйна-рэгламентуючай, тэхналагічнай і фінансавай дакументацыі, скарачэннем працаёмкасці працэсаў бібліятэчнай вытворчасці, пераходам да аўтаматызаваных тэхналогій уліку, нарміравання і статыстыкі.

Увогуле эканамічныя метады кіравання бібліятэкай садзейнічаюць яе развіццю як гаспадарчага суб'екта, вызначэнню ўзроўняў аплаты працы і ўкладу кожнага спецыяліста ў бібліятэчную вытворчасць, рэгуляванню штатнай колькасці і пераразмеркаванню бібліятэкараў у выпадку вытворчай неабходнасці. Эканамічныя метады кіравання распаўсюджваюцца на ўсе тэхналагічныя працэсы і аперацыі, спрыяюць аптымізацыі абслугоўвання карыстальнікаў, рацыянальнаму выка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстанню наяўных эканамічных рэсурсаў, пабудове сацыяльна арыентаваных адносін у калектыве.

### *Пытанні і заданні*

1. Пералічыце асноўныя эканамічныя метады кіравання бібліятэкай. У чым іх сутнасць?

2. Ахарактарызуйце метады арганізацыйнага і распарадчага ўздзеяння на калектыў супрацоўнікаў бібліятэкі.

3. Акрэсліце ўзаемасувязь эканамічных і сацыяльна-псіхалагічных метадаў кіравання бібліятэчным калектывам.

4. Назавіце фактары павышэння эфектыўнасці выкарыстання эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай.

### *Літаратура*


1. *Дригайло, В.Г.* Основы управления библиотекой высшего учебного заведения: науч.-практ. пособие / В.Г.Дригайло, Е.В.Башун, В.Н.Волынец. – М.: Либерея, 2004. – С. 215 – 220.

2. *Ивлиева, Т.* Государство как главный инвестор / Т.Ивлиева, Е.Смолина // Библиотечное дело. – 2007. – № 2. – С. 30 – 33.

3. *Карташов, Н.С.* Анализ деятельности библиотеки как часть управленческого процесса / Н.С.Карташов // Управление библиотекой: новые идеи и практические решения: сб. науч. тр. / Рос. гос. б-ка; сост. Е.А.Фенелонов. – М., 1995. – Вып. 1. – С. 75 – 84.

*Управление* библиотекой: учеб.-практ. пособие / А.С.Аверьянов [и др.]. – СПб.: Профессия, 2002. – С. 32 – 41.


# Раздзел II
# ФІНАНСАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНЫХ УСТАНОЎ

## Асновы фінансавай дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных устаноў

Пры кіраванні працэсам функцыянавання фінансавых адносін грамадства выкарыстоўвае эканамічныя, арганізацыйна-прававыя метады і формы. Так вызначаюцца формы грамадскіх накапленняў, метады размеркавання валавога ўнутранага прадукту, віды плацяжоў, кірункі выкарыстання бюджэтных сродкаў і інш. Пры гэтым выкарыстоўваецца фінан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

савы механізм, які ў агульнаэканамічным разуменні ўяўляе сабой сукупнасць метадаў і формаў, інструментаў уздзеяння на эканамічнае і сацыяльнае развіццё грамадства ў працэсе здзяйснення размеркавання і пераразмеркавання фінансавых адносін [7].

Функцыянаванне фінансавага механізма бібліятэкі адбываецца ў працэсе фарміравання, размеркавання і выкарыстання фондаў грашовых сродкаў. Ён з'яўляецца складаючай часткай больш развітога гаспадарчага механізма бібліятэчнай дзейнасці. Фінансавы механізм забяспечвае рух фінансавых сродкаў і выконвае функцыі фінансавага забеспячэння і фінансавага размеркавання. Вызначаюцца крытэрыі выбару прыярытэтных кірункаў фінансавання, іх сацыяльна-эканамічная эфектыўнасць і накіраванасць; мадэлі рэсурснага забеспячэння; падыходы да арганізацыі інавацыйнага развіцця бібліятэчнай вытворчасці, забеспячэння яе дзяржаўнай падтрымкай і прыватнымі інвестыцыямі; умовы сеткавага ўзаемадзеяння бібліятэчных устаноў на тэрыторыі Беларусі і з замежнымі бібліятэчна-інфармацыйнымі цэнтрамі.

Фінансавы механізм, які дзейнічае ў галіне сацыяльна-культурнага абслугоўвання, вызначаецца спалучэннем бюджэтнага фінансавання з развіццём платных паслуг. Характэрна выдаткоўванне бюджэтных сродкаў па пэўных артыкулах каштарысу бібліятэчнай установы. Спецыялісты падкрэсліваюць неабходнасць пераходу да фінансавання згодна нарматывам, якія павінны комплексна адлюстроўваць мэтавую накіраванасць дзейнасці азначаных устаноў, але з умовай зберажэння бюджэтнага фінансавання пэўных артыкулаў каштарысу [2; 6; 9].

Фінансаванне бібліятэкі – базавы элемент яе гаспадарчага механізма, у выніку функцыянавання якога забяспечваюцца грашовымі сродкамі патрэбы простага або пашыранага ўзнаўлення бібліятэчных прадуктаў і паслуг. Па кірунках размеркавання сродкаў яно можа быць бягучым і інвестыцыйным. Па крыніцах атрымання грашовых сродкаў вылучаюць бюджэтнае (дзяржаўнае) і пазабюджэтнае фінансаванне, а таксама самафінансаванне [1]. Грашовыя сродкі, атрыманыя з розных крыніц, утвараюць фонд фінансавых сродкаў. Апошнія выкарыстоўваюцца на патрэбы бібліятэкі (заработная плата, фонды эканамічнага стымулявання, разлікі з іншымі арганіза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыямі) і забеспячэнне разгалінаванай сістэмы бібліятэчнай вытворчасці. Фінансавыя рэсурсы ўключаюць амартызацыйныя адлічэнні, працаёмкасць, фондаёмістасць, прыбытак ад гаспадарчай дзейнасці.

Асобнымі напрамкамі размеркавання фінансавых рэсурсаў з'яўляюцца ведамасна-галіновая прыналежнасць бібліятэк і бібліятэчных сістэм, іх статус (дзяржаўныя установы, установы культуры), артыкулы каштарысу бібліятэкі. У якасці кірунку размеркавання фінансавых рэсурсаў вылучаюцца рэнтныя адносіны – прыбытак ад давання на правах арэнды бібліятэчнай маёмасці і выплата адпаведных (рэнтных) плацяжоў у дзяржаўны бюджэт [3].

Выкарыстанне фінансавых рэсурсаў неабходна разглядаць у сукупнасці з планаваннем бюджэту працоўнага часу бібліятэкі, што дазваляе рэальна вызначыць аб'ёмы бібліятэчнай вытворчасці і рацыянальна размеркаваць работу паміж структурнымі адзінкамі і асобнымі спецыялістамі. Ва ўмовах фінансава-гаспадарчай дзейнасці бюджэт працоўнага часу дазваляе правамерна налічваць надбаўкі і даплаты за выкананую работу.

Фонд працоўнага часу – гэта колькасць працоўных дзён бібліятэкі, структурнай адзінкі, асобнага супрацоўніка за год, якая вылічваецца з агульнай колькасці дзён у годзе за выключэннем выхадных і святочных дзён, перыяду часовай непрацаздольнасці (хваробы) і пералічваецца ў колькасць працоўных гадзін за год. Расход працоўнага часу вылічваецца як па кожным відзе бібліятэчных работ, так і па бібліятэцы, структурным падраздзяленні, асобным выканаўцы на аснове нормаў бібліятэчнай працы [8].

На забеспячэнне эканамічнай эфектыўнасці работы, ажыццяўленне аналізу і кантролю за рацыянальным выкарыстаннем бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў накіравана работа планава-эканамічных (адміністрацыйна-гаспадарчых) аддзелаў бібліятэк. Сярод функцый азначаных аддзелаў вылучаюцца:

– планаванне бюджэту бібліятэкі;

– падрыхтоўка праектаў каштарысу даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў;

– распрацоўка і перагляд цэн на паслугі і прадукты бібліятэчнай вытворчасці;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміраванне штатнага раскладу бібліятэкі;
– распрацоўка і зацвярджэнне штатнага раскладу па пазабюджэтнай дзейнасці бібліятэкі;
– складанне тарыфікацыйных ведамасцей для налічэння заработнай платы, даплат і надбавак;
– аналіз і кантроль за выкананнем каштарысу бюджэтных асігнаванняў;
– разлік арэнднай платы згодна дагавора арэнды;
– ажыццяўленне нарміравання выдаткаў і распрацоўка нормаў у мэтах эканамічага планавання;
– аказанне кансультацыйных паслуг падраздзяленням і кіраўнікам бібліятэкі па планаванні і эканамічнай дзейнасці і інш. [5].

Фінансавае забеспячэнне бібліятэчна-інфармацыйных устаноў павінна адпавядаць дзяржаўным мінімальным стандартам. Да дзяржаўных мінімальных стандартаў у сферы культуры адносяцца пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія аказваюць дзяржаўныя ўстановы культуры; нормы і нарматывы забяспечанасці насельніцтва дзяржаўнымі ўстановамі культуры, што аказваюць бясплатныя і агульнадаступныя сацыяльныя паслугі [4]. Сацыяльным стандартам адпавядаюць затраты на бібліятэчнае абслугоўванне ў разліку на аднаго жыхара. Эканамічны аспект будзе вызначацца суадносінамі вынікаў работы бібліятэк і рэсурсаў, затрачаных на іх атрыманне.

У дзейнасці бібліятэк актуальнай формай фінансавання становіцца прыцягненне пазабюджэтных рэсурсаў. Гэта можа адбывацца праз выкарыстанне тэхналогіі фандрэйзінгу, ажыццяўленне платнага бібліятэчнага абслугоўвання і іншыя кірункі рэалізацыйнай і нерэалізацыйнай гаспадарчай дзейнасці. Больш хуткаму развіццю сістэмы пазабюджэтнага фінансавання галіны будуць садзейнічаць мэтавыя нарматыўныя акты, налогавыя прэферэнцыі, выкарыстанне практыка арыентаваных формаў і метадаў бібліятэчнай вытворчасці.

Інвестыцыйныя магчымасці бібліятэк пашыраюць мэтавыя нарматывы фінансавання. Іх асноўнае прызначэнне ў аптымізацыі бібліятэчнай вытворчасці, рацыяналізацыі відаў бібліятэчнай працы, удасканаленні тэхналагічных працэсаў і аперацый па прынцыпе эканоміі рэсурсаў і іх дакладнага размеркавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ажыццяўленне фінансаванай дзейнасці немагчыма без яе суправаджэння фінансавай дакументацыяй. Да яе адносяцца каштарыс, бізнес-план, дагаворы, кантракты, фінансавыя планы, акты і рахункі набыцця і спісання маёмасці. Гэтыя дакументы садзейнічаюць эканамічнаму абгрунтаванню гаспадарчай дзейнасці, фінансавых паказчыкаў, руху грашовых сродкаў, фінансавай справаздачнасці, распрацоўцы стратэгіі платнага абслугоўвання карыстальнікаў, аналізу заказанай бібліятэчнай прадукцыі і прыбытку ад рэалізацыі платных паслуг, падрыхтоўцы структуры і штатнай колькасці, разліку заработнай платы, ажыццяўленню камунальных плацяжоў і г.д.

Фінансаванне дзейнасці бібліятэчных устаноў забяспечвае перадумовы арганізацыі бібліятэчнай вытворчасці, спрыяе развіццю сацыяльна-эканамічных адносін бібліятэк на ўнутраным і знешнім узроўнях. Асноўным прызначэннем фінансавага механізма бібліятэк з'яўляецца фарміраванне фонду грашовых сродкаў і іх правільнага размеркавання згодна каштарысу.

### *Пытанні і заданні*

1. У чым сутнасць фінансавага механізма бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці?

2. Дайце азначэнне тэрміна "фінансаванне бібліятэкі".

3. Ахарактарызуйце ўзаемазалежнасць развіцця гаспадарчай дзейнасці ад фонду працоўнага часу бібліятэкі.

4. Пералічыце асноўныя функцыі планава-эканамічнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

### *Літаратура*

1. *Библиотечное* дело: терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – С. 127 – 128.

2. *Горшков, Ю.А.* Политэкономический анализ финансирования библиотечно-информационной деятельности / Ю.А.Горшков // Библиотечное дело – XXI век. – 2004. – № 1 (7). – С. 30 – 43.

3. *Клюев, В.К.* Хозяйственная практика библиотеки: комплексный подход // Библиография – 2003. – № 2. – С. 17 – 23.

4. *О государственных* минимальных стандартах в Республике Беларусь: закон Республики Беларусь от 1.12.1999 г. //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – № 89, 2/97.

5. *Планово-экономический* отдел [Электронный ресурс] // Структура Национальной библиотеки Беларуси. – Электрон. текст. дан. – [Мн.: НББ], 2007. – Режим доступа: http.: //www. portal.nlb.by/portal/page/portal/index/content?Lang. – Дата доступа: 17.11.2007. – Загл. с экрана.

6. *Смирнова, Н.А.* И каковы же они, эти нормативы? / Н.А.Смирнова // Библиотека. – 2000. – № 6. – С. 57 – 60.

7. *Теория* финансов: учеб. пособие / Н.Е.Заяц [и др.]. – Мн.: Вышэйш. шк., 1997. – С. 34 – 41, 142 – 148.

8. *Управление* библиотекой: учеб.-практ. пособие / А.С.Аверьянов [и др.]. – СПб.: Профессия, 2002. – С. 118 – 124, 125 – 141.

9. *Фенелонов, Е.А.* Как по-умному распорядиться деньгами: ещё раз о проблемах развития библиотек на селе / Е.А.Фенелонов // Библиотека. – 2003. – № 7. – С. 6 – 9.

## Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк

Фінансавыя сродкі з’яўляюцца асновай функцыянавання і развіцця бібліятэчных устаноў. Іх фарміраванне і рацыянальнае выкарыстанне з’яўляюцца важнейшымі функцыямі фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк. Арганізацыя планамернага паступлення бюджэтных і іншых сродкаў на ўтрыманне бібліятэк і іх аб’яднанняў ёсць фінансаванне бібліятэчнай справы.

Фінансавыя рэсурсы бібліятэкі ўяўляюць сабой сукупнасць усіх відаў паступленняў і назапашаных грашовых сродкаў. Іх прызначэнне – аднаўленне матэрыяльных і працоўных рэсурсаў з мэтай бесперапыннасці і аднаўляльнасці бібліятэчнага працэсу.

Фінансаванне бібліятэк Рэспублікі Беларусь здзяйсняецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам у галіне [1; 5]. Зыходзячы з адпаведных палажэнняў нарматыўных актаў магчыма вылучэнне сродкаў заснавальнікаў і дадатковых сродкаў. У адпаведнасці з нормамі права бібліятэкі могуць стварацца на аснове як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці [1, арт. 10], а іх заснавальнікамі могуць быць дзяржаўныя органы, а таксама фізічныя і юрыдычныя асобы, якія і забяспечваюць фінансаванне [1, арт. 12]. Такім чынам, у якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыніц фінансавання могуць разглядацца бюджэты рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, установ недзяржаўнай формы ўласнасці, грамадскіх аб'яднанняў, фізічных асоб.

Асноўнымі крыніцамі фінансавання дзяржаўных бібліятэк з'яўляюцца сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Прыватныя бібліятэкі фінансуюцца за кошт сродкаў заснавальнікаў і з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам. За кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ажыццяўляюцца фінансаванне распрацоўкі і рэалізацыі праграм развіцця бібліятэчнай справы, будаўніцтва і рэканструкцыя бібліятэчных будынкаў, памяшканняў, а таксама камплектаванне бібліятэчных фондаў дзяржаўных бібліятэк. Дадатковае фінансаванне бібліятэк можа ажыццяўляцца за кошт грашовых сродкаў фізічных і юрыдычных асоб, у тым ліку замежных, за кошт грамадскіх сродкаў, атрыманых ад аказання платных паслуг і іншай прадпрымальніцкай дзейнасці, дабрачынных паступленняў і з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам. Памер грашовых сродкаў, якія паступаюць з дадатковых крыніц фінансавання, не абмяжоўваецца. Гэтыя сродкі не могуць быць зняты з выкарыстання на канец бюджэтнага года, не ўлічваюцца пры вызначэнні аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання на наступны год і павінны накіроўвацца на ажыццяўленне статутнай дзейнасці бібліятэкі [1, арт. 17].

Законам "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" таксама прадугледжана матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне бібліятэк (арт.18); вылучаны ўмовы сацыяльнага страхавання і пенсіённага забеспячэння бібліятэчных работнікаў (арт. 13); прапісаны магчымасці распараджэння даходамі ад прадпрымальніцкай дзейнасці (арт. 21). Ён жа акцэнтуе ўвагу на фінансаванні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Так, Нацыянальная бібліятэка Беларусі фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а таксама за кошт сродкаў, прадугледжаных названым законам. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці паступаюць у самастойнае распараджэнне бібліятэкі і ўлічваюцца на асобным балансе (арт. 23). У 2006 г. бюджэтныя асігнаванні дзейнасці НББ склалі 9925, 2 млн. бел. руб., а пазабюджэтныя даходы – 206, 1 млн. бел. руб. [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На ўтрыманні бюджэтаў ведамасна-галіновага ўзроўню знаходзяцца медыцынскія бібліятэкі, бібліятэкі ў вайсковых частках, бібліятэкі навучальных установ, бібліятэкі, якія належаць Міністэрству унутраных спраў краіны і інш. Такія бібліятэкі не з'яўляюцца самастойнымі, а ўмовы іх фінансавання вызначаюцца дзеючым заканадаўствам у асобе заснавальніка. Напрыклад, фінансаванне школьнай бібліятэкі здзяйсняецца за кошт дзяржаўнага, мясцовага і папячыцельскага бюджэтаў. Камплектаванне фонду вучэбнай літаратуры ажыццяўляецца праз фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту, а камплектаванне асноўнага фонду і фонду падпісных выданняў за кошт мясцовага і папячыцельскага бюджэтаў. Гэтыя бібліятэкі ажыццяўляюць толькі аперацыйныя расходы: набыццё ўсіх відаў дакументаў, абсталявання, размнажальнай і камп'ютэрнай тэхнікі, правядзенне масавых мерапрыемстваў і г.д. Звесткі аб каштоўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі знаходзяцца ў бухгалтэрыі арганізацыі-заснавальніка, і бібліятэкары павінны сістэматычна звяраць колькасныя і каштоўнасныя параметры, адлюстраваныя ў кнізе сумарнага ўліку, з данымі ў бухгалтэрыі.

Бібліятэчныя ўстановы выкарыстоўваюць дадатковыя крыніцы фінансавання, займаюцца пазабюджэтнай дзейнасцю. Як сведчыць вопыт работы бібліятэк, пазабюджэтнымі крыніцамі фінансавання часцей за ўсё з'яўляюцца аказанне платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг, выдавецкія і паліграфічныя работы, навукова-інфармацыйныя работы па дагаворах, здача памяшканняў у арэнду. Так, даходы, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкі ў 2006 г. размеркаваліся наступным чынам: 49,2% – навукова-інфармацыйныя работы па дагаворах; 23,3% – выдавецкія паслугі; 14,6% – платныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі; 8,7% – арэнда бібліятэчных памяшканняў; 4,2% – гуманітарная дапамога [6]. У структуры пазабюджэтных сродкаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі платныя паслугі складаюць 48,9%: 25,7% – выдача чытацкіх білетаў; 9,9% – паслугі фізкультурна-аздараўленчага комплексу; 7,9% – арэнда; 4,6% – рэалізацыя выдавецкай прадукцыі [4].

Ажыццяўленне фандрэйзінгу з'яўляецца актуальным напрамкам бібліятэчнай работы. Бібліятэчны фандрэйзінг можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быць вызначаны як працэс выяўлення, збору і акумуліраванне фінансавых рэсурсаў шляхам выкарыстання спецыяльных метадаў, прыёмаў і мерапрыемстваў з мэтай стварэння і ўкаранення грамадска значных бібліятэчных праектаў і праграм. У сістэме бібліятэчнага фандрэйзінгу вылучаюцца сацыяльнае партнёрства, бібліятэчнае праектаванне і праграміраванне, дабрачыннасць. Фінансаванне сродкамі дабрачыннай дапамогі можа ажыццяўляцца па лініі спонсарства, мецэнатства, удзелу ў конкурсах грантаў, патранату. Асновай бібліятэчнага фандрэйзінгу з’яўляецца праект ці праграма, дзе бібліятэка абгрунтоўвае неабходнасць аказання фінансавай дапамогі і прапануе шляхі ўзаемадзеяння з інвестарамі і карыстальнікамі.

Закон “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь” [5] дазваляе бібліятэчным установам знаходзіцца ў сегменце дабрачыннай і спонсарскай дапамогі, а таксама спрыяе арганізацыі мэтавай дзейнасці па атрыманні пазабюджэтных фінансавых сродкаў. Закон прадугледжвае пытанні распрацоўкі і зацвярджэння дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, вызначае іх асаблівасці, узроўні распрацоўкі, тэрміны выканання і іншыя пытанні.

У практыцы фінансавання бібліятэк спецыялісты вылучаюць некалькі прынцыпаў. Астаткавы прынцып фінансавання бібліятэк прадугледжвае выдзяленне асігнаванняў на развіццё бібліятэк у памеры астатку бюджэтных расходаў пасля задавальнення патрэб іншых прэтэндэнтаў. Ю.Гаршкоў заначае, што паняцце “астаткавае фінансаванне” суадносіцца з тэрмінам “недафінансаванне”. Апошняе ўключае бюджэтныя асігнаванні ніжэй патэнцыяльных магчымасцей, якімі валодае ўласнік фінансавых рэсурсаў. Гэты прынцып фінансавання вядомы з савецкіх часоў. Ён не замацаваны прававымі нормамі, але пры састаўленні бюджэту ўлічваецца невытворчы характар паслуг бібліятэчнай сферы [3].

Пры затратным прынцыпе фінансавання крытэрыем эфектыўнасці выкарыстання сродкаў з’яўляецца іх расход за бягучы год. Да ўліку не прымаюцца канечны вынік, сабекошт бібліятэчна-інфармацыйнай паслугі, затраты на вытворчасць. Памер сумы, якая выдаткоўваецца бібліятэцы на будучы год, залежыць ад мінулагодніх расходаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сецявы прынцып фінансавання прадугледжвае размеркаванне сродкаў у залежнасці ад сярэднестатыстычнага каштарысу бібліятэкі пэўнага рэгіёну. Гэта сведчыць аб тым, што ў раёнах з больш разгалінаванай бібліятэчнай сеткай узровень фінансавання вышэйшы. На гэту асаблівасць звярнуў увагу Я.Фенялонаў. Ён лічыць недапушчальным такое размеркаванне рэсурсаў і прапаноўвае ў якасці альтэрнатывы праграмна-мэтавы спосаб фінансавання бібліятэк [7].

Праграмна-мэтавы спосаб фінансавання бібліятэк заснаваны на распрацоўцы мэтавых праграм і праектаў, у якіх абгрунтоўваецца сума неабходных выдаткаў па кожным кірунку бібліятэчнай работы і артыкуле каштарысу. Гэтыя праграмы і праекты могуць фінансавацца на розных узроўнях (міжнародным, рэспубліканскім, рэгіянальным і інш.). Іх вынікі даводзяцца да ведама тых структур, якія іх фінансавалі. Пры рабоце з выкарыстаннем названага прынцыпу ў бібліятэках трэба распрацоўваць спецыяльны механізм рэалізацыі праектаў і праграм.

Нарматыўны прынцып будуецца на аснове кантрольных лічбаў і стабільных доўгатэрміновых нарматываў. Першыя ўстанаўліваюцца з улікам асаблівасцей рэгіёну і спецыфікі бібліятэчнай работы. Другія фарміруюцца з нарматыва бюджэтнага фінансавання, які размяркоўваецца паміж фондам заработнай платы і фондам вытворчага і сацыяльнага развіцця. Я.Фенялонаў лічыць, што існуе неабходнасць распрацоўкі сацыяльных нарматываў бібліятэчнага абслугоўвання і фінансавання бібліятэк.

У дачыненні да крыніц фінансавання трэба вылучыць кірунак самафінансавання бібліятэк. Самафінансаванне – забеспячэнне вытворчасці і распаўсюджання платнай прадукцыі і паслуг за кошт уласнага прыбытку, які атрымоўваецца ў выніку іх рэалізацыі спажыўцам [2]. У практыцы работы бібліятэк яно выкарыстоўваецца абмежавана. З пункту гледжання практычнай абгрунтаванасці самафінансаванне бібліятэчнай работы не набыло належнага стану.

Фінансаванне бібліятэчнай галіны і асобных бібліятэк мае асноўныя і дадатковыя крыніцы. Іх выкарыстанне рэгулюецца дзеючымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі відамі бюджэтнага фінансавання бібліятэк з’яўляюцца рэспубліканскі і мясцовы. Сярод крыніц паза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бюджэтнага фінансвання вылучаюцца платныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі, дагаворная дзейнасць, гуманітарная дапамога. Узрастае роля прыцягнення фінансавых сродкаў ад дабрачынных арганізацый, мецэнатаў, спонсараў. У сучасны момант вядомы астаткавы, затратны, сецявы, нарматыўны і праграмна-мэтавы прынцыпы фінансавання бібліятэк. Гэтыя прынцыпы характэрны для фінансавання бібліятэк розных тыпаў і відаў на пэўных этапах развіцця грамадства.

### ***Пытанні і заданні***

1. Якія прынцыпы фінансавання бібліятэк вам вядомы?
2. Якімі заканадаўчымі актамі рэгулюецца фінансаванне бібліятэчных устаноў у Рэспубліцы Беларусь?
3. За кошт якіх сродкаў ажыццяўляюцца будаўніцтва і рэканструкцыя бібліятэчных будынкаў?
4. Што значыць тэрмін "недафінансаванне" ў адносінах да бібліятэк?

### ***Літаратура***


1. *Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у закон Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь": закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2002г., № 147-З // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. – № 128, 2/896.
2. *Библиотечное* дело: терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – С. 105.
3. *Горшков, Ю.А.* Введение в политэкономию библиотечно-информационной деятельности: монография / Ю.А.Горшков. – М.: Пашков дом, 2004. – С. 11 – 20.
4. *Национальная* библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития / НББ; науч. рук. Р.С.Мотульский. – Мн., 2007. – С. 268–269.
5. *О культуре* в Республике Беларусь: закон Республики Беларусь, 4 июня 1991 г., № 832-XII (с изм. и доп. от 14.05.2001) // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – № 48. – 2/759.
6. *Сороко, В.* Организация внебюджетной деятельности Республиканской научной медицинской библиотеки / В.Сороко, В.Шутова // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 4. – С. 9 – 11.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Фенелонов, Е.А.* Как по-умному распорядиться деньгами: ещё раз о проблемах развития библиотек на селе / Е.А.Фенелонов // Библиотека. – 2003. – № 7. – С. 6 – 9.

## Адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі

Рынкавыя адносіны і недахоп бюджэтнага фінансавання патрабуюць пашырэння арганізацыйна-эканамічнай самастойнасці бібліятэк. Асноўнымі аспектамі яе праяўлення з'яўляюцца сістэма пазабюджэтнай дзейнасці, выкарыстанне гаспадарчых формаў і метадаў работы, развіццё пэўных вытворчых бібліятэчных працэсаў і аперацый, сацыяльна-эканамічнае ўзаемадзеянне з карыстальнікамі. Пераход на новыя ўмовы гаспадарання забяспечвае бібліятэчныя ўстановы сучаснымі механізмамі фінансавання і размеркавання сродкаў, арганізацыі і аплаты працы; метадамі кіравання; сістэмай выніковай ацэнкі бібліятэчнай работы.

Новыя ўмовы гаспадарання вызначаюць пэўную самастойнасць бібліятэк па пытаннях фарміравання фінансавых сродкаў – бюджэту бібліятэкі і мадэляў размеркавання сукупных грашовых сродкаў. Бюджэт бібліятэкі ўяўляе сабой фінансавы план (каштарыс) даходаў і расходаў на вызначаны перыяд, як правіла за год. Даходная частка бюджэту бібліятэкі складаецца з паступленняў з дзяржаўнага бюджэту (рэспубліканскага, рэгіянальнага, мясцовага), адлічэнняў ведамстваў і іншых заснавальнікаў, а таксама пазабюджэтных сродкаў. Расходнай часткай бюджэту прадугледжваюцца выплата заработнай платы, пакрыццё матэрыяльных і прыраўнаваных да іх выдаткаў, разлікі з іншымі арганізацыямі [1].

Пры фарміраванні каштарысу бібліятэкі звяртаецца ўвага на выкананне планавых паказчыкаў бюджэтнага і пазабюджэтнага фінансавання ў складзе сукупнага бюджэту бібліятэкі за мінулы перыяд, крыніцы фарміравання пазабюджэтнай часткі даходаў і іх размеркаванне, сістэматычнасць паступлення ахвяраванняў на дабрачынныя рахункі. Акрамя таго, уліку падлягаюць асаблівасці патрэб і выкарыстання рэсурсаў, суадносіны бюджэтных асігнаванняў і пазабюджэтны прыбытак, прыярытэтныя кірункі арганізацыі фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фінансаванне згодна каштарысу забяспечвае ўтрыманне будынкаў, сучасны ўзровень фарміравання інфармацыйных рэсурсаў і бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, у тым ліку праз лакальныя і глабальныя камп'ютэрныя сеткі, аплату працы бібліятэчнага персаналу, абслугоўванне інжынернага абсталявання.

Каштарыс мае структуру ў выглядзе раздзелаў, параграфаў і артыкулаў. Бюджэтнае фінансаванне ажыццяўляецца згодна асноўным кірункам бібліятэчнай дзейнасці і адлюстроўваецца ў артыкулах "Налічэнні на заработную плату", "Набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў", "Камандзіровачныя і службовыя раз'езды", "Аплата транспартных паслуг", "Аплата паслуг сувязі", "Капітальныя расходы", "Іншыя бягучыя расходы", "Набыццё літаратуры і іншых матэрыялаў".

Існуе некалькі спосабаў размеркавання фінансавых сродкаў бібліятэкі. Па-першае, гэта стварэнне адзінага фонду фінансавых сродкаў. Ён можа быць створаны ў бібліятэцы пры ўмове, што яе гаспадарчая дзейнасць пабудавана згодна зацверджаным заснавальнікам ці вышэйшым органам нарматывам утварэння ўнутрыбібліятэчных фінансавых фондаў. Па-другое, гэта вылучэнне груп пастаянных і непастаянных выдаткаў бібліятэчнай работы.

Склад груп пастаянных і непастаянных выдаткаў фарміруецца з улікам асаблівасцей сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, пры якой састаўляецца каштарыс (устаноўленых нарматываў фінансавання бібліятэкі, узроўню бюджэту, сродкаў для аплаты працы бібліятэчных спецыялістаў, на набыццё матэрыяльных каштоўнасцей, вытворчасць бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг) і вызначаецца найбольш тыповай структурай. Рэкамендуецца наступная структура фінансавых выдаткаў бібліятэкі [5]:

– выдаткі на персанал, у якія ўваходзяць фонд заработнай платы, сацыяльнае страхаванне, пенсіённыя ўзносы, прэміі, аплата адпачынку;

– выдаткі на забеспячэнне функцыянавання інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку на іх камплектаванне, рэстаўрацыю, алічбоўку, апрацоўку з дапамогай хімічных прэпаратаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выдаткі на аўтаматызацыю бібліятэк (набыццё абсталявання, забеспячэнне яго функцыянавання, рамонт, стварэнне ці закупку праграмнага і сеткавага забеспячэння);

– аператыўныя выдаткі складаюць расходы на ўтрыманне і ахову памяшканняў, ацяпленне, электраэнергію і інш.;

– адміністрацыйныя выдаткі (канцылярскія прылады, расходныя матэрыялы, аплата паслуг сувязі, транспарту, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі персаналу, членскія ўзносы, агульныя і адміністрацыйныя накладныя расходы);

– выдаткі на паслугі, якія аказваюцца карыстальнікам (утрыманне чытацкай зоны, паслугі міжбібліятэчнага – МБА і міжнароднага міжбібліятэчнага абанемента – ММБА, электроннай дастаўкі дакументаў – ЭДД, доступ да інфармацыйных і даведачных службаў, абсталяванне).

Адзіны фонд фінансавых сродкаў уяўляе сабой сукупны прыбытак, які атрымоўвае бібліятэчна-інфармацыйная ўстанова за пэўны перыяд часу пры выкарыстанні гаспадарчых механізмаў функцыянавання. Яго састаўнымі часткамі з'яўляюцца фонд заработнай платы (адзіны фонд аплаты працы), фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця, фонд матэрыяльнага заахвочвання, фонд валютных паступленняў.

Структуру адзінага фонду фінансавых сродкаў мэтазгодна разглядаць пры дапамозе змястоўнай мадэлі, якая ўключае тры стабільныя эканамічныя нарматывы: нарматыў бюджэтнага фінансавання, нарматыў фонду заработнай платы, нарматыў фонду вытворчага і сацыяльнага развіцця [3]. Гэтыя нарматывы вылічаюцца заходзячы з планавых паказчыкаў, якія вызначаюцца бібліятэкамі самастойна з улікам існуючых тэхналогій і рэсурснай забяспечанасці.

Пры вызначэнні нарматыва бюджэтнага фінансавання выкарыстоўваюцца паказчыкі колькасці чытачоў і кнігавыдач. Для вызначэння нарматыва фонду заработнай платы вывучаюцца вытворчыя праграмы бібліятэкі, працаёмкасць выканання тэхналагічных працэсаў і аперацый, колькасць штатных супрацоўнікаў і аб'ём заработнай платы. Нарматыў фарміравання фонду вытворчага і сацыяльнага развіцця складаецца ў залежнасці ад памераў прыбытку, які ёсць на канец года і расходуецца па адпаведным каштарысе.

Нарматывы стварэння азначаных фондаў з'яўляюцца зыходнымі пры размеркаванні адзінага фонду фінансавых срод-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў бібліятэкі. Існуе некалькі спосабаў размеркавання. Пры першым спосабе штомесячна разлічваецца фонд заработнай платы згодна нарматыву ад фактычнай сумы даходаў. Выдаткоўваюцца матэрыяльныя выдаткі, здзяйсняюцца разлікі з іншымі арганізацыямі. Астаткавы прыбытак паступае ў распараджэнне працоўнага калектыву. З яго фарміруюцца фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця і фонд матэрыяльнага заахвочвання.

Другі спосаб размеркавання адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі прадугледжвае матэрыяльныя выдаткі і разлікі з пэўнымі арганізацыямі з агульнага даходу. Астатак агульнага даходу ўтварае фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця і фонд аплаты працы [10].

Да ліку выдаткаў фонду заработнай платы адносяцца расходы на аплату працы работнікаў у адпаведнасці са штатным раскладам, зацверджаным дырэктарам; выплата надбавак, даплат, расходаў на адпачынак, кампенсацый, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам; расходы на аплату працы пазаштатных супрацоўнікаў згодна ўстаноўленым тарыфным стаўкам і расцэнкам ці на дагаворных умовах [3].

Увогуле заработная плата работнікаў культуры залежыць ад стажу работы па спецыяльнасці (у галіне), узроўню кваліфікацыі, складанасці выконваемай работы, пасады, стаўкі першага разраду. Заработная плата вызначаецца з улікам памеру тарыфнай стаўкі (акладу), выплат стымулюючага і кампенсацыйнага характару (пашырэнне тарыфных ставак, надбавак, прэмій). Тарыфныя стаўкі (аклады) з'яўляюцца базавымі для разліку заработнай платы супрацоўнікаў. Яны вызначаюцца шляхам памнажэння тарыфнай стаўкі першага разраду, якая ўстанаўліваецца Саветам міністраў Рэспублікі Беларусь, на тарыфныя каэфіцыенты Адзінай тарыфнай сеткі з улікам кафіцыентаў за складанасць выкананых работ, вытворчасці.

Аплата працы ў публічных бібліятэках разгледжана Н.Магілевер [9]. Яна адзначае, што асновай аплаты працы з'яўляецца пагадзінная форма аплаты, пры якой заработная плата вылічваецца за фактычна адпрацаваны час, зыходзячы з тарыфнай стаўкі.

Заработак супрацоўнікаў бібліятэк складаецца з тарыфнай і надтарыфнай частак. Першая частка заработку аплачваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыялісту адпаведна яго пасадзе паводле штатнага раскладу і ў адпаведнасці са службовай інструкцыяй, дзе вызначаны яго асноўныя функцыі і абавязкі. Другая частка заработку складаецца з даплат за індывідуальную эфектыўнасць працы і даплат за эфектыўнасць і якасць работы ўсяго калектыву. Такім чынам, тарыфная частка заработку гарантуе абавязковы мінімум аплаты на пэўным рабочым месцы. Надтарыфная частка выконвае функцыі элемента эканамічнага механізма, які дазваляе кіраваць дзейнасцю калектыву і ацэньваць прафесійную кампетэнтнасць спецыялістаў.

Згодна адзінай тарыфнай сетцы бібліятэкары і бібліёграфы тарыфікуюцца па 10 – 15 разрадах, а кіраўнікі бібліятэк – па 14 –19 разрадах. Прыналежнасць да пэўнага разраду вызначаецца ў адпаведнасці з Кваліфікацыйным даведнікам пасад служачых, занятых у культуры і мастацтве, зацверджаным пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь 29 снежня 2001 г. № 25. Умовы аплаты працы супрацоўнікаў арганізацый культуры і мастацтва устаноўлены пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь 21 студзеня 2000 г. № 6 [8]. Згодна гэтаму дакументу на прэміраванне супрацоўнікаў арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва з бюджэту вылучаюцца сродкі ў памеры 20% планавага фонду заработнай платы і эканоміі сродкаў на аплату працы. На аказанне матэрыяльнай дапамогі спецыялістам прадугледжваюцца сродкі ў памеры 5% планавага фонду заработнай платы штатных супрацоўнікаў.

Згодна дзеючаму заканадаўству кіраўнікі культурна-асветных устаноў у межах сродкаў на аплату працы могуць павышаць тарыфныя аклады спецыялістаў да 7%, устанаўліваць даплаты за пашырэнне зоны абслугоўвання, устанаўліваць надбаўкі асноўным групам спецыялістаў, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі (вышэйшую, першую, другую) і г.д. Таксама прадугледжана павышэнне на 20% службовых акладаў супрацоўнікаў і кіраўнікоў устаноў культуры, якія працуюць у сельскай мясцовасці [4]. Так, аклады павышаюцца кіраўнікам і спецыялістам, накіраваным на работу ў бібліятэкі, адкрытыя ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам у сельскай мясцовасці, якія ўваходзяць у склад адпаведных гарадскіх устаноў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне фонду заработнай платы залежыць і ад групы па аплаце працы, да якой адносіцца бібліятэка. Існуе чатыры групы бібліятэк па аплаце працы. Кожная з іх вызначаецца зыходзячы з колькасці фактычна абслужаных карыстальнікаў і кнігавыдач. Да першай групы адносяцца бібліятэчныя ўстановы, у якіх колькасць абслужаных карыстальнікаў звыш 40 тысяч чалавек, а кнігавыдач звыш 1 млн. экзэмпляраў. У другую групу ўваходзяць бібліятэкі з кнігавыдачай ад 600 тысяч экзэмпляраў да 1 млн. экзэмпляраў і колькасцю абслужаных карыстальнікаў ад 10 да 40 тысяч чалавек. Склад трэцяй і чацвёртай груп адпавядае 5 – 10 тысячам карыстальнікаў і 3 – 5 тысячам карыстальнікаў, а паказчыкі кнігавыдачы 300 – 600 тысячам экзэмпляраў і 180 – 300 тысячам экзэмпляраў адпаведна [7].

Фонд матэрыяльнага заахвочвання ствараецца ў бібліятэцы з мэтай павышэння выніковасці працы і матэрыяльнага стымулявання выканаўцаў. Гэты фонд утвараюць нарматыўныя адлічэнні і сродкі, якія застаюцца ад эканоміі заработнай платы, даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, спонсарская дапамога. Сродкі названага фонду размяркоўваюцца паміж супрацоўнікамі бібліятэкі па ўзгадненні адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта. Вызначаюцца памеры прэмій (месячных, квартальных, гадавых, разавых), надбавак за асабісты ўклад у бібліятэчны вытворчы працэс і якасць работы, формы арганізацыі працы (калектыўная, дагаворная) і яе аплата.

Фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця з’яўляецца крыніцай сродкаў, якія накіроўваюцца на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, набыццё абсталявання і інвентару, капітальны рамонт будынкаў і памяшканняў, жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва, сацыяльна-бытавыя патрэбы калектыву. Сродкі гэтага фонду могуць передавацца іншым арганізацыям у сувязі з правядзеннем падрадных работ, рэканструкцыяй, тэхнічным пераабсталяваннем, адпачынкавай і аздараўленчай дзейнасцю. Нявыкарыстаныя сродкі фонду не падлягаюць адабранню на канец фінансавага году і выкарыстоўваюцца далей [10].

Фонд валютных паступленняў ствараецца ў буйных бібліятэках, якія ажыццяўляюць міжнародную дзейнасць і маюць статус юрыдычнай асобы. Сродкі падобных фондаў фарміруюцца ў адпаведнасці з каштарысам і нарматыўнай да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кументацыяй і выкарыстоўваюцца згодна кірункам міжнароднага супрацоўніцтва (арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці, замежныя камандзіроўкі і стажыроўкі, камплектаванне, праектная і выставачная дзейнасць і інш.).

Фінансавыя сродкі, якія паступаюць у бібліятэку ад рэалізацыі платных паслуг і іншых відаў прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама ад ахвяравальнікаў, мецэнатаў, грантадаўцаў, не ўплываюць на ўзровень бюджэтнага фінансавання і выкарыстоўваюцца бібліятэкамі ў адпаведнасці з іх мэтавым прызначэннем. Гэта можа быць развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, сацыяльнай сферы, сістэмы абслугоўвання, арганізацыі выхаваўча-адукацыйнай і культурна-асветніцкай прасторы, прававой адукаванасці карыстальнікаў. Асноўнымі спосабамі прыцягнення сродкаў у фонд з'яўляюцца праграмна-мэтавая дзейнасць, удзел у конкурсах грантаў, PR-актыўнасць, рэклама.

Такім чынам, адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі мае комплексную структуру, якая аб'ядноўвае сродкі фондаў заработнай платы, вытворчага і сацыяльнага развіцця, матэрыяльнага заахвочвання, валютных паступленняў і пазабюджэтныя рэсурсы. Пералічаныя элементы адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі ствараюцца на аснове нарматываў фінансавання і прапарцыянальна размяркоўваюцца. Яны ўтвараюць фінансавы механізм функцыянавання бібліятэкі: разлікі па рахунках, аплата працы, камплектаванне, гаспадарчая дзейнасць і інш.; забяспечваюць ажыццяўленне тэхналагічных бібліятэчных працэсаў і аперацый праз выдаткоўванне пастаянных і непастаянных расходаў, выкананне артыкулаў каштарысу бібліятэкі.

### *Пытанні і заданні*

1. Што ўяўляе сабой бюджэт бібліятэкі? Назавіце асноўныя артыкулы каштарысу бібліятэкі.

2. Ахарактарызуйце спосабы размеркавання фінансавых сродкаў бібліятэкі.

3. Апішыце структуру адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі.

4. Патлумачце механізм аплаты працы бібліятэчных супрацоўнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. У чым асаблівасці выкарыстання сродкаў фонду вытворчага і сацыяльнага развіцця і фонду валютных паступленняў?

6. Прааналізуйце механізм аплаты працы бібліятэчных спецыялістаў у Расіі, карыстаючыся літаратурай [2; 6].

### ***Літаратура***


1. *Библиотечное* дело: терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – С. 26.

2. *Качалина, В.В.* Экономические проблемы деятельности библиотек России и других стран СНГ / В.В.Качалина // Библиотечное дело – XXI век. – 2005. – № 2 (10). – С. 58 – 61.

3. *Кожевникова, Л.А.* Библиотека в структуре базовых социально-экономических процессов территорий: монография / Л.А.Кожевникова; ГПНБТ СО РАН. – Новосибирск, 2004. – С. 29 – 36.

4. *Козловская, Л.Я.* Оплата труда работников организаций культуры и искусства, финансируемых из бюджета и пользующихся государственными дотациями / Л.Я.Козловская // Заработная плата. – 2007. – № 5. – С. 30 – 39.

5. *Куштанина, Л.И.* Экономические проблемы деятельности библиотек: терминосистема, показатели, эффективность / Л.И.Куштанина // Библиотечное дело – XXI век. – 2005. – № 2 (10). – С. 80 – 81.

6. *Новые* критерии установления групп по оплате труда руководителей и специалистов библиотек // Независимый библиотечный адвокат. – 2001. – № 2. – С. 35 – 45.

7. *О внесении* изменений в постановление Министерства труда Республики Беларусь от 21 января 2000 г. № 6: постановление М-ва труда и соц. защиты Респ. Беларусь, 26 сент. 2003 г., № 108 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2003. – № 117. – С. 9 – 72.

8. *О мерах* по совершенствованию условий оплаты труда работников организаций, финансируемых из бюджета: постановление М-ва труда Респ. Беларусь, 21 января 2000 г., № 6 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 29. – С. 3 – 175.

9. *Справочник* библиотекаря / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб., 2004. – С. 204 – 206.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Экономико-правовые* аспекты функционирования библиотеки: науч.-практ. пособие / Рос. гос. б-ка. – М., 1994. – С. 19 – 21.

## Фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы

Сучасны эканамічны падыход да дзейнасці бібліятэк садзейнічае бясплатнаму аказанню большасці бібліятэчна-інфармацыйных паслуг насельніцтву, але гэта не сведчыць аб іх бясплатнасці для грамадства ў цэлым, бібліятэчнай установы і выканаўцаў. Кошт аказання пэўных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг вызначаецца сістэмай фінансава-цэнасных паказчыкаў, якой уласцівы дынамізм. Гэта сістэма разглядаецца ва ўзаемазалежнасці ад эканамічнай эфектыўнасці бібліятэчнай работы.

Навукова-практычную работу ў сферы выяўлення і абгрунтавання сістэмы фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай дзейнасці ажыццяўлялі Л.Камушкіна, Л.Кажэўнікава, Н.Магілевер, В.Клюеў, Я.Фенялонаў. Іх падыходы да фарміравання сістэмы гэтых паказчыкаў адлюстроўваюць узровень выдаткаў і кошт бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг у бібліятэках розных тыпаў і відаў; намінальную часавую норму і заработную плату выканаўцы; дзейнасць асобных структурных падраздзяленняў бібліятэкі па ажыццяўленні пэўных працэсаў і аперацый; разлік кошту скразных тэхналагічных бібліятэчных цыклаў.

Вядомы даследаванні замежных спецыялістаў па вызначэнні кошту бібліятэчных працэсаў і аперацый [2]. У аснову фарміравання фінансава-цэнасных паказчыкаў англійскія вучоныя з Асацыяцыі спецыяльных бібліятэк і інфармацыйных бюро паклалі цэнасны аналіз. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што кожны бібліятэчны працэс вывучаецца з пазіцый дзейнаснага падыходу. Вызначаны від бібліятэчнай работы апісваецца на мове стандартнага кода на спецыяльных картах. Р.Хэйс і Дж.Бэкер у аснову вылічэння затрат паклалі бібліятэчную статыстыку. Іх методыка разліку фінансава-цэнасных паказчыкаў уключае фіксацыю бібліятэчнай аперацыі, час яе выканання, памер заработнай платы выканаўцы.

Сучасная сістэма фінансава-цэнаснай ацэнкі дзейнасці бібліятэк грунтуецца на функцыянальным (тэхнічным), са-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыяльным і эканамічным падыходах. Функцыянальны, ці тэхнічны, падыход накіраваны на вывучэнне выніковасці выканання асноўных функцый бібліятэчнай сістэмы. Сацыяльны падыход вызначаецца выніковасцю задавальнення бібліятэкай духоўных запытаў і інфармацыйных патрэб розных сацыяльных груп карыстальнікаў. Пры эканамічным падыходзе вынікі бібліятэчнай дзейнасці суадносяцца з працоўнымі, матэрыяльна-тэхнічнымі і грашовымі выдаткамі на іх дасягненне. Такім чынам, у бібліятэках ёсць магчымасць выкарыстання некалькіх гаспадарчых структур. Па-першае, гэта матэрыяльныя рэсурсы, асноўныя невытворчыя і абаротныя фонды. Да іх адносяцца будынкі і памяшканні, мэбля, гаспадарчыя прылады, кнігі, каталогі, будаўнічыя матэрыялы. Па-другое, бібліятэчныя супрацоўнікі. Да іх ліку адносяцца бібліятэкары-бібліёграфы, інжынерна-тэхнічны і гаспадарчы персанал. Па-трэцяе, фінансы, якія выдаткоўваюцца на набыццё друкаваных і электронных дакументаў, заработную плату кадравага складу, абсталяванне і ўтрыманне памяшканняў.

Для ацэнкі эфектыўнасці выкарыстання гаспадарчых структур бібліятэк прадугледжана сістэма паказчыкаў. Яна сфарміравана з улікам сучасных тэндэнцый даследавання бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, а менавіта вымярэння іх эфектыўнасці, рацыянальнага выкарыстання, кіравання працэсамі вытворчасці і спажывання [1; 9]. Названая сістэма ўключае:

– агульны аб’ём работы (колькасць чытачоў, кнігавыдач, колькасць і кошт набытай за год літаратуры, колькасць праведзеных за год масавых мерапрыемстваў і інш.);

– матэрыяльную базу і асноўныя сродкі бібліятэкі і іх адпаведнасць планавым паказчыкам (памер кніжнага фонду ці фонду электронных дакументаў, кнігазабяспечанасць аднаго карыстальніка, штат і каштарыс бібліятэкі і інш.);

– нагрузку і прадукцыйнасць працы бібліятэкараў (сярэдняя колькасць часу, затрачанага на абслугоўванне аднаго карыстальніка ў дзень, за месяц, за год);

– ступень выкарыстання бібліятэчнага фонду (сярэдняя абарачальнасць адной кнігі за пэўны перыяд; сярэдняя колькасць кніг, выдадзеных аднаму чытачу, і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ступень актыўнасці чытачоў (сярэдняя колькасць наведвання бібліятэкі адным чытачом за пэўны перыяд, сярэдняя колькасць кніг, узятых адным чытачом, сярэдні аб'ём электронных рэсурсаў, што выкарыстоўваюцца);

– узровень абслугоўвання насельніцтва бібліятэкай (колькасны склад бібліятэчнай сеткі і месцазнаходжанне бібліятэк, наяўнасць бібліёбусаў, суадносіны колькасці пастаянных чытачоў бібліятэк і колькасці жыхароў пэўнай тэрыторыі, кошт утрымання бібліятэкі ў год на душу насельніцтва);

– паказчыкі культуры абслугоўвання чытачоў (плошча чытальнай залы ў квадратных метрах, якая адводзіцца на аднаго чытача, хуткасць і паўната абслугоўвання, колькасць адмоў, магчымасці карыстацца міжбібліятэчным і міжнародным міжбібліятэчным абанементам, электроннай дастаўкай дакументаў);

– стан даведачна-бібліяграфічнага апарату (прысутнасць традыцыйных і аўтаматызаваных пошукавых сістэм, якасць выканання запытаў рознага віду і інш.).

Выдзяляюцца таксама паказчыкі для ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці работы бібліятэкі. Абагульняючы існуючыя напрацоўкі [7; 8], можна вылучыць наступныя асноўныя паказчыкі:

– рабочая сіла адносна вынікаў абслугоўвання карыстальнікаў (колькасць чытачоў, наведванняў, даведак, кнігавыдач на аднаго бібліятэчнага спецыяліста, выдаткі працоўнага часу на аднаго чытача, адно наведванне, даведку, кнігавыдачу);

– рабочая сіла ў суадносінах з матэрыяльна-тэхнічнай базай (выдаткі матэрыяльных рэсурсаў на аднаго бібліятэкара, на кожную гадзіну працоўнага часу);

– матэрыяльная база адносна вынікаў абслугоўвання (выдаткі матэрыяльных сродкаў на кожную тысячу чытачоў, наведванняў, кнігавыдач, даведак);

– сабекошт абслугоўвання карыстальнікаў (аднаго чытача, наведвання, кнігавыдачы, даведкі).

Выкарыстанне названых паказчыкаў мае пэўныя складанасці. Яны абумоўлены цяжкасцямі сукупнай ацэнкі фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэкі. Так, магчымы розныя колькасныя значэнні паказчыкаў, адсутнасць адзінага пункту гледжання на вызначэнне агульнай ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці. Складаным з'яўляецца і выяўленне эканамічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнасці работы бібліятэкі ў дынаміцы і ў параўнанні з іншымі бібліятэкамі. Праблематычна таксама параўнанне фінансава-эканамічнага стану розных бібліятэчных сістэм і асобных бібліятэк і вылучэнне аптымальных характарыстык іх функцыянавання як гаспадарчых адзінак.

Для ацэнкі ўзроўню выдаткаў бібліятэкі на абслугоўванне карыстальнікаў і здзяйснення навукова і метадычна абгрунтаванага кіравання гэтымі працэсамі выкарыстоўваецца комплекс фінансава-цэнасных паказчыкаў. Галоўная якасць гэтых паказчыкаў – колькаснае выражэнне і ацэнка розных аспектаў бібліятэчнага абслугоўвання ў грашовай форме. У сістэме азначаных паказчыкаў вылучаюцца комплексныя (зводныя) і асобныя (прыватныя).

Да комплексных (зводных) фінансава-цэнасных паказчыкаў адносяцца агульная сума выдаткаў бібліятэкі, размеркаванне сродкаў па артыкулах каштарысу, кошт абслугоўвання аднаго карыстальніка, выдаткі на адно наведванне бібліятэкі і ажыццяўленне кнігавыдачы, сярэдні расход на душу насельніцтва, якое пражывае ў зоне бібліятэчнага абслугоўвання. Разлік гэтых паказчыкаў ажыццяўляецца шляхам дзялення агульнай сумы планавых выдаткаў па артыкулах каштарысу за пэўны каляндарны перыяд на агульную колькасць чытачоў бібліятэкі (агульную колькасць наведванняў, кнігавыдач) і г.д. Але гэты від паказчыкаў не адлюстроўвае амартызацыю асноўных фондаў і не ўлічвае некаторыя іншыя кірункі бібліятэчнай дзейнасці, напрыклад такія, як метадычная работа і рэкамендацыя літаратуры. У той жа час выкарыстанне комплексных (зводных) фінансава-цэнасных паказчыкаў дае магчымасць адсочвання эфектыўнасці расходавання фінансавых паступленняў і ажыццяўлення супастаўляльнага аналізу выдаткаў на бібліятэчнае абслугоўванне ў розных рэгіёнах і бібліятэчных сетках.

Асобныя (прыватныя) фінансава-цэнасныя паказчыкі па канкрэтных бібліятэчных працэсах і аперацыях разлічваюцца зыходзячы з колькаснага складу бібліятэчных супрацоўнікаў, фонду іх заработнай платы, выдаткаў сукупнага працоўнага часу. Вылічвацца могуць кошт асобных відаў бібліятэчных работ, сярэднія выдаткі на іх (на апрацоўку адной кнігі, выкананне адной даведкі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Затраты на адзінку выкананай работы вылічаюць шляхам падзелу сумы зробленых на яе выдаткаў на агульную колькасць дадзенай работы (па выніках уліку). Такім чынам разлічваюцца паказчыкі кошту такіх відаў бібліятэчнай дзейнасці, як камплектаванне, каталагізацыя, улік бібліятэчнага фонду, абслугоўванне чытачоў на абанеменце і ў чытальнай зале. У якасці самастойнага аб’екта вылічэння можа разглядацца любы працэс ці аперацыя, якія ўваходзяць ў пэўны від бібліятэчнай працы.

Зыходнымі крыніцамі вызначэння фінансава-цэнасных паказчыкаў з’яўляюцца гадавы каштарыс бібліятэкі, фінансавыя і статыстычныя справаздачы, планавыя і фактычныя колькасныя паказчыкі работы бібліятэкі. Гэтыя дакументы абумоўліваюць методыку разліку сумы выдаткаў на пэўны від бібліятэчных работ ці паслуг. Пры падліку ўлічваюцца прамыя выдаткі (заработная плата, атрыманая супрацоўнікамі за час выканання работы ці аказання паслугі; кошт каталожных картак, кніжных фармуляраў; затраты на дастаўку дакументаў з дапамогай транспарту і г.д.) і накладныя выдаткі (плата за ўтрыманне памяшканняў бібліятэкі, заработная плата кіраўнічаму і адміністрацыйна-гаспадарчаму персаналу).

Пры вызначэнні і падліку фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы выкарыстоўваюцца тэхналагічныя карты. Такая карта складаецца на кожную бібліятэчна-інфармацыйную паслугу і адлюстроўвае працоўныя затраты па наступных паказчыках: працэсы, адзінкі вымярэння, норма выпрацоўкі, выканаўца [4]. Яна дае магчымасць вызначэння памеру заработнай платы ў складзе цаны бібліятэчнага прадукту ці паслугі і адлюстроўвае матэрыяльныя выдаткі на іх выкананне.

У бібліятэчнай практыцы пры вылічэнні фінансава-цэнасных паказчыкаў выкарыстоўваецца поўны і бягучы кошт бібліятэчнай паслугі. Поўная ацэнка кошту бібліятэчнай паслугі ўтрымлівае:

– выдаткі на аплату працы бібліятэчных супрацоўнікаў (у тым ліку тэхнічнага і дапаможнага персаналу);

– бягучыя выдаткі на невытворчыя абаротныя фонды (канцтавары, электраэнэргію, бібліятэчную тэхніку);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– кошт амартызацыі асноўных невытворчых фондаў (у тым ліку кніжнага фонду, абсталявання).

Бягучы кошт бібліятэчна-інфармацыйнай паслугі ўключае паказчыкі аплаты працы і выдаткаў на невытворчыя абаротныя фонды. Амартызацыя асноўных фондаў у бягучы кошт бібліятэчнай паслугі не ўваходзіць [3].

Такім чынам, фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы ўтвараюць сістэму ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк. Іх наменклатура заснавана на функцыянальным (тэхнічным), сацыяльным і эканамічным падыходах да арганізацыі работы бібліятэк, а прызначэнне – у адлюстраванні колькасных паказчыкаў і матэрыяльных выдаткаў, якія прыпадаюць на выкананне той ці іншай бібліятэчнай паслугі і арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання ўвогуле. Вядучымі з'яўляюцца фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнага абслугоўвання, якія аб'ядноўваюцца ў дзве групы: комплексныя (зводныя) і асобныя (прыватныя). Яны цесна звязаны з сістэмай фінансавай ацэнкі агульных эканамічных паказчыкаў работы бібліятэкі і адлюстроўваюць яе эфектыўнасць.

Падлік фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы здзяйсняецца на аснове прамых і накладных выдаткаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да нарматыўнага і фактычнага выканання бібліятэчных працэсаў і аперацый, а таксама прапарцыянальнага размеркавання паміж іх выканаўцамі часавых выдаткаў і матэрыяльнага стымулявання.

Наменклатура фінансава-цэнасных паказчыкаў мяняецца ў залежнасці ад мэтавага прызначэння і задач цэнаснага аналізу. Вылічэнне цэнасных параметраў (напрыклад, арганізацыі адной кніжнай выставы, выканання адной бібліяграфічнай даведкі) спрыяе рацыянальнаму планаванню расходаў, выяўленню эканамічных рэзерваў, магчымасцей пераразмеркавання сродкаў, аналізу выдаткаў на розныя віды работ для вызначэння пераліку і кошту бібліятэчных прадуктаў і паслуг. Фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы разглядаюцца ў структуры эканамічнага аналізу бібліятэчнай дзейнасці ці пэўнага тэхналагічнага цыкла ў мэтах іх аптымізацыі і альтэрнатыўнага выбару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Пытанні і заданні*

1. У чым сутнасць фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы? Якія іх віды вы ведаеце?

2. Назавіце асноўныя падыходы да фарміравання сістэмы фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы на сучасным этапе.

3. Якія планава-фінансавыя дакументы бібліятэкі з'яўляюцца зыходнымі пры вызначэнні фінансава-цэнасных паказчыкаў?

4. Ахарактарызуйце фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы з эканамічнага і сацыяльнага пунктаў гледжання.

5. Сфармулюйце падыходы да вызначэння фінансава-цэнасных паказчыкаў работы бібліятэк, якія існавалі ў савецкі перыяд, карыстаючыся літаратурай [5; 8].

## *Літаратура*


1. *Библиотечная* эконометрика: сб. науч. тр. / Рос. нац. б-ка. – СПб., 2003. – Вып. 2 – С. 8 –15; 89 – 119.

2. *Горшков, Ю.А.* Актуальные политэкономические проблемы в зарубежном библиотековедении (аналитический обзор материалов 1990-х гг.) / Ю.А.Горшков // Библиотека в эпоху перемен: философско-культурологические и информационные аспекты: информ. сб. (Дайджест). – М.: Рос. гос. б-ка, 2001. – Вып. 2 (10). – С. 87 – 105.

3. *Горшков, Ю.А.* Введение в политэкономию библиотечно-информационной деятельности: монография / Ю.А.Горшков; Рос. гос. б-ка. – М., 2004. – С. 178 – 191.

4. *Долгополова, Е.* Технологическая карта как основа расчёта цены на библиотечно-информационные услуги / Е.Долгополова // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 1. – С. 30 – 31.

5. *Камушкина, Л.В.* Один из подходов к оценке работы массовых библиотек / Л.В.Камушкина // Советское библиотековедение. – 1985. – № 3. – С. 23 – 29.

6. *Кожевникова, Л.А.* Библиотека в структуре базовых социально-экономических процессов территорий: монография / Л.А.Кожевникова; ГПНБТ СО РАН. – Новосибирск, 2004. – С. 29 – 36.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Куликова, Л.В.* О показателях деятельности библиотек / Л.В.Куликова // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. / Рос. гос. б-ка. – М., 2002. – Вып. 3. – С. 137 – 143.

8. *Методические* рекомендации по вычислению стоимости библиотечного обслуживания и отдельных библиотечных работ в государственных библиотечных системах Министерства культуры РСФСР. – Л., 1970. – 78 с.

9. *Фенелонов, Е.А.* Критерий и показатели экономической эффективности и методика их применения в библиотечном деле: науч.-практ. пособие / Е.А.Фенелонов. – М., 2002. – С. 18 – 36.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Платныя паслугі ў сістэме фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк

Аказанне платных паслуг і прадпрымальніцкая дзейнасць з'яўляюцца кампанентамі ініцыятыўнай гаспадарчай дзейнасці бібліятэк. Платныя паслугі адносяцца да катэгорыі звышнарматыўных і патрабуюць ад бібліятэкі дадатковых фінансавых і матэрыяльных выдаткаў на іх вытворчасць і аказанне карыстальнікам. Гэты від паслуг, як і асноўныя бясплатныя, мае свой сабекошт і патрабуе пошуку ўнутраных эканамічных рэзерваў для ўтрымання сацыяльнага балансу бібліятэчнага абслугоўвання. Таму кошт платных бібліятэчных паслуг павінен быць абгрунтаваны з сацыяльна-эканамічнага пункту гледжання. Актуальнымі застаюцца пытанні аб увядзенні ільготных цэн для пэўных катэгорый карыстальнікаў; адмове ад платы за бібліятэчныя паслугі, якія не патрабуюць ад бібліятэкі дадатковых матэрыяльных, фінансавых і кадравых рэсурсаў; захаванні этычных нормаў узаемадзеяння з карыстальнікамі, канкурэнтамі і партнёрамі. Разам з тым аказанне насельніцтву платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг мае мэту прыцягнення пазабюджэтных фінансавых рэсурсаў і павышэння матэрыяльнага заахвочвання бібліятэчных супрацоўнікаў у выніках сваёй працы.

Асноўнымі кірункамі даследавання працэсаў аказання платных бібліятэчных паслуг з'яўляюцца комплекснае вывучэнне бібліятэчна-інфармацыйнага рынку і попыту на бібліятэчныя паслугі; аналіз асартыменту бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг; пытанні сегментацыі, пазіцыяніра-

вання, стымулявання і прапановы бібліятэчна-інфармацыйных паслуг карыстальнікам; вызначэнне рэсурснага забеспячэння выканання платных паслуг; распрацоўка наменклатуры і планаванне дзейнасці па рэалізацыі платных паслуг насельніцтву і юрыдычным асобам [6; 9].

У бібліятэказнаўчых даследаваннях змястоўную інтэрпрэтацыю тэрміна "бібліятэчная паслуга" прапаноўвалі Ю.Сталяроў, А.Арзуханаў, Л.Камушкіна, М.Дворкіна, С.Басаў, Л.Кажэўнікава, але адзінства ў яго трактоўцы няма. Спецыфіка бібліятэчнай паслугі (прадукту) у тым, што яе стварэнне адбываецца на базе трансфармацыі вытворчых рэсурсаў у інтэлектуальную прадукцыю. Бібліятэчная паслуга – вынік гаспадарча-арганізацыйнай дзейнасці, дзе праца бібліятэкараў па яе вырабе прымае вытворную форму.

Пытанне аб класіфікацыі платных бібліятэчных паслуг з'яўляецца дыскусійным. Увогуле класіфікацыя патрэбна для таго, каб карыстальнік меў магчымасць выбіраць патрэбныя паслугі з усёй іх разнастайнасці, а бібліятэкар прапаноўваў іх у залежнасці ад мэтавых запытаў абанента. І.Суслава прапануе выкарыстоўваць наступныя крытэрыі класіфікацыі: характар вытворцы паслугі (гэта бібліятэчныя паслугі, аказваемыя бібліятэкарам, і паслугі, аказваемыя аўтаматызаванымі сродкамі і прыладамі); прысутнасць карыстальніка ў час аказання паслугі (выдача літаратуры, удзел у масавых мерапрыемствах, камфортнасць бібліятэчных памяшканняў); матывы спажыўца бібліятэчна-інфармацыйных паслуг (індывідуальныя, калектыўныя, грамадскія); матывы вытворцы бібліятэчна-інфармацыйных паслуг могуць быць камерцыйнымі і дабрачыннымі [12]. Ю.Сталяроў вылучае бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі па змястоўнай прымеце і звяртае ўвагу на крытэрый камфортнасці і якасці спажывання паслуг дадатковага бібліятэчнага сервісу. Гэта магчымасць абанента карыстацца бібліятэчным фондам, даведачна-бібліяграфічнага апаратам, абсталяваннем, мэбляй; пошук і дастаўка неабходных дакументаў; выхаванне культуры чытання [11]. А.Арзуханаў падзяляе паслугі бібліятэчнай вытворчасці ў залежнасці ад віду (матэрыяльныя і нематэрыяльныя), формы (дакументныя і недакументныя), дыяпазону задавальнення патрэб (інфармацыйныя, этычныя, эстэтычныя), сацыяльных і эканамічных фактараў іх вытворчасці і спажывання [1]. У



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

залежнасці ад патрэб карыстальнікаў А.Басаў вылучае дакументныя, камунікатыўныя і сервісныя бібліятэчныя паслугі. Першая група аб'ядноўвае паслугі па даванні карыстальнікам першакрыніц ці бібліяграфічнай інфармацыі аб іх. Камунікатыўныя бібліятэчныя паслугі звязаны з задавальненнем патрэб у стасунках сродкамі масавай бібліятэчнай работы. Рэалізацыя дакументных і камунікатыўных паслуг немагчыма без паслуг бібліятэчнага сервісу. Прапануюцца даведачна-аналітычныя, перакладчыцкія, капіравальныя, пераплётныя, вучэбна-кансультацыйныя платныя бібліятэчныя паслугі [2].

Падыходы да цэнаўтварэння на платныя бібліятэчныя паслугі даволі грунтоўна асветлены ў прафесійным друку. Вядомы напрацоўкі Н.Магілевер [10], В.Клюева [6], І.Суславай [12], А.Далгаполавай [4], М.Мёрфі [13].

У заходняй сістэме цэнаўтварэння на платныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі галоўным фактарам з'яўляецца іх запатрабаванасць на рынку інфармацыйных паслуг. Гэта патрабуе вывучэння спосабаў арганізацыі дадзенага рынку, кан'юнктуры попыту карыстальнікаў інфармацыйных паслуг, аналізу сукупнасці знешніх і ўнутраных фактараў, якія ўплываюць на ўзровень развіцця бібліятэчнай вытворчасці. Названыя асаблівасці і даюць магчымасць вызначэння суадносін платных і бясплатных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

У айчыннай бібліятэчнай практыцы кошт платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг устанаўліваецца зыходзячы з унутраных патрэб бібліятэкі з улікам прынятай у ёй тэхналогіі вытворчасці, нормаў часу і заработнай платы выканаўцаў. Але падобная практыка цэнаўтварэння не мэтазгодна, таму што нарміраванне бібліятэчнай працы не дасканалае, а выкананне пэўных тэхналагічных працэсаў і аперацый ажыццяўляецца бібліятэчнымі спецыялістамі розных кваліфікацый. У выніку аднолькавая платная бібліятэчная паслуга будзе мець у розных бібліятэках свой кошт.

Агульная методыка разліку кошту платных паслуг складаецца з наступных этапаў: пастаноўка задач цэнаўтварэння, вызначэнне попыту, ацэнка выдаткаў, выбар метаду цэнаўтварэння, устанаўленне цаны [12]. Вядомы наступныя спосабы цэнаўтварэння:

– налічэнне пэўнай нацэнкі на сабекошт бібліятэчнай паслугі, пры гэтым памер нацэнкі залежыць ад віду паслугі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– устанаўленне цаны на ўзроўні бягучых цэн;

– разлік мэтавага прыбытку, заснаваны на аналізе бясстратнасці;

– устанаўленне цаны згодна цэннасці сваіх паслуг. Асноўным фактарам з’яўляецца ўспрыманне бібліятэчнай паслугі карыстальнікамі, якое забяспечваецца PR-сродкамі.

Найбольш дзейсным і абгрунтаваным спосабам усталявання цаны на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі з’яўляецца яе разлік на аснове тэхналагічнай карты [4]. Гэты спосаб дазваляе шматразова выкарыстоўваць тэхналагічную карту працоўных выдаткаў на пэўную бібліятэчную паслугу. Этапы выканання кожнай паслугі вызначаюцца з улікам унутраных бібліятэчных тэхналогій і арганізацыйнай структуры бібліятэкі; адзінак вымярэння; нормаў часу (тыпавых ці ўнутраных;), пасады супрацоўніка, які рыхтуе паслугу; колькасці расходных матэрыялаў (папера, тыпаграфская фарба); прамых выдаткаў (заработная плата выканаўцы паслугі, прэмія, выплаты за чарговы адпачынак і сацыяльнае страхаванне, іншыя тэхнічныя і матэрыяльныя выдаткі); накладных выдаткаў (агульнагаспадарчыя невытворчыя і кіраўніцкія расходы, аплата электраэнергіі, транспарту, сувязі і інш.).

Сабекошт паслугі выражаецца сумай заработнай платы, налічэнняў на сацыяльнае страхаванне і накладных расходаў. Гэта ніжэйшы ўзровень цаны. Прыбытак (павышаючы каэфіцыент) вызначаецца ў памеры 30% ад сабекошту паслугі. Разам з сабекоштам яны ўтвараюць каштарысную цану бібліятэчна-інфармацыйнай паслугі. Гэта цана можа быць павялічана ці паменшана ў залежнасці ад тэхналогіі вытворчасці паслугі, колькасці выканаўцаў, нормаў выпрацоўкі. У такім выпадку ідзе размова аб праектуемай цане, якая не можа быць завышана болей чым у 2 разы ў параўнанні з канчатковай цаной. Канчатковая цана фарміруецца на аснове рэальнага аб’ёму бібліятэчна-інфармацыйнай паслугі.

Вытворчасць і рэалізацыя платных бібліятэчных паслуг разглядаецца ў сэнсе катэгорый “выгада”, “выдаткі”, “карыснасць”, “карысны вынік”. Яны канцэнтруюць увагу на неабходнасці рацыянальных паводзін бібліятэчных спецыялістаў у новай эканамічнай сістэме. Так, развіццё платнага бібліятэчнага абслугоўвання не павінна закранаць традыцыйныя бібліятэчныя паслугі, бо прынцып бясплатнасці сацыяльна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значных паслуг забяспечвае роўныя правы грамадзян у доступе да інфармацыі, незалежна ад іх статусу ў грамадстве [8]. Разам з тым у бібліятэках магчыма прымяняць гнуткую палітыку цэнаўтварэння, арыентаваную на магчымасці "ўласнага" і "пабочнага" карыстальнікаў [7] і наяўныя віды платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

Аказанне бібліятэчна-інфармацыйных паслуг на платнай аснове абумовіла неабходнасць распрацоўкі іх сістэматызаванага пераліку (наменклатуры). Такі пералік платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг патрэбны дзеля абгрунтавання своечасовасці гэтай дзейнасці перад органамі бюджэтнага фінансавання, а таксама вызначэння эканамічных інтарэсаў карыстальнікаў – спажыўцоў дадзенай платнай прадукцыі.

Распрацоўка наменклатуры платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг мае нарматыўную рэгламентацыю. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі і выкарыстання адпаведнай наменклатуры рэгулююцца шэрагам дакументаў. Асноўнымі з'яўляюцца закон "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", "Палажэнне аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь", "Тыпавыя правілы карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь", статут і палажэнне аб пэўнай бібліятэцы, "Прэйскурант на платныя паслугі, якія выконвае Нацыянальная бібліятэка Беларусі па дагаворы і індывідуальных запытах" і інш.

Наменклатура платных паслуг складаецца з улікам бясплатнасці асноўнай дзейнасці, спажывецкага попыту і магчымасцей асобнай бібліятэкі. Яна выкарыстоўваецца для вызначэння нарматываў працоўных затрат, планавання, уліку работы бібліятэкі, параўнання дзейнасці бібліятэк і бібліятэчных сетак, рашэння тэхналагічных задач. Наменклатура платных паслуг бібліятэчных устаноў можа карэкціравацца ў залежнасці ад стану кан'юнктуры рынку. Вядучымі метадалагічнымі прынцыпамі, якія забяспечваюць мадэліраванне наменклатуры платных паслуг, з'яўляюцца звышнарматыўнасць, альтэрнатыўнасць, самаакупнасць, адраснасць, ліквіднасць, варыятыўнасць, канкурэнтаздольнасць [6]. Разам з тым відавочна залежнасць відавога складу платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і іх колькасці ад тыпу бібліятэкі, яе матэрыяльных і інфармацыйных магчымасцей, структуры, аўтаматызаваных і традыцыйных тэхналогій, штату супрацоў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нікаў. Гэтыя і іншыя акалічнасці ўлічаны пры падрыхтоўцы "Палажэння аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь" [9]. Яно распрацавана з мэтай упарадкавання механізма аказання платных (дадатковых) паслуг бібліятэкамі і выконваецца імі незалежна ад ведамаснай прыналежнасці. Палажэнне ўтрымлівае азначэнне асноўных паняццяў, такіх як "дагавор", "калькуляцыя", "нарад-заказ", "прэйскурант", "цана" і інш.; раскрывае мэты аказання бібліятэкамі платных паслуг фізічным і юрыдычным асобам; вызначае віды платных паслуг па зместу (профільныя, дадатковыя), у залежнасці ад тэрмінаў (аднаразовыя, доўгатэрміновыя); рэгламентуе ўмовы аказання паслуг на падставе дагавора ці нарада-заказа. Дадзеным дакументам прадугледжаны арганізацыя работы па аказанні платных паслуг у бібліятэках, фарміраванне цэн і разлікі з заказчыкамі, размеркаванне даходаў. Да палажэння дадаюцца прыкладны пералік платных паслуг, формы ўлікова-справаздачных дакументаў і дагавораў з карыстальнікамі на аказанне аднаразовых паслуг і бягучае бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне.

На падставе "Палажэння аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь" кожная бібліятэка павінна распрацаваць уласнае палажэнне з улікам спецыфікі сваёй дзейнасці. У ім павінны знайсці адлюстраванне пытанні, якія датычацца арганізацыі платнага абслугоўвання: умовы аказання паслуг, формы разліку за паслугі, выкарыстанне грашовых сродкаў. Да палажэння прыкладаецца пералік платных паслуг, аказваемых бібліятэкай [3].

Дзейнасць бібліятэк па аказанні платных паслуг насельніцтву з'яўляецца адной з крыніц прыцягнення дадатковых фінансавых сродкаў. Даходы ад ажыццяўлення названай дзейнасці спрыяюць умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы і матэрыяльнаму стымуляванню супрацоўнікаў. Пры даследаванні рынку платных бібліятэчных паслуг звяртаецца ўвага на дэмаграфічныя, геаграфічныя, эканамічныя, культурныя і іншыя фактары, якія ўплываюць на попыт. Вывучаецца сацыяльна-эканамічны профіль зоны абслугоўвання, асаблівасці прамысловага і грамадскага сектараў эканомікі, фінансава-эканамічны стан бібліятэчнай установы, склад спажыўцоў платных паслуг, аб'ём іх рэалізацыі, рэнтабельнасць вытвор-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

часці, сумы рэалізацыі ў цэлым і па кожнай паслуге, расходы і атрыманыя прыбыткі.

Наменклатура платных паслуг бібліятэк павінна садзейнічаць задавальненню інфармацыйных і сацыякультурных запатрабаванняў карыстальнікаў. Відавы склад платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг вызначаецца тыпалагічнымі характарыстыкамі бібліятэк, матэрыяльнымі магчымасцямі, узроўнем тэхнічных сродкаў і абсталявання, нарміраваннем. Найбольш распаўсюджаны бібліятэчна-інфармацыйныя, дакументныя, бібліяграфічныя, інфармацыйныя, методыка-кансультацыйныя, паслугі бібліятэчнага сервісу, спадарожныя платныя бібліятэчныя паслугі і паслугі ў сферы вольнага часу. Змест і кошт платных паслуг вызначаецца аб'ёмам іх запатрабаванасці ў карыстальнікаў, узроўнем развіцця бібліятэчнай вытворчасці, падыходамі да разліку іх кошту, удасканальваннем праграмных сродкаў, спосабамі эканамічнай абароны бібліятэчнай вытворчасці, нарматыўнымі абмежаваннямі, працоўнымі рэсурсамі.

### *Пытанні і заданні*

1. У чым сацыяльна-эканамічная сутнасць платнага бібліятэчнага абслугоўвання?
2. Прывядзіце асноўныя прыклады класіфікацыі платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.
3. Пералічыце артыкулы калькуляцыі цаны на бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі.
4. Назавіце асноўныя нарматыўныя акты, якія рэгулююць аказанне платных паслуг карыстальнікам бібліятэк.
5. Якім дакументам неабходна кіравацца пры вызначэнні нормаў часу на здзяйсненне пэўных працэсаў і аперацый, неабходных для вытворчасці платнай бібліятэчна-інфармацыйнай прадукцыі [4].

### *Літаратура*

*1. Арзуханов, А.С.* Услуги системы библиотечного обслуживания: сущность и классификация / А.С.Арзуханов // Науч. и техн. б-ки СССР. – 1984. – № 10. – С. 12 – 19.

*2. Басов, С.А.* Методологическое значение категории цели в исследованиях библиотечной деятельности / С.А.Басов // Вопросы управления библиотечными системами: сб. науч. тр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

/ Гос. публ. б-ка им. М.Е.Салтыкова-Щедрина. – Л., 1986. – С. 46 – 64.

*3. Далгаполава, А.Е.* Аб новых падыходах да фарміравання цэн на платныя паслугі бібліятэк / А.Е.Далгаполава // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выданне / НББ; адказ. за вып. Л.Г.Кірухіна. – Мн., 2004. – С. 82 – 85.

*4. Долгополова, Е.* Технологическая карта как основа расчёта цены на библиотечно-информационные услуги / Е.Долгополова // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 1. – С. 30 – 31.

*5. Дворкина, М.Я.* Библиотечное обслуживание: теоретический аспект: монография / М.Я.Дворкина. – М.: Моск. гос. ин-т культуры, 1993. – С. 94 – 114.

*6. Клюев, В.К.* Маркетинговая ориентация библиотечно-информационной деятельности: учеб. пособие / В.К.Клюев, Е.М.Ястребова. – М., 2001. – С. 19 – 39.

*7. Кожевникова, Л.А.* Библиотека в структуре базовых социально-экономических процессов территорий: монография / Л.А.Кожевникова; ГПНБТ СО РАН. – Новосибирск, 2004. – С. 129 – 147.

*8. Кожевникова, Л.А.* Библиотечное обслуживание в изменившейся системе экономических отношений / Л.А.Кожевникова // Библиотековедение. – 1999. – № 3. – С. 53 – 69.

*9. Палажэнне* аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь: зацв. пастановай М-ва культуры Рэспублікі Беларусь 23 жніўня 2000 г., № 15 // Хроніка культурнага жыцця / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2000. – № 9. – С. 16 –25.

*10. Справочник* библиотекаря / под ред. А.Н.Ванеева, В.А.Минкиной. – СПб.: Профессия, 2000. – С. 285 – 297.

*11. Столяров, Ю.Н.* За что же взимать плату? / Ю.Н.Столяров // Сов. библиотековедение. – 1990. – № 1. – С. 26 – 35.

*12. Суслова, И.М.* Практический маркетинг в библиотеках: учеб.- метод. пособие / И.М.Суслова. – М., 2004. – С. 89 – 95.

*13. Murphy, M.* Evaluating library public service / M. Murphy // J. of Libr. Administration. – 1990. – Vol. 12, № 1. – P. 63 – 90.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

## *Асноўная*

*Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у закон Рэспублікі Беларусь “Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь”: закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2002 г., № 147-З // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. – № 128, 2/896.

*Басамыгина, И.Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И.Н.Басамыгина. – М.: Либерея – Бибинформ, 2006. – 160 с.

*Бубекина, Н.В.* Экономические аспекты деятельности библиотек на современном этапе: метод. пособие / Н.В.Бубекина. – М.: Либерея, 1999. – 88 с.

*Гнездилов, В.И.* Проблемы рационального использования бюджетных и внебюджетных средств в крупных библиотеках / В.И.Гнездилов // Информ. бюл. Рос. библ. ассоциации. – 2003. – № 28. – С. 84 – 86.

*Горшков, Ю.А.* Экономика культуры и библиотечно-информационной деятельности / Ю.А.Горшков // Библиотека в эпоху перемен: филос.- культуролог. и инф. аспекты. информ. сб. (Дайджест). – Вып. 4 (20). – М.: Рос. гос. б-ка, 2004. – С. 72 – 105.

*Далгаполава, А.Е.* Аб новых падыходах да фарміравання цэн на платныя паслугі бібліятэк / А.Е.Далгаполава // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выданне / НББ; адказ. за вып. Л.Г.Кірухіна. – Мн., 2004. – С. 82 – 85.

*Качалина, В.В. Финансирование* библиотечно-информационной деятельности: российский опыт / В.В.Качалина // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2002. – Вып. 4. – С. 108 – 130.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Качалина, В.В.* Экономические проблемы деятельности библиотек России и других стран СНГ / В.В.Качалина // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2005. – № 2 (10). – С. 51 – 56.

*Клюев, В.К.* Хозяйственная практика библиотеки: комплексный подход / В.К.Клюев // Библиография. – 2003. – № 2. – С. 17 – 23.

*Кожевникова, Л.А.* Экономические ресурсы научных библиотек: монография / Л.А.Кожевникова. – М.: Либерея-Бибинформ, 2006. – 188 с.

*Козловская, Л.Я.* Оплата труда работников организаций культуры и искусства, финансируемых из бюджета и пользующихся государственными дотациями / Л.Я.Козловская // Заработная плата. – 2007. – № 5. – С. 30 – 39.

*Национальная* библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития / НББ; науч. рук. Р.С.Мотульский. – Мн., 2007. – С. 265 – 271.

*Николаева, В.К.* Государственное проектное финансирование в области библиотечного дела: некоторые итоги и перспективы развития / В.К.Николаева // Науч. и техн. библиотеки. – 2004. – № 1. – С. 75 – 83.

*О культуре* в Республике Беларусь: закон Республики Беларусь, 4 июня 1991 г., № 832-XII (с изм. и доп. от 14.05.2001) // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – № 48. – 2/759.

*Пераверзева, Ю.А.* Бібліятэкі і сацыяльнае партнёрства / Ю.А.Пераверзева // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С. 133 – 140.

*Пераверзева, Ю.* Прававая база бібліятэчнага фандрэйзінгу у Рэспубліцы Беларусь / Ю.Пераверзева // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 3. – С. 30 – 32.

*Планово-экономический* отдел [Электронный ресурс] // Структура Национальной библиотеки Беларуси. – Электрон. текст. дан. – [Мн.: НББ], 2007. – Режим доступа: http.://www.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

portal.nlb.by/portal/page/portal/index/content?Lang. – Дата доступа: 17.11.2007. – Загл. с экрана.

*Смирнова, Н.А.* Трудовые нормы времени в библиотечных процессах / Н.А.Смирнова // Библиотековедение. – 2002. – № 6. – С. 40 – 44.

*Фенелонов, Е.А.* Критерий и показатели экономической эффективности и методика их применения в библиотечном деле: науч.-практ. пособие / Е.А.Фенелонов. – М.: Пашков дом, 2002. – 106 с.

*Чалая, И.В.* Введение в экономику культуры: учеб. пособие / И.В.Чалая. – М.: Моск. гос. ун-т культуры и искусств, 2006. – 126 с.

### *Дадатковая*

*Административно-хозяйственный* комплекс Российской государственной библиотеки [Электронный ресурс] // Структура и подразделения РГБ. – Электрон. текст. дан. – [М.: РГБ], 2007. – Режим доступа: http.: // www. rsl.ru/index/php?F=11. – Дата доступа: 21.11.2007. – Загл. с экрана.

*Басамыгина, И.* Модели хозяйственной деятельности / И.Басамыгина // Библиотека. – 2006. – № 4. – С. 47 – 50.

*Блынская, О.* Начнём отсчёт с миллионов / О.Блынская // Библиотека. – 2005. – № 9. – С. 6 – 8.

*Горшков, Ю.А.* Введение в политэкономию библиотечно-информационной деятельности: монография / Ю.А.Горшков. – М.: Пашков дом, 2004. – 222 с.

*Гриханов, Ю.А.* Публичные библиотеки России и реформирование бюджетных отношений / Ю.А.Гриханов // Науч. и техн. б-ки. – 2007. – № 1. – С. 7 – 26.

*Збаровская, Н.В.* Альтернативные возможности финансирования школьной библиотеки / Н.В.Збаровская // Заочная школа школьного библиотекаря: сб. лекций. – М.: Школьная библиотека, 2003. – С. 148 – 153.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Колегаева, С.Д.* Экономизация отечественной библиотечной науки и практики / С.Д.Колегаева // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2002. – Вып. 4. – С.37 – 53.

*Миронов, С.* Информационные запросы граждан и национальные проекты / С.Миронов // Библиотека. – 2006. – № 1. – С. 4 – 6.

*Модернизация* системы финансового обеспечения культурной деятельности // Экономические основы культурной деятельности. Индивидуальные предпочтения и общественный интерес: Т.2: Экономическая политика в сфере культуры: новый век – новый взгляд / отв. ред. А.Я.Рубинштейн, Б.Ю.Сорочкин. – СПб.: Алетейя, 2002. – С. 148 – 172.

*Новые* критерии установления групп по оплате труда руководителей и специалистов библиотек // Независимый библиотечный адвокат. – 2001. – № 2. – С. 35 – 45.

*Палажэнне* аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь: зацв. пастановай М-ва культуры Рэспублікі Беларусь 23 жніўня 2000 г., № 15 // Хроніка культурнага жыцця / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2000. – № 9. – С. 16 – 25.

*Правительственная* реформа в социальной сфере (библиотеки, музеи, театры, архивные учреждения) // Библиотековедение. – 2005. – № 5. – С. 20 – 25.

*Соловьёва, О. Сколько стоят* услуги / О.Соловьёва // Библиотека. – 2006. – № 10. – С. 58 – 60.

*Сороко, В.* Организация внебюджетной деятельности Республиканской научной медицинской библиотеки / В.Сороко, В.Шутова // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 4. – С. 9 – 11.

*Справочник* библиотекаря / под ред. А.Н.Ванеева, В.А.Минкиной. – СПб.: Профессия, 2000. – С. 283 – 305.

*Терминологический* словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знаний / РАН. Библиотека по естественным наукам. – М., 1997. – 268 с.

*Управление* финансовыми ресурсами библиотеки: науч.-реф. сб. / РГБ; сост. С.Д.Колегаева. – М., 1994. – 139 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фёдоров, В.В.* Ресурсное обеспечение деятельности библиотек в формировании информационно-интеллектуального пространства / В.В.Фёдоров // Библиотековедение. – 2006. – № 4. – С. 19 – 22.

*Фенелонов, Е.А.* Как по-умному распорядиться деньгами: ещё раз о проблемах развития библиотек на селе / Е.А.Фенелонов // Проблемы библиотечного строительства: сб. избран. работ. – М.: Пашков дом, 2005. – С. 14 – 24.

*Штаты* и оплата труда // Краткий справочник школьного библиотекаря / под общ. ред. Т.И.Позняковой. – СПб.: Профессия, 2001. – С. 284 – 309.

*Шуклина, В.П.* Политика ценообразования в области информационной продукции и услуг библиотек / В.П.Шуклина // Информ. бюл. Рос. библ. ассоциации. – 2003. – № 24. – С. 67 – 70.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## Планы семінарскіх заняткаў

### *Тэма* ***“Бібліятэчная мікраэканоміка”***

*Пытанні*

1. Азначэнне паняцця “бібліятэчная мікраэканоміка”. Задачы эканомікі бібліятэкі. Кірункі мікраэканамічных даследаванняў у бібліятэках.

2. Кірункі дзейнасці сучаснай бібліятэкі як гаспадарчага суб’екта.

3. Кампаненты бібліятэчнай мікраэканомікі.

4. Мадэлі мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк. Этапы распрацоўкі мадэлей.

*Літаратура*

*Басамыгина, И.Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И.Н.Басамыгина. – М.: Либерея-Бибинформ, 2006. – С. 6 – 42.

*Клюев, В.К.* Библиотечная микроэкономика (методология, менеджмент, маркетинг, дидактика) / В.К.Клюев // Библиотековедение. – 2000. – № 1. – С. 28 – 35.

*Клюев, В.К.* Маркетинговый подход к библиотечной микроэкономике / В.К.Клюев // НТБ. – 1993. – № 9. – С. 10 – 22.

*Клюев, В.К.* Экономика библиотеки в актуальных рыночных понятиях / В.К.Клюев. – М., 1997. – С. 9 – 19.

*Клюев, В.К.* Хозяйственная практика библиотеки: комплексный подход / В.К.Клюев // Библиография. – 2003. – № 2. – С. 17 – 23.

### *Тэма* ***“Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе”***

1. Бібліятэка як сацыяльна-эканамічная сістэма.

2. Паняцце і віды нормаў, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэчнай дзейнасці.

3. Эканаметрычныя мадэлі як сродак пабудовы нарматываў у бібліятэчнай справе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура*

*Дригайло, В.Г.* Основы управления библиотекой высшего учебного заведения: науч.-практ. пособие / В.Г.Дригайло, Е.В.Башун, В.Н.Волынец. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Либерея, 2004. – С. 29 – 31.

*Дригайло, В.Г.* Основы научной организации труда в библиотеках: науч.-метод. пособие / В.Г.Дригайло. – М.: Либерея, 2005. – С. 24 – 31.

*Могилевер, Н.В.* Эконометрические модели как средство построения нормативов в библиотечном деле / Н.В.Могилевер, В.В.Шилов // Эконометрические исследования в библиотечном деле: сб.науч.тр. – Вып. 1. – СПб., 1993. – С. 11 – 26.

*Межотраслевые* нормы времени на работы, выполняемые в библиотеках / ЦБНТ. – М., 1997. – 85 с.

*Нормативные* материалы по труду для централизованных библиотечных систем / ГБЛ. – М., 1989. – 78 с.

*Смирнова, Н.А.* Трудовые нормы времени в библиотечных процессах / Н.А.Смирнова // Библиотековедение. – 2002. – № 6. – С. 40 – 44.

*Тихонова, Н.О.* Экономические “терзания” отечественного библиотековедения (1979 – 1991 гг.) / Н.О.Тихонова, В.В.Шилов // Эконометрические исследования в библиотечном деле: сб.науч.тр. – Вып. 1. – СПб., 1993. – С. 43 – 47.

*Фенелонов, Е.А.* Социально-экономические нормы в библиотечном деле / Е.А.Фенелонов // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ.сб. – 2004. – № 1 (7). – С. 45 – 51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

## Практычныя заняткі

### *Тэма* ***“Выкарыстанне гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэк”***

Мэта – засвоіць сутнасць гаспадарчага разліку і яго мадэлі, асэнсаваць іх выкарыстанне ў дзейнасці бібліятэк.

Заданне: прааналізаваць тэарэтычны матэрыял і вызначыць магчымасці выкарыстання прыбытку ад вядзення гаспадарчай дзейнасці ў бібліятэках.

Методыка выканання работы

Паўтарыць тэарэтычны матэрыял па тэме “Гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў”, падрыхтаваць адказы на наступныя пытанні:

– Дайце азначэнне паняцця “гаспадарчы разлік”. У чым яго сутнасць?

– Пералічыце ўзроўні рэнтабельнасці.

– Апішыце мадэлі гаспадарчага разліку.

– Назавіце прыметы прадпрыемства, якое працуе па гаспадарчым разліку.

– Якія паказчыкі, ліміты і эканамічныя нарматывы ўлічваюцца пры планаванні дзейнасці бібліятэк?

– З якіх раздзелаў складаецца гадавы план работы бібліятэкі?

– Якія кампаненты ўключаюцца ў фонд матэрыяльнага заахвочвання?

– У якіх выпадках устанаўліваюцца надбаўкі супрацоўнікам бібліятэк?

– Што разумеецца пад паняццем “сродкі фонду спажывання”? Якія сродкі ён утрымлівае?

– Самастойнымі ці не з’яўляюцца фонды вытворчага і сацыяльнага развіцця?

– Дайце азначэнне паняцця “ўнутрывытворчы гасразлік”. У чым яго сутнасць?

Вынікі працы афармляюцца ў сшытках і абмяркоўваюцца ў малых групах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма* ***“Фарміраванне адзінага фонду фінансавых сродкаў біліятэкі”***

Мэта – замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраване практычных навыкаў у галіне акумуліравання і размеркавання грашовых сродкаў бібліятэкі.

Заданне: вызначыць асноўныя кірункі фарміравання адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі, іх размеркаванне і выкарыстанне.

Методыка выканання работы

1. Паўтарыце тэарэтычны матэрыял па тэме і запоўніце наступную табліцу.

| № п/п | Кампаненты адзінага фонду фінансавых сродкаў | Крыніцы паступлення грашовых сродкаў | Расходаванне грашовых сродкаў |
|---|---|---|---|
| | | | |

2. Аформіце макеты дакументаў, на якіх заснавана стварэнне і выкарыстанне фонду заработнай платы і фонду матэрыяльнага заахвочвання: працоўны дагавор, метады заахвочвання, загад аб заахвочванні, штатны расклад, структура і штатная колькасць.

3. Вызначце тарыфныя разрады і каэфіцыенты пасад кіраўнікоў і спецыялістаў бібліятэк, ЦБС, НББ, РНТБ, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі.

4. Азнаёмцеся з кваліфікацыйнымі характарыстыкамі спецыялістаў розных пасад. Вызначце іх тарыфныя разрады і каэфіцыенты.

5. Аформіце макет табліцы суадносін груп бібліятэк па аплаце працы супрацоўнікаў.

| Групы | Фактычна абслужаныя карыстальнікі, чал. | Кнігавыдача |
|---|---|---|
| I | звыш 40.000 | звыш 1.000.000 |
| II | ад 10.000 да 40.000 | ад 600.000 да 1.000.000 |
| III | ад 5.000 да 10.000 | ад 300.000 да 600.000 |
| IV | ад 3.000 да 5.000 | ад 180.000 да 300.000 |

6. Падвядзіце вынікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма “Вылічэнне зводных цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы”*

Мэта – замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў разліку зводных коштавых паказчыкаў.

Заданне: разлічыць асноўныя зводныя паказчыкі бібліятэчнай работы.

Метадычныя парады

Цэнасная ацэнка бібліятэчнага абслугоўвання дазваляе вылічыць суадносіны выдаткаў бібліятэкі з колькаснымі паказчыкамі яе дзейнасці, рацыяналізаваць выкарыстанне наяўных рэсурсаў, павысіць сацыяльна-эканамічную эфектыўнасць работы.

Пачатковымі крыніцамі для коштавага анілізу бібліятэчнай дзейнасці з’яўляюцца гадавыя каштарысы выдаткаў і справаздачы аб іх выкананні, а таксама асноўныя планавыя і справаздачныя колькасныя паказчыкі работы бібліятэкі. Улічваюцца ўсе каштарысныя выдаткі, за выключэннем сродкаў на набыццё абсталявання і інвентару (арт. 12), на капітальны рамонт памяшканняў (арт. 16), якія з’яўляюцца не пастаяннымі, таму не адносяцца да бягучага зместу работы бібліятэкі.

Методыка выканання работы

1.Паўтарыце тэарэтычны матэрыял па тэме і апішыце сістэму паказчыкаў ацэнкі эфектыўнасці бібліятэчнай работы.

2. Пералічыце паказчыкі ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці бібліятэчнай работы.

3. Разлічыце кошт работы (паслугі) супрацоўніка бібліятэкі. Для разліку кошту гадзіны фонд заработнай платы супрацоўнікаў трэба падзяліць на планавую колькасць працоўных гадзін персаналу.

4. Разлічыце комплексныя фінансава-коштавыя паказчыкі: агульная сума выдаткаў бібліятэкі; размеркаванне выдаткаў па асобных кірунках (артыкулах); сярэдні выдатак на душу насельніцтва, што пражывае ў зоне абслугоўвання бібліятэкі; кошт абслугоўвання аднаго чытача; выдаткі на адно наведванне; выдаткі на адну кнігавыдачу. Іх разлік робіцца шляхам дзялення агульнай сумы гадавога каштарысу (па ўсіх артыкулах) на агульную (гадавую) колькасць чытачоў, наведванняў, кнігавыдач і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Асобныя фінансава-цэнасныя паказчыкі па канкрэтных бібліятэчных працэсах і аперацыях (відах работ) разлічваюцца зыходзячы з колькасці супрацоўнікаў, фонду іх заработнай платы, выдаткаў сумеснага рабочага часу. Затраты на адзінку выкананай работы вылічваюцца шляхам дзялення сумы зробленых на яе выдаткаў на агульную колькасць дадзенай работы.

## *Тэма* ***“Распрацоўка наменклатуры платных паслуг бібліятэк”***

Мэта – замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных навыкаў распрацоўкі і ўкаранення ў практыку работы бібліятэк платных паслуг.

Заданне: распрацаваць мадэль платнай паслугі.

Методыка выканання работы

Практычная работа праводзіцца ў форме дзелавой гульні. Кожны студэнт выступае ў якасці менеджэра/маркетолага, які распрацоўвае і падае на разгляд членаў экспертнай рады паслугу для ўкаранення ў дзейнасць сваёй бібліятэкі. Студэнты групы з’яўляюцца членамі экспертнай камісіі і абараняюць інтарэсы супрацоўнікаў бібліятэкі і карыстальнікаў.

На пасяджэнне экспертнай рады менеджэру/маркетолагу неабходна падаць бізнес-план паслугі, які складаецца з наступных пунктаў:

– назва паслугі,
– тып бібліятэкі, для якой распрацавана паслуга,
– абгрунтаванасць аднясення паслугі да разраду платных,
– адпаведнасць паслугі мэтам і задачам бібліятэкі,
– вынікі вывучэння рынку, наяўнасць рэальнага ці патэнцыяльнага попыту, спосабы фарміравання попыту,
– рэклама паслугі,
– змест паслугі,
– тэхналогія вытворчасці паслугі і неабходныя рэсурсы,
– разлік сабекошту і цаны паслугі,
– плануемая эфектыўнасць паслугі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма* ***“Разлік фонду працоўнага часу”***

Мэта – замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных навыкаў планавання працоўнага часу.

Заданне

1. Разлічыць гадавы фонд рабочага часу аддзела. Для гэтага трэба запоўніць наступную табліцу.

| Прозвішча, імя, імя па бацьку супрацоўнікаў | Выхадныя дні | Святочныя дні | Водпуск | Працоўныя дні |
|---|---|---|---|---|
| 1.<br>2.<br>3. | | | | |
| Усяго ... | | | | |

Гадавы фонд рабочага часу аддзела разлічваецца шляхам памнажэння працягласці працоўнага дня на колькасць працоўных дней ў годзе (на ўсіх супрацоўнікаў аддзела).

З улікам гадавога % на непрацаздольнасць (2%), які складае 106,1 гадз. (на усіх супрацоўнікаў аддзела), гадавы фонд рабочага часу ўстанаўліваецца шляхам вылічэння ад агульнай колькасці гадавога фонду рабочага часу колькасці гадзін, мяркуемай на непрацаздольнасць.

Напрыклад: гадавы фонд рабочага часу = 8гадз.12мін. х х647 = 5305,4 гадз. (на ўсіх супрацоўнікаў аддзела); гадавы % на непрацаздольнасць (2%) складае 106,1 гадз. (на ўсіх супрацоўнікаў аддзела).

Такім чынам, гадавы фонд рабочага часу = 5305,4 гадз. – 106,1 гадз. = 5199,1 гадз. (на ўсіх супрацоўнікаў аддзела).

2. Разлічыць бюджэт рабочага часу аддзела (на выбар студэнта) на месяц з улікам нормаў на аперацыі, якія выконваюцца ў аддзеле. Для гэтага трэба выкарыстаць “Тыпавыя нормы часу на работы, якія выконваюцца ў бібліятэках”. Вынікі разліку афармляюцца ў выглядзе наступнай табліцы.

| № п/п | Назва працэсу | Адзінка вымярэння | Норма выпрацоўкі | Аб’ём работ | Патрэбны аб’ём часу | Выканаўца працэсу |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для падліку трэба ўлічыць наступнае:

а) пры вызначэнні рабочага часу аддзела неабходна звярнуць увагу на колькасць працоўных дзён у месяцы (напрыклад, кастрычнік – 21 дзень) і колькасць супрацоўнікаў аддзела (напрыклад, 3 чалавекі). Таксама зрабіць падлік працоўных гадзін у месяцы па формуле: колькасць працоўных дзён у месяцы памножыць на працягласць працоўнага дня;

б) каб вызначыць аб'ём рабочага часу, неабходны для выканання кожнага працэсу, трэба аб'ём работ памножыць на адпаведныя ім нормы часу;

в) каб вызначыць бюджэт працоўнага часу аддзела, трэба падсумаваць вынікі, атрыманыя пры запаўненні графы 6 табліцы.

3. Разлічыць фонд працоўнага часу аднаго супрацоўніка аддзела па схеме. Для гэтага трэба падлічыць:

– колькасць дзён у годзе,
– колькасць выхадных дзён,
– колькасць святочных дзён,
– колькасць дзён адпачынку,
– колькасць санітарных дзён,
– агульную колькасць непрацоўных дзён,
– колькасць працоўных дзён,
– колькасць працоўных гадзін.

Колькасць працоўных дзён (фонд працоўнага часу аднаго супрацоўніка) вызначаецца зыходзячы з працягласці працоўнага дня (8 гадз. 12мін. ці 41 гадз. у тыдзень), памножанага на колькасць працоўных дзён у годзе.

Колькасць санітарных дзён уваходзіць у агульную колькасць працоўных дзён.

4. Абмеркаванне вынікаў працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 3*

## Самастойная работа студэнтаў

### *Тэма* ***“Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры”***

Заданне: карыстаючыся бібліяграфічным спісам да тэмы і іншымі крыніцамі, самастойна вылучыць і даць азначэнне тэрмінам фінансава-эканамічнай сферы бібліятэчнай дзейнасці.

*Літаратура*

1. *Библиотечное* дело: терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – 168 с.
2. *Лявончыкаў, В.Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 2000. – 228 с.
3. *Справочник* библиотекаря / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2001. – 438 с.

### *Тэма* ***“Эканамічная прастора бібліятэкі”***

Заданне: падрыхтаваць рэфератыўныя матэрыялы, змест якіх адлюстроўвае стан рынку працы бібліятэчных супрацоўнікаў і перспектывы яго развіцця. Указаць напрамкі падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў, формы павышэння кваліфікацыі. Ацаніць знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўплываюць на фарміраванне эканамічнай прасторы бібліятэкі. На пачатковым этапе работы над рэфератамі прапануюцца наступныя крыніцы.

1. *Зыгмантовіч, С.* Персанал бібліятэкі і пытанні кадравай палітыкі / С.Зыгмантовіч // Бібліятэчны свет. – 2006. – № 1. – С. 12 – 17.
2. *Касап, В.* Праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў інфармацыйна-дакументнай сферы ў Беларусі / В.Касап, Т.Кузьмініч // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 4. – С. 30 – 32.
3. *Кірухіна, Л.* Тэндэнцыі развіцця публічных бібліятэк Беларусі: рэаліі і патрэбнасці грамадства / Л.Кірухіна // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 1. – С. 10 – 15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Кирюхина, Л.Г.* “Масштаб кадровых преобразований значителен…”, или О том, как люди в Национальной библиотеке смогли работать, опережая время / Л.Г.Кирюхина; беседовала И.М.Гуринович // Кадровая служба. – 2005. – № 11. – С. 56 – 62.

5. *Колькасць* дзяржаўных публічных бібліятэк [Электронны рэсурс] // Культура Беларуси в зеркале статистики. – Электрон. дан. – Минск, 2005. – Режим доступа: http.: // www. kultura.by / online / showpage. – Дата доступа: 2.03.2007.

6. *Лявончыкаў, В.* Падрыхтоўка навуковых кадраў у галіне бібліятэчнай справы / В.Лявончыкаў // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 1. – С. 18 – 19.

7. *Ореховская, И.* Фундаментальной библиотеке Белгосуниверситета – 75 лет / И.Ореховская // Бібліятэчны свет. – 2006. – № 1. – С. 29 – 31.

8. *Паўлава, С.* Бібліятэка і універсітэт: узаемадзеянне ў навучальным працэсе / С.Паўлава, Л.Дзямешка // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 1. – С. 20 – 21.

9. *Шышкін, У.* Дзяржаўнае рэгуляванне бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь / У.Шышкін // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 2. – С. 3 – 5.

10. *Яцэвіч, М.* Бібліятэчная адукацыя: крокі ў будучыню / М.Яцэвіч // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 2. – С. 26 – 31.

### *Тэма* ***“Бібліятэчная мікраэканоміка”***

Заданне: вывучыць літаратуру, прапанаваную да семінара па адпаведнай тэме. На гэтай падставе вылучыць мадэлі мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк, засвоіць іх змест і зрабіць аналіз магчымасці выкарыстання ва ўмовах бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

На семінарскіх занятках студэнты паказваюць вынікі аналізу і даюць рэкамендацыі па выкарыстанні розных мадэляў у практычнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма* ***“Гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў”***

Заданне: падбор літаратуры па тэме студэнты ажыццяўляюць самастойна. Зыходзячы з аналізу літаратуры ім прапануецца выбраць і апісаць сутнасць паказчыкаў эфектыўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадарчай дзейнасці бібліятэк; азнаёміцца з нарматыўнымі дакументамі ў галіне гаспадарчай дзейнасці бібліятэчных установ.

Напрацаваныя матэрыялы выкарыстоўваюцца на практычных занятках па адпаведнай тэме разам з метадычнымі рэкамендацыямі і дыдактычнымі матэрыяламі, якія прапануе выкладчык.

### *Тэма "**Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе**"*

Заданне: карыстаючыся "Типовыми нормами времени на работы, выполняемые в библиотеках" (1997) і "Сводными нормами времени на работы, выполняемые в Национальной библиотеке и библиотеках России" (1999) і літаратурай па тэме адпаведнага семінара, вылучыць асноўныя віды нормаў на бібліятэчна-бібліяграфічныя працэсы і аперацыі пэўнага цыкла (на выбар студэнта), адзінкі вымярэння, нормы выпрацоўкі. Прааналізаваць методыкі вызначэння нормаў і нарматываў, прапанаваныя рознымі аўтарамі (В.Дрыгайла, Н.Смірновай, Н.Ціханавай).

Матэрыялы прызначаны для выкарыстання на семінарскіх занятках.

### *Тэма "**Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк**"*

Заданне: кожны студэнт рыхтуе рэферат (паведамленне) аб крытэрыях і паказчыках эканамічнай эфектыўнасці і эканамічным патэнцыяле бібліятэк. Для аналізу прапануюцца ўліковыя, пазаўліковыя, аналітычныя паказчыкі эканамічнай дзейнасці бібліятэк, а таксама якасці і метады вывучэння эканамічнага патэнцыялу. Неабходна разгледзець сутнасныя характарыстыкі паказчыкаў, вылучыць іх сацыяльную і эканамічную значнасць, прааналізаваць магчымасці выкарыстання ў практыцы работы бібліятэк і ролю ў развіцці эканамічнага патэнцыялу бібліятэчных устаноў. Для работы выкарыстоўваюцца літаратура, прапанаваная ў названай тэме, а таксама крыніцы, якія студэнты знаходзяць самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па выніках работы прапануецца правядзенне круглага стала з удзелам вядучых выкладчыкаў кафедры і прадстаўнікоў бібліятэк.

*Тэма* ***“Эканамічныя метады кіравання бібліятэкай”***

Заданне: кожны студэнт складае анатаваны бібліяграфічны спіс па тэме. Пажадана ўключэнне ў яго традыцыйных і электронных рэсурсаў, а таксама неапублікаваных дакументаў (лакальнай дакументацыі пэўнай бібліятэкі). Па выніках аналізу крыніц прапануецца падрыхтаваць даведку аб ролі эканамічнага аналізу як сукупнасці метадаў фарміравання і апрацоўкі эканамічных паказчыкаў бібліятэчнай работы. На пачатковым этапе працы рэкамендуецца выкарыстанне “Даведніка бібліятэкара” (СПб., 2004. – С. 209 – 211) і навукова-практычнага дапаможніка “Микроэкономика библиотечного дела” (М., 2006. – С. 6 – 32). Матэрыялы здаюцца выкладчыку на праверку.

*Тэма* ***“Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк”***

Заданне: прааналізаваць лекцыйны матэрыял па тэме, азнаёміцца з метадычнымі ўказаннямі да практычнай работы “Разлік фонду працоўнага часу” і скласці алгарытм фінансавага забеспячэння бібліятэкі з улікам размеркавання фінансавых сродкаў. Неабходна адлюстраваць у графічнай форме залежнасць крыніц фінансавання ад прынцыпаў фінансавання і нарматыўнай базы фінансавання (рэспубліканскі, рэгіянальны, мясцовы ўзроўні), паказаць варыянты арганізацыі і выкарыстання фінансавага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння асноўных кірункаў бібліятэчнай дзейнасці, узаемасувязь нарматываў матэрыяльна-тэхнічнай забяспечанасці бібліятэчных працэсаў і аперацый (камплектаванне фонду, абслугоўванне карыстальнікаў, у тым ліку даведачна-бібліяграфічнае, аўтаматызацыя і інш.), магчымасць фарміравання бюджэтных і пазабюджэтных грашовых фондаў ад нарматываў фінансавання.

Матэрыялы афармляюцца пісьмова і здаюцца выкладчыку на праверку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма* ***“Адзіны фонд фінансавых сродкаў”***

Заданне: пошук і сістэматызацыя новай літаратуры (кніжныя і перыядычныя выданні) і электронных крыніц па тэме. Падрыхтоўка канспекта.

Від кантролю – апытанне на практычных занятках па тэме.

*Тэма* ***“Фінансава-цэнасныя паказчыкі бібліятэчнай работы”***

Заданне: карыстаючыся тэарэтыка-метадычнымі матэрыяламі па тэме, выкладзенымі ў дадзеным вучэбна-метадычным дапаможніку, спрагназіраваць магчымасці выкарыстання і разліку цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы.

*Тэма* ***“Платныя паслугі ў сістэме фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк”***

Заданне: азнаёміцца з літаратурай па тэме, нарматыўна-тэхналагічнай дакументацыяй, якая змешчана ў дыдактычных матэрыялах па курсу, і метадычнымі ўказаннямі да практычнай работы па тэме “Распрацоўка наменклатуры платных паслуг бібліятэк”. Разлічыць кошт пэўных платных паслуг (на выбар студэнта) і спрагназіраваць попыт на іх. Даць прапановы аб выкарыстанні картатэк і баз даных платнай бібліятэчнай прадукцыі пры распрацоўцы наменклатуры і пазіцыяніраванні апошніх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 4*

## Тэставыя пытанні для выбарнага кантролю ведаў

I. Асноўнай крыніцай фінансавання бібліятэк з'яўляюцца:
а) сродкі дзяржаўнага бюджэту,
б) замежныя інвестыцыі,
в) добраахвотныя ахвяраванні.

II. Фінансаванне бібліятэк ажыццяўляецца ў адпаведнасці з:
а) заканадаўствам Рэспублікі Беларусь,
б) пажаданнямі бібліятэк,
в) магчымасцямі заснавальнікаў.

III. Заснавальнікі бібліятэк у адпаведнасці з заканадаўствам гарантуюць:
а) фінансаванне бібліятэк,
б) ліквідацыю бібліятэк,
в) будаўніцтва бібліятэк.

IV. Які з тэрытарыяльных узроўняў вылучаны ў законе "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" і ўлічваецца пры фінансаванні бібліятэк:
а) міжнародны,
б) рэспубліканскі,
в) абласны.

V. Сінонімам якога прынцыпу фінансавання бібліятэк з'яўляецца паняцце "недафінансаванне":
а) астаткавага,
б) нарматыўнага,
в) сеткавага.

VI. У аснову якога прынцыпу фінансавання пакладзены каштарыс сярэднестатыстычнай бібліятэкі:
а) сеткавага,
б) праграмна-мэтавага,
в) астаткавага.

VII. Пры якім прынцыпе фінансавання бібліятэк крытэрыем выдаткоўвання асігнаванняў з'яўляецца расход грашовых сродкаў за бягучы год:
а) затратным,
б) астаткавым,
в) нарматыўным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

VIII. Які з прынцыпаў фінансавання бібліятэк грунтуецца на аснове кантрольных лічбаў і стабільных доўгатэрміновых нарматываў:

а) нарматыўны,

б) сеткавы,

в) праграмна-мэтавы.

IX. Дзе акумулююцца ўсе фінансавыя пастУпленні ў бібліятэку:

а) у адзіным фондзе фінансавых сродкаў,

б) у фондзе матэрыяльнага заахвочвання,

в) у фондзе заработнай платы.

X. Якіх фінансавых планаў не існуе:

а) рэтраспектыўных,

б) бягучых,

в) перспектыўных.

XI. Назавіце асноўныя віды расходаў бібліятэкі:

а) аперацыйныя,

б) адміністрацыйна-гаспадарчыя,

в) расходы на патрэбы кіраўніцтва бібліятэкі.

XII. Да якога віду расходаў адносіцца выплата заработнай платы:

а) адміністрацыйна-гаспадарчага,

б) операцыйнага,

в) матэрыяльнага.

XIII. Нормы, якія фіксуюць велічыню выдаткаў на адзінку работ па абслугоўванні карыстальнікаў, могуць быць:

а) фінансавыя абавязковыя,

б) фінансавыя факультатыўныя,

в) матэрыяльныя.

XIV. Факультатыўныя нормы распрацоўваюцца з улікам:

а) расходаў на камандзіроўкі і аплату лісткоў непрацаздольнасці,

б) стаўкі заработнай платы,

в) месцазнаходжання бібліятэкі.

XV. Комплексная сістэма вывучэння попыту максімальна арыентаваная на задавальненне бібліятэчна-інфармацыйных запытаў. Гэта:

а) бібліятэчны маркетынг,

б) бібліятэчны менеджмент,

в) бібліятэчная статыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVI. Прадметам эканомікі бібліятэчнай справы з’яўляюцца:

а) вытворчыя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці,

б) нефармальныя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці,

в) невытворчыя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці.

XVII. Эканамічныя рэсурсы бібліятэк могуць быць:

а) аднаўляльнымі,

б) неаднаўляльнымі,

в) вытворчымі.

XVIII. Па змесце і прызначэнні эканамічныя рэсурсы бібліятэк могуць быць:

а) працоўнымі,

б) матэрыяльна-тэхнічнымі,

в) фінансавымі,

г) інфармацыйнымі,

д) арганізацыйнымі.

XIX. Эканамічныя метады кіравання аказваюць уздзеянне на:

а) дзейнасць бібліятэкі,

б) калектыў бібліятэкі і на асобных супрацоўнікаў,

в) прыцягненне пазабюджэтнага фінансавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**Пераверзева** Юлія Аляксандраўна

# ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэдактар Л. Ц. Спірыдонава
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая
Падпісана ў друк 2008 г.
Фармат 60x84 $^1/_{16}$. Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 6,53.
Ул.-выд. арк. 5,8. Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ